БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА ЗАСНАВАНАЯ У 1906 Г У ВІЛЬНІ АДНОЎЛЕНАЯ ТАМСАМА Ў 1991 Г З 1 САКАВІКА 1996 Г ВЫХОДЗІЦЬ У МЕНСКУ ВЫДАВЕЦ РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ «НАША НІВА»

Невядомыя кнігі Скарыны

НАБЫТЫЯ НА АЎКЦЫЁНЕ Ў ЛЁНДАНЕ

5 сьнежня а другой гадзіне дня у галоуным памяшканьні аукцыену «Christie s» дырэктар бібліятэкі імя Скарыны ў Лёндане айцец Аляксандар Надсан зрабіў незвычайную пакупку — сабраныя у адным пераплёце пяць кніг Францішка Скарыны праскага выданьня. Унікальнасьць знаходкі у тым, што яна дагэтуль знаходзілася ў прыватнаи калекцыі і была невядомая навукоуцам Непасрэднае дачыненьне да гэтаи падзеі меў Сяргей Шупа

С.Шупа: Напачатку кастрычніка я натыкнуўся ў Інтэрнэце на абсалютна неверагодную навіну. 26 лістапада 1996 году на аўкцыёне «Christie's» у Лёндане выставіўляўся на продаж гэты Скарынаў зборнік. Што я зрабіў адразу як толькі пабачыў гэтую інфармацыю? Я затэлефанаваў у «Christie's». Яны даслалі мне старонку са свайго службовага каталёгу, дзе было напісана, што кніга ацэньваецца ад чатырох да шасьці тысячаў фунтаў і што яна не прададзеная. Ад такой навіны у мяне проста вырасьлі крылы. Найбольш дзіўным было тое, што дагэтуль кніжка заставалася ня купленай. Бо існавалі і ёсьць інстытуцыі, якім паводле службовых абавязкаў трэба было штосьці такое высочваць і скупляць. Хоць бы тая самая Брытанская бібліятэка і ейны славянскі аддзел, які заўсёды уважліва сочыць за гэткімі падзеямі. Але сталася так, што яны гэтую кнігу прагледзелі і на тым менавіта аўкцыёне не прысутнічалі.

Сумневы ў аўтэнтычнасьці кнігі разьвейваліся даволі падрабязным апісаньнем у каталёгу Наўрад ці нехта стаў бы падрабляць нешта нагэтулькі маргінальнае для эўрапейскіх аматараў кнігі і, тым больш выстаўляць за такую цану, якая, па прызнаньнях шмат каго са спэцыялістаў, да якіх я пасьля зьвярнуўся, была не такая ўжо й вялікая.

У склад зборніка паводле каталёгу уваходзілі першая, другая трэцяя, чацьвертая і шостая кнігі якія выйшлі пасьля першай пасьля Псалтыра. Гэта кнігі Іова, Прытчаў Саламонавых Ісуса Сірахава, Эклезіяста і Прамудрасьці Божай. Пабачыўшы гэты склад, я адразу зьвязаўся з дасьведчаным спэцыялістам доктарам Неміроўскім з Масквы і папрасіў яго ідэнтыфікаваць такі зборнік. Ён паведаміў, што гэты зборнік дагэтуль навуцы быў нявeдамы, не апісаны і адкуль ён узяўся — невядома.

Цяпер першае, што трэба было зрабіць гэта, не задумваючыся аб наступствах, падаць заяўку на аўкцыён «Christie's», маўляў, я гатовы набыць гэтую кнігу. Я гэта зрабіў, думаючы што пасьля неяк разьбярэмся.

Наступны крок. Прыпамінаючы нядаўнюю праскую Скарынаўскую канфэрэнцыю, дзе загадчыца аддзелу старадрукаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Тацяна Рошчына прасіла дапамагчы ў адшуканьні і спрыяньні набыцьцю новых Скарынавых асобнікаў, я адразу паведаміў ёй. Тым часам прыйшоў факс з аўкцыёну што яны скантакталіся з прадаўцом і ён згадзіўся на прапанаваную суму, што апошні раз стукнуў аўкцыённы малаток і

Працяг на старонцы 3

НАША НІВА
№ 35 (96) 15 сьнежня 1997 г.

НАРОДНАЯ КНІГА

СЬЦЯНА

Пасьля неаднаразовых прапановаў нашых чытачоў і з ласкавае згоды народнага пісьменьніка Беларусі Васіля Быкава выдавецтва «Наша Ніва» ажыцьцяўляе выданьне новае кнігі прозы В.Быкава «Сьцяна». Як вядома, гэтае выданьне рыхтавалася ў дзяржаўным выдавецтве, але сёньняшні палітычны рэжым спыніў выхад кнігі. Мы далёкія ад думкі, што беларускае слова можа ў прынцыпе існаваць толькі за дзяржаўныя датацыі, і мяркуем, што паміж творамі народнага пісьменьніка, як, зрэшты, і іншых таленавітых літаратараў, з аднаго боку, і чытачом — з другога, ня мусяць паўставаць непераадольныя бар'еры чынавенскае прыхамаці. Кнігі лепшых беларускіх літаратараў будуць выходзіць у такім аб'ёме і датуль колькі і дакуль у гэтых кніг будзе чытачоў. Гэтак нарадзілася ідэя стварыць прэцэдэнт Народнае Кнігі. Мы ня ставім на мэце знайсьці спонсараў або зрабіць прыгожы жэст дабрачыннасьці. Мы імкнемся насуперак цынічнаму да нашае мовы й культуры рэжыму, сьцьвердзіць, што беларускія кнігі мусяць выходзіць за грошы і дзеля патрэбаў беларускага грамадзтва. Разам з тым мы спадзяемся на кансалідацыйны эфэкт Народнае Кнігі, якая мусіць умацаваць нашае грамадзтва і даць яму сілы духу

Кніга «Сьцяна» складаецца з празаічных твораў Васіля Быкава апошніх гадоў.

Беларуская гісторыя XX стагодзьдзя стварыла нямала сытуацыяў, калі характары розных людзей па-рознаму выяўляліся на мяжы жыцьця і сьмерці Слуцкае антыбальшавіцкае паўстаньне, Курапаты, другая сусьветная вайна, «хрушчоўская» адліга, перасьлед з боку КГБ у застойныя часы. Адпаведна рознымі былі і паводзіны міжвольных удзельнікаў гэтай гісторыі, ад якіх, па вялікім рахунку не залежала нічога. Яны, фатальна абложаныя таталітарнай сыстэмай маглі толькі захаваць або не захаваць сваю чалавечую годнасьць. Але ніякім чынам яны не маглі паўплываць на свой прадвызначаны статус — ахвяраў чырвонага або брунатнага малоха які працяў кожнага зь іх наскрозь — іхны розум і іхную кроў.

Васіль Быкаў у новай кнізе прозы паказвае, наколькі немагчыма, але наколькі важна на самых фатальных этапах гісторыі захоўваць чалавечнасьць, прыстойнасьць, годнасьць Псыхалягічныя сытуацыі ў крытычных абставінах становяцца напружанымі сюжэтамі, а дакладныя характарыстыкі самых розных чалавечых тыпаў змушаюць чытача ўвесь час адчуваць сваю прысутнасьць сярод быкаўскіх пэрсанажаў і рабіць уласны маральны выбар.

Кніга Васіля Быкава «Сьцяна» выйдзе у сьвет сёлета. Выдавецтва «Наша Ніва» зьбірае папярэднія замовы на кнігу.

Нагадаем, што той, хто замаўляе кнігі «НН» да іх выхаду ў сьвет, аплочвае толькі сабекошт і кошт перасылкі, тады як гатовая кніга з гандлёвымі нацэнкамі будзе каштаваць значна даражэй.

Пра тое, як замовіць кнігу Васіля Быкава чытайце на восьмаи старонцы газэты

Васіль Быкаў

ЖОЎТЫ ПЯСОЧАК

Іх везьлі ноччу па цёмных гарадзкіх вуліцах кудысь прэч ад турмы, але ў які бок гораду – Аўтух зразумець ня мог. У крытай машыне не было вокнаў не сьвяцілася нідзе нават маленькай шчыліны, і ні ўнутры ні знадворку нічога не было відаць. Аўтух сьпярша думаў, што трапіў у страхавіты «чорны воран», пра якога начуўся ў турме і нават раней — на вёсцы. Але мабыць, то быў ня «чорны воран», бо, як ён згледзеў уначы, калі іх вывелі на турэмны падворак, была гэта машына хоць і вялікая, але ня чорная. І нешта кароткае было напісана на яе баку ды ён не разабраў, што — не далі. Пачалі штурхаць, каб хутчэй залязалі ў яе цёмнае нутро, а ў яго якраз разьвязалася аборына на лапці, і ён, сагнуўшыся, узяўся яе завязваць. Ды тут жа атрымаў злога высьпятка ў зад — гэта той канвой ці як яго — малады танклявы вайсковец з вусікамі, які сёньня распараджаўся імі Аўтух таропка ўлез у машыну, дзе ўжо сядзела чалавек шэсьць ягоных спадарожнікаў, і сгуліўся ля самых дзьвярэй, якія тут жа з бразгатам зачыніліся Машына папаўзла-паехала з падворку, праз браму, затым па вуліцах, паварочваючы то ў адзін бок, то ў другі. Леваруч ад Аўтуха сядзеў мужчына ў скуранцы, якога напачатку, як арыштавалі, Аўтух бачыў у кабінэце сьледчага. Але цяпер Аўтух ня мог зразумець, чаму той тут? Ці таксама арыштаваны, ці вязе іх у якую іншую турму? А можа — на волю? Бо завошта караць Аўтуха, які зь яго польскі шпіён? У Польшчы ня быў ні разу, мала што жыў пры мяжы. На хутары. І аднаасобна...

Во ў тым што аднаасобна мабыць, найбольшы ягоны грэх. Праз тую аднаасобнасьць ён за год натрываўся столькі што іншаму хапіла б на ўсё жыцьцё.

— Гэ, таварыш А таварыш — далікатна папіхнуў ён локцём суседа ў скуранцы. — Ня ведаеце, куды гэта нас?

— На кудыкіну гару, — не адразу і злосьліва адказаў сусед, нядаўні сьледчы ўправы НКВД Сурвіла.

Гэты Сурвіла ня тое, што Аўтух, — ён і ў цемры, з заплюшчанымі вачыма мог вызначыць іхны маршрут. Даўно і добра ён ведаў гэтую дарогу — ад гарадзкога цэнтру да ўскраіны і далей, праз прыгарадную вёску да недалёкага ляска, дзе было наркамацкае стрэльбішча Некалі сам туды вазіў такіх жа, асабліва як служыў у камэндатуры Пасьля ўжо, як перавялі ў сьледчы аддзел, разы два выяжджаў на практыкаваньне ў стральбе з асабістае зброі — пісталета ТТ. Раней усе чэкісты ўправы былі ўзброеныя рэвальвэрамі сыстэмы «наган», а летась у першую чаргу сьледчым выдалі новенькія ТТ — спрытныя такія, пляскатыя пісталеты з чорнымі шчочкамі на рукаятках. Зь іх і стралялі. Ён тады здаў практыкаваньне на «добра». А цяпер тыя практыкаваньні будуць здаваць іншыя На практыцы. На іхных патыліцах...

Пасьля тым як машыну стала кідаць з боку на бок Сурвіла зразумеў, што яны выяжджалі з гораду. Недзе збоч у цемры туліцца невялікая прыгарадная вёсачка а іх чакае паваротка ўлева, ад якой... Ад якой да мэты, да апошняй мяжы, лічы, што-ніштo, засталося якіх паўгадзіны часу, і ўсё. Усё назаўжды скончыцца.

Тое што хутка ўсё скончыцца, яго, аднак, ня дужа і турбавала. Да таго ён гатовы быў месяц таму нават да суда, ведаў, яго не памілуюць. Стрэльнуць. Бо тое, што яму прад'явілі для абвінавачаньня, увогуле было напраўдзе: дапушчаў і перавышэньне, і незаконныя мэтады — і біў і ламаў косьці — «даваў дразда». Але ж хіба ён адзін? У іхнай управе так працавалі ўсе, — стараліся, ня спалі начэй, выбівалі ўсё, што можна

Працяг на старонцы 4.

ЧУЖЫЯ НЕПАТРЭБНЫЯ НІКОМУ

Калі глядзіш апошнім часам навіны ў тэлебачаньні робіцца ніякавата ад таго, як сыходзіць гэты год — катастрофы, выбухі, аварыі на шахтах, у небе на дарогах. На тэлеэкранах агонь клубы дыму, разбураныя будынкі...

Недзе гэтыя катастрофы сягаюць межаў нацыянальных бедзтваў і тады прыпускаюцца нацыянальныя сьцягі, людзі становяцца сур'ёзнымі, закасваюцца рукавы і пачынаецца *аднаўленьне*. Людзі, зараджаныя станоўчай ідэяй, здольныя нэ немагчымае Галоўнае хацець і верыць.

Тое, што мы бачым у тэлевізіі адбываецца, дзякуй Богу, па-за нашымі межамі. У нас ціха. Наша нацыянальная катастрофа адбылася ўвесну 1995 году. На даху былога ЦК.

Цяжка прыгадаць краіну які я б перажыла падобны шок. Нацыянальны сьцяг не прыспусьцілі. Яго дралі... На кавалкі... Дралі не акупанты, не захопнікі, не чужыя.. Яго дралі свае... Але *чужыя*...

З таго самага часу яны перасталі быць для нас *сваімі*. Рукі, якія дралі *наш сьцяг*, верагодна, прагнулі стаць сваімі для кагосьці іншага, але ня сталі. Яны сталі *чужымі*... Для ўсіх. Іншага не магло быць. Такі лёс здрады.

Тады у траўні 1995 мы сягнулі дна. Дна адчаю, разгубленасьці, абыякавасьці. Але — вугал падзеньня роўны вуглу адлюстраваньня. Гэта закон. З тае хвіліны нашае грамадзтва трапіла ў сфэру дзейнасьці гэтага закону.

Рукам, якія дралі *наш сьцяг*, здавалася што яны ў стане зьнішчыць сымбаль.

Колькі фарбы пераводзіцца на тое, каб замазаць *наш сымбаль* на нашых платах, а колькі яшчэ пераводзіцца. Ён праяўляецца. Ён будзе праяўляцца заўжды і паўсюль, пакуль зноў ня зойме сваё належнае месца.

Можна кідаць за краты дзяцей, якія фарбуюць беларускія сьцены ў беларускія колеры, можна прымушаць іншых дзяцей хадзіць пад ня нашымі сьцягамі, гэта нічога ня зьменіць. Рукапісы не гараць, ня рвуцца не замазваюцца, ня кідаюцца за краты

Гэта аксіёма, якая дзейнічае нават больш надзейна, чым закон.

Мы падымаемся цяжка. Так, як падалі. Падымаемся пакутліва, хістаючыся. Зьбіваючы зь сябе ўсё няварта, штучнае, недасканалае. З нас зьлятае акаліна. Мы набываем форму.

Мы падымаемся. Гэта відаць зь няўдалага летавняга рэфэрэндуму. Гэта відаць з букету забаронных указаў, якія неўзабаве будуць прынятыя. Гэта відаць праз забарону «Свабоды». Гэта відаць зь няўдалага прарыву да суседзяў. *Чужыя* нікому не патрэбныя.

Мы падымаемся — гэта напісана на твары *сваіх беларускіх* палкоўнікаў з улётак у абарону *свабоды*

Наступны год ня спыніць нашага пад'ёму, ён можа толькі яго прысьпешыць. Ніякія ўраганы, бедзтвы мафіі, указы ня ў стане нам замінаць. Таму што мы аднаўляем *сваё* Таму што гэта прырода. Таму што гэта не залежыць нават ад нас.

Чужым застаецца адно — пакаяньне, калі яны на гэта здольныя. Не дзеля таго, каб стаць для нас *сваімі*, гэта наўрад ці магчыма. Дзеля таго, каб не застацца *чужымі*. Для ўсіх. Бо *чужыя* не патрэбныя нікому, нават самім сабе.

Алег Данкевіч

ПОШТА

ВІТАЮ ВАС, ПАВАЖАНАЯ РЭДАКЦЫЯ!

Хачу Вам сказаць слова падзякі за тое, што Вы ёсьць, што Вы робіце такую патрэбную і складаную справу. Першы раз я падпісаўся на Вас, раней купляў у шапіках. Зараз вырашыў падпісацца, таму што не хачу губляць Вас, бо Вы такія адзіныя і непаўторныя, і бяз Вас асабіста мне будзе вельмі цяжка. Да таго ж я зьбіраю ўсе нумары, пачынаючы зь ліпеня 1996 году. Хачу захаваць дзеля сваіх дзяцей, а можа і ўнукаў, гэтую газэту, гэты скарб.

Віншую вас з Калядамі, зычу найперш здароўя, потым мужнасьці й сьмеласьці Вам і Вашым сем'ям, усё астатняе прыкладзецца! Упэўнены, мы пераможам, рана ці позна! Яшчэ раз дзякую! Да спатканьня

Віталь Корнеў, Пухавіцкі раён

ДЗЕНЬ ДОБРЫ, ШАНОЎНАЕ СПАДАРСТВА.

Зьвярнуцца да Вашае увагі мяне прымусіла пытаньне, якое даўным часам чмурыць галаў пэўнае колькасьці суайчыньнікаў, ласьне — аб найменьні «тутэйшае» краіны. Прапановы наконт гэтага час ад часу зьяўляюцца на старонках газэтаў ці кнігаў, альбо гучаць на радыёхвалях. Такім чынам, стала модным распавядаць аб сваіх тапанімічных прыхільнасьцях. Аднак пры гэтым, не зважаючы на цікавую акалічнасьць, якая засталася па-за межамі ўвагі хоць і ня ўсіх, але большасьці дасьледчыкаў. А справа ў тым, што ніводны з прапанаваных варыянтаў не ахоплівае ўсяе тэрыторыі краю.

Па-першае, гэта Крывія. Тапонім паходзіць ад назвы племяннога саюзу крывічоў, якія засялялі полацкія, пскоўскія ды смаленскія землі. В.Ластоўскі лічыў, што гэта адзіная сапраўдная саманазва беларусаў. Але варта прыгадаць, што акрамя полацкіх крывічоў, якія займалі асяродак і паўночны ўсход сучаснае Беларусі, былі яшчэ дрыгавічы й дулебы з поўдню, радзімічы з Усходу і балцкія плямёны на Захадзе. Таму найменьне «Крывія» нельга аднесьці да беларускага этнасу, які зьяўляецца агульным нашчадкам вышэйзгаданых плямёнаў.

Па-другое — Літва (ці, у адрозьненьне ад цяперашняе Літоўскае рэспублікі — Вялікая Літва). Гэты тэрмін прыйшоў да нас ад гэтак званае летапіснае Літвы, тэрыторыя якой знаходзіцца ў межах заходняе Беларусі. Напачатку заселеная старажытнымі літоўскімі плямёнамі, яна была спакваля асыміляваная прышлымі славянамі, якія, як гэта здаралася й будзе здарацца потым, запазычылі ў тубыльцаў іхную назву. У далейшым гэтая мясьціна і зрабілася асяродкам, вакол якога пачала будавацца літоўска-беларуская дзяржава.

Тым ня менш гэта самы супярэчлівы тапонім. З аднаго боку, гэтак завуць сябе сучасныя нашчадкі жэмайтаў і аўкштайтаў. Зь іншага — гэтак звалася сярэднявечная дзяржава, мова, культура і народ якой, былі у большасьці беларускага паходжаньня. Менавіта ў часы Вялікага Княства Літоўскага пачала складвацца й дасягнула найвышэйшага росквіту беларуская народнасьць. Жыхароў гэтага гаспадарства пачалі зваць ліцьвінамі. Але ў межах Вялікага Княства ліцьвінамі ці літоўцамі зваліся пераважна жыхары заходніх тэрыторыяў, у той час, як усходняя частка — беларусцамі ці беларусінамі. Пэўную ролю ў гэтым, магчыма адыграў канфэсійны падзел на заходніх, каталікоў і ўсходніх, праваслаўных. Гэты падзел існаваў нават напрыканцы XIX стагодзьдзя, аб чым паведамляе ў сваіх працах А.Кіркор, які разьмяжоўвае край на Літоўскае ды Беларускае Палесьсі.

Нарэшце, трэці тапонім — Беларусь. Што тычыцца гэтага найменьня то яно ўпершыню згадваецца ў Дублінскім рукапісе XIII ст. Аўтар геаграфічнага трактату, які ўваходзіць у гэты рукапіс, быў каталіцкім прапаведнікам і доўгі час жыў сярод яцьвягаў і літоўцаў, а таксама прысутнічаў на каранацыі Міндоўга. Сярод пераліку апісаных земляў (Курляндыі, Жамойці, Літвы, Яцьвягаў ды Нальшанаў), ён паведамляе пра сумежную зь імі Белую Русь, якая, верагодней за ўсё, зьмяшчалася недзе ў землях ад Пскова да Турава. Але гэтая назва ня мела пэўнае этнічнае прыналежнасьці і ў розныя часы адносілася да розных тэрыторыяў. Ласьне Белай Русьсю называліся, кожная ў сваю часіну, Полаччына, Смаленшчына, Пскоўшчына (то бок землі крывічоў). Гэтак звалася Суздальская Русь Андрэя Багалюбскага і Масковія Івана III-га. Нават Украіна, пры гетмане Хмяльніцкім...

А ў дзяржаўным справаводзтве Вялікага Княства гэты тэрмін даволі доўга не ўжываўся і зьявіўся толькі ў XVII ст., пры Яне Сабескім, адносна да Мсьціслаўскіх і Магілёўскіх земляў. Канчаткова стала звацца «тутэйшай» краіна напачатку XX ст., у часы купалаўскага Адраджэньня.

Як бачым, ніводны з тэрмінаў ня можа ужывацца паасобку ў дачыненьні да ўсяго краю і яго народа. «Назва нацыі — гэта сьціслы вобраз яе гісторыі,» — пісаў Я.Запруднік. Вядома, можна назваць дзяржаву Беларусьсю Літоўскай і тым самым вырашыць праблематычнае пытаньне гістарычнае спадчыннасьці, зьяднаць беларускія землі ў адзінае цэлае і канчаткова вызначыць, урэшце, заходнія зьнешнепалітычныя прыярытэты нацыі.

Але гэта, напэўна ужо справа наступнага стагодзьдзя, бо зараз у нас ёсьць больш надзённыя пытаньні, якія патрабуюць неадкладных адказаў.

Віктар Пастухоў, Ліда

ДОБРЫ ДЗЕНЬ, ШАНОЎНАЯ РЭДАКЦЫЯ!

Маю тры нагоды напісаць ліст. Па-першае дасылаю свой подпіс пад «Хартыяй '97», па-другое, падпісны квіток, як просіце.

Па-трэцяе, што ж нам прапануе Мікола Самавіты з Глыбокага («НН», №32) замест аднаўленьня Літвы вакол Баранавічаў, як хоча Аляксандар Маргун («НН», №32), зарыем усё ў зямлю і будзем чакаць канца сьвету, а потым прыляцім назад!

Людцы мае добрыя, такі чорны гумар ужо рабіўся явою. Рымляне аднойчы пахавалі свае хаты, статуі, фрэскі ў Пампеі пад Вэзувіем, які няшмат горшы за ўлады РБ, а потым гэтае дабро знайшлі археолягі. Ды нешта не вяртаюцца рымляне, а лацінская мова засталася толькі на этыкетках лекаў, як і беларуская — на паперы, а ня ў вуснах людзей.

Праўда, чаго толькі не бывае. Глядзіш — сядзе лятучая талерка на плошчы Незалежнасьці ў Менску і выйдуць зь яе пяцёра рымлянаў. І тут жа да іх міліцыянт: «Ці маеце дазвол на правядзеньне пікету?» Гой, ня любяць рымляне, калі іх правы парушаюць, і ў хуткім часе на месцы Дома ўраду зацьвілі валошкі й загулі пчолы. І вось прыяжджаюць у Менск бюракраты з усяе краіны, каб вернападданасьць прэзыдэнту выказаць. А яго няма, і на плошчы Незалежнасьці валошкі цьвітуць. «Перад кім сьпіну гнуць будзем?» — спыталіся ў сябе бюракраты і з сумам пайшлі на паклон да Шарэцкага. А той ім: «Мы яшчэ ня скончылі пачатую намі працэдуру аб'яўленьня імпічмэнту, таму супраць усенароднага абранага прэзыдэнта пайсьці не магу» «Дык яго ж няма», — зьдзіўляюцца бюракраты, — каму імпічмэнт аб'яўляць будзеце?» «Прад'явіце шкілет, тады паверу што больш няма», —не здаецца Шарэцкі. Што зробіш, пайшлі блукаць па Менску бюракраты, і набрылі на штаб-кватэру БНФ. Пабачылі Пазьняка й перад ім схіляюцца, чалом б'юць: «Разьлюбезны наш, ня дай памерці, будзь нашым прэзыдэнтам». А Зянон ім кажа: «Ідзіце да Ельцына ў Расею ён вас і накорміць і абагрэе, а нам тут і бяз вас ёсьць што рабіць». Гэтак зьявяліся на Беларусі бюракраты і сталі людзі жыць-пажываць і дабро нажываць.

Тым часам, пакуль няма рымлянаў або канца сьвету, хай жа жыве Літва са сталіцай у Баранавічах. Але толькі не ў Глыбокім, гэта ж натуральная чарга: першыя Баранавічы, другі Парыж (Глыбокае), трэці Рым (Масква), ?, ?, палата №6, бо сакрэтныя гарады пад вышэйшымі нумарамі гэта глупства, на якое здатныя толькі вышэйпамянёныя бюракраты.

Але больш за ўсё беларускаму руху патрэбныя не экзатычныя спробы ратаваньня, а больш-менш абгрунтаваная ідэалёгія. У камуністаў, прыкладам, ёсьць свая тэорыя Маркса, якая прадказвае ім перамогу. А за якія правіны ня маем падобнай тэорыі мы? Доказы і абгрунтаваньні — рэчы магутныя. Падобнае і Ермаловіч рабіў, каб вярнуць нам пачатак гісторыі ВКЛ. На яго злуюцца, але запярэчыць ня могуць, час такі: сёньня можна адмаўляць існаваньне Бога, мы яго ня бачым, але навуку адмаўляць няможна: яе праявы мы бачым, чуем і нюхаем кожны дзень.

Алесь — Палескі Чарадзей, Менск

Пошук стратэгіяў

Сьнежань у Менску атрымаўся багаты на розныя канфэрэнцыі й сэмінары ў трэцім сэктары. Шмат у чым такая актыўнасьць зьвязаная з канцом фінансавага году — многія замежныя фундатары й інстытуцыі, зацікаўленыя ў супрацоўніцтве зь незалежнымі беларускімі арганізацыямі, сьпяшаюцца выкарыстаць грошы. 5 сьнежня так сама было з чаго выбіраць. Эўрапейскія структуры й Хэльсынскі камітэтладзілі канфэрэнцыю па рэгіёну ад Чорнага да Балтыйскага мора. Прадстаўніцтва там сапраўды было на высокім узроўні.

Але я выбраў больш камэрную імпрэзу сэмінар «Беларусь, Польшча, Сярэдняя Эўропа», які арганізавалі ЭўроФорум і Польскі інстытут у Менску. Сэмінар адбываўся 5-6 сьнежня пры садзеяньні і ў памяшканьні Беларускага Гуманітарнага Адукацыйна-Культурнага Цэнтру (БГАКЦ)

Удзельнікамі сэмінару з польскага боку былі Акаш Энгельмаер - вядаўні насоў Вугоршчыны ў Польшчы й Беларусі, які нарэшце стала жыве ў Польшчы, а таксама доктар Станіслаў Брындза-Стабро выкладчык Ягелонскага ўнівэрсытэту, спэцыяліст у польскай культуры сучаснай эпохі.

Даклады й дыскусіі нечакана ажывілі тэмы й успаміны пра вугорскае паўстаньне 1956 году, пра нонканфармізм у культуры, пра пазацэнзурныя літаратурныя выданьні за часамі камуны. Беларускія ўдзельнікі (Ігар Бабкоў і Павал Церашковіч) узьнялі новую беларускую тэму - няскончаную мадэрнасьць.

Названы сэмінар быў першаю акцыяй у рамках толькі што распачатага й абвешчанага на гэтым сэмінары праекту «Беларускі Калегіюм», за які салідарна бяруцца некалькі незалежных беларускіх інстытуцыяў

ЭўроФорум, БГАКЦ, Беларускі Інстытут Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы. Сярод стратэгіяў сучаснага беларускага грамадзтва адукацыйная стратэгія была найменш апрабаванаю. Цяпер ёсьць перакананьне ў неабходнасьці адукацыйных праектаў, зь якіх адным з самых значных стане «Беларускі Калегіюм»

Алы Дзярновіч

Зьміцер Бартосік

РЭХА

Шэсьць гадоў таму, калі я толькі адкрыў для сябе наша Каралеўства, галоўнай і пачэснай задачай для сябе я бачыў поўны й беспаваротны паварот свайго языка на, так бы мовіць, 180 градусаў. Перавод мысьленьня й маўленьня на беларускую мову ўяўляўся мне актам кшталту пасьвячэньня у рыцары, і ня менш захапляў, чым разьвітаньне з Радзімаю. Але ўвесь гэты патас азмрочвала пэрспэктыва размовы з правадніцамі, таксістамі ды дзяржгандляркамі адным словам з тым кантынгентам людзей, у чый абавязак якраз і ўваходзіць даўленьне ды выконваньне кожнага нашага слова.

Я разумеў што рана ці позна такі крок зрабіць прыйдзецца. Самому сабе хлусіць заўсёды цяжэй, але нічога. Колькі я тады знайшоў абгрунтаваных нагодаў для пераносу таго панядзелка, зь якога я и пачну новае жыцьцё ў новай краіне у новым моўным рэжыме. Вось толькі пабачу наш сьцяг на галоўным флагштоку, вось толькі пакіну Літву, вось толькі дачакаюся нашай перамогі на прэзыдэнцкіх выбарах, вось толькі дачую вынікі рэфэрэндуму. Я добра памятую той дзень і памятую сваю першую рэакцыю на тыя лічбы — я запісаў іх на свой асабісты рахунак. Пры «безгаловае быдла» было пасьля, але першая рэакцыя аказалася больш слушнаю. Перачакаў, недачакаўшыся. Я тады часта згадваў Брэдбэры зь ягонаи прычынна-выніковаю сувязяй. Няўжо ён меў рацыю і нейкая дробязь, такая, напрыклад як вымаўленае слова, можа павярнуць хаду гісторыі. Галоўнае, каб тое краевугольнае слова было своечасова пачутае. Калі гэта сапраўды так, то чаму б таму слову ня быць маім? Калі и ёсьць тут элемэнт абсурднага самаўзьвялічваньня то нядоўгі Слова засталося мёртвым...

Чамусьці мне здаецца, што з такімі думкамі я сёньня не адзін. Колькі разоў я назіраў, як мае аднамоўныя прыяцелі пераходзілі пры сутыкненьні з грубым жыцьцём на russian. Не дзеля таго, каб іх лепш зразумелі, а хутчэй у мэтах абароны. Ад чаго? Ад нежаданьня пачувацца меншасьцю ці можа, каб ня даць атаясаміць сябе з Пазьняком? Але тое што мова можа стаць фактарам наступу й атаясамляюцца з больш прывабнымі рэчамі й асобамі, мне здаецца, толькі зараз пачынае ўсьведамляцца тымі, хто сам адпойчы парадзіў ды ажыцьцяўляў прынцып дзьвюхмоўя, ці білінгвізму, яшчэ да ўсялякіх рэфэрэндумаў. Тады гэта была памылка, за якую мы спраўна плацім ужо які год Усё ніяк не даючы сабе рады — вакол каго ж гуртавацца? Вакол тых, што «ў вэртыкалі» — і брыдка, і недальнабачна Вакол тых, што «ў гарызанталі» — сябе не паважаць. І пачынаецца дрыжаньне рук і мазгоў а ўласная інэртнасьць сьпісваецца на адсутнасьць мітычнага лідэра. А лідэр, між тым, ёсьць. Зь ім ня кожны знаёмы, ён ня ў кожнага на слыху але яму не пагражае старэньне й сьмерць. Ягоныя магчымасьці й стратэгічныя якасьці яшчэ не апрабаваныя ў нас і на адну адсотку. Мала каму прыходзіла ў галаву ставіць на яго, як на палітычны, ці, тым больш эканамічны козыр. Што, зрэшты, ніяк ня зьменіла

Невядомыя кнігі Скарыны...

кніга прадалзеная, яе заставалася толькі выкупіць. Працэс выкупу трэба было прысьпешыць, бо тэрміны і ўмовы дыктаваў аўкцыён. Тады я паведаміў дырэктару Нацыянальнае бібліятэкі ў Менску Галіне Алейнік, каб яна знайшла ўсе магчымыя шляхі як найхутчэйшай перадачы грошай, каб можна было выехаць у Лёндан і кнігу выкупіць.

Далей я мушу адгарнуць сумную старонку гэтай гісторыі. На жаль, сама бюракратычная працэдура атрыманьня бібліятэкай грошай даволі складаная, забытаная і ў нашай сытуацыі амаль не пакідала ніякіх шанцаў на посьпех. У той дзень, калі паводле ўмоваў аўкцыёну мне трэба было канчаткова выплаціць (а я, ясная справа, дзеля падстрахоўкі зьвязаўся зь яшчэ некаторымі ўстановамі, якія былі б гатовыя выкупіць гэтую кнігу), грошы, якія міністэрства выдзеліла, толькі меліся паступіць на рахунак бібліятэкі ў выглядзе беларускіх рублёў. І гэтак былі перакрытыя ўсе шляхі гэтай кнігі ў Менск. Абставіны прымусілі мяне прыняць заласное рашэньне і менавіта прапанаваць гэтую кнігу для набыцьця беларускай бібліятэцы ў Лёндане, дзе дырэктарам айцец Аляксандар Надсан.

5 сьнежня ўсё адбылося даволі будзённа. Мы з айцом Надсанам зайшлі ў памяшканьне аўкцыёну. Кніга аказалася цудоўна захаваным фаліянтам у драўлянай вокладцы, абцягнутай валовай скурай. Мы скіравалі да касы, айцец Аляксандар выпісаў чэк і такім чынам акт пакупкі на аўкцыёне «Christie's» адбыўся.

Што да ўладальніка кнігі, аўкцыён ня мае права паведаміць, хто быў той прадавец. Адзінае, што нам паабяцалі (мы пакінулі свае каардынаты), што паспрабуюць зь ім зьвязацца. Нам сказалі, што гэта чалавек, які часта бывае ў разьездах і што калі яны яго знойдуць і калі ён згодзіцца даць нам інфармацыю, яны нам паведамяць. Так што гэта наступны разьдзел гісторыі, разьвязкі якога трэба яшчэ дачакацца.

(Гэты матэрыял падрыхтаваны пры спрыяньні Алены Ціханові і Беларускай рэдакцыі радыё Свабода.)

***

Гадоў 10 таму, калі мы зь сябрамі набіралі тэксты першых незалежных газэт на кампутары, нельга было нават уявіць сабе, якая рэвалюцыя тэхналёгіяў адбудзецца неўзабаве. Тая кампутарная прыстаўка да тэлевізара, зь якой файлы перапісваліся на магнітафон, выглядала больш на забаўку, чым на заўтрашні дзень выдавецкае справы. Тады, 10 гадоў назад, паўсюль яшчэ стаялі лінатыпы і кожны газэтны і кніжны радок адліваўся ў мэтал. Друкарні мала чым зьмяніліся ад Скарынавых часоў. Хіба што болей сталі грукату і смуроду.

І вось сёньня праз 10 гадоў, ужо цяжка ўявіць сабе газэту або кнігу, якая набіраецца ў мэтале, або выдавецтва, не аснашчанае кампутарамі. Найноўшыя праграмы вёрсткі, прыёмы сканаваньня здымкаў, найусялякія шрыфты... Магчымасьцяў столькі, што не пераспрабуеш за жыцьцё. Гэтак на тэрыторыі разваленага сэсэсэру непрыкметна адбылася амаль нікім не заўважаная сапраўдная рэвалюцыя тэхналёгіі, інфармацыі і культуры. Яна стала часткай усеагульнай рэвалюцыі, імя якой Інтэрнэт.

Сусьветная кампутарная сетка заўтра заменіць тэлевізар, радыё, а магчыма і газэты зь бібліятэкамі. Праблема выбару інфармацыі набывае тут зусім іншую якасьць. Вы прыходзіце дадому, сядаеце ў фатэль і выбіраеце не адзін зь пяці або пяцідзесяці тэлеканалаў, а тое, што вам хочацца глядзець і слухаць: апошнія навіны зь любой сфэры жыцьця на любой мове, або кінафільм — адзін з усіх калі-небудзь зьнятых, або нават размову зь сябрам, які пяць гадоў назад эміграваў у Аўстралію і хоча паказаць вам сваіх авец. Іншая якасьць выбару безумоўна паўплывае на характар і сутнасьць чалавека, зьменіць яго так, як у свой час зьмяніла урбанізацыя. Для беларускай культуры гэтыя зьмены азначаюць новы этап — пасьля Скарынавай друкаванай кнігі. Усё гэта адбываецца сёньня, у канцы XX стагодзьдзя, але зьменены культурны ляндшафт мы пабачым, бадай ужо ў наступным тысячагодзьдзі.

Рэвалюцыя адбываецца непрыкметна, але пры гэтым яна татальна руйнуе ўсе ранейшыя ўяўленьні і нават ідэалёгіі. Уявіце сабе гома саветыкуса, які пралічвае мэгабайты свайго харддыска або шукае аднадумцаў у Інтэрнэце. Я не ўяўляю. Рэвалюцыя не заўважаецца, таму што для нас яна ўсё яшчэ чужая. Яна ня стала тэмай дыскусіяў у друку. Усе дыскусіі і пазнавальныя матэрыялы нібы з маўклівае згоды аддадзеныя на водкуп Захаду, дзе, зрэшты і ствараюцца новыя тэхналёгіі. Але пра тое, якія зьмены гэтыя тэхналёгіі прыўносяць у беларушчыну у нас не гаворыць. Хоць, магчыма, гаварыць пра гэта нашмат важней, чым абмяркоўваць антыбеларускія дэструкцыі сёньняшняга рэжыму. Прынамсі, гэта стваральная тэма, якая абяцае беларушчыне вялікую будучыню.

Уявіце сабе, што праз тры-пяць гадоў Інтэрнэт будзе у кожнай школе, у кожнай бібліятэцы у кватэрах. І канкурэнцыйнасьць нашае культуры ў кібэрпрасторы запатрабуе ад нас зусім іншага погляду, іншага мысьленьня, іншых хуткасьцяў. Напрыклад, поўны збор твораў Купалы вы набудзеце на адным кампакт-дыску, дзе акрамя тэкстаў будуць і жывы голас песьняра, і, скажам, відэазапіс ягонай п'есы «Тутэйшыя» ў Купалаўскім тэатры, і ўся пэрсанальная энцыклапэдыя «Янка Купала». Прычым выраб такога дыска зойме некалькі месяцаў, тады як традыцыйны Збор твораў патрабуе доўгіх гадоў выданьня.

Ведаю, што нашы пісьменьнікі старэйшага пакаленьня адхрышчваюцца ад кампутара як ад чорта. Але, на жаль публічныя дыскусіі пра мастацкае слова у Інтэрнэце вядуцца ня ў нас, а ў Амэрыцы, дзе ўжо выказаная ўся магчымая аргумэнтацыя як за так і супраць. Беларусь не навалілася талакою на кібэрпрастору. У нас зусім няма беларусізаваных праграмаў, мы карыстаемся расейскімі, польскімі або ангельскімі. Створаны некалі Віктарам Аўтушкам кампутарны перакладчык з кірыліцы на лацінку — ці не адзіная беларуская праграма за гэтыя 10 гадоў.

Тым ня менш, беларускае слова пашыраецца ў Інтэрнэце. Мы таксама апаноўваем гэтую прастору. Некалькі газэт, падштурхнутых да кібэрпрасторы небясьпекаю быць закрытымі ва ўласна газэтным выглядзе, кнігі, даведнікі. Паказальна, што найбольшая беларуская культурная падзея, зьвязаная з Інтэрнэтам, злучыла сёньняшнюю тэхналягічную рэвалюцыю з папярэдняй, з імем Скарыны. Сяргей Шупа адшукаў у кампутары выстаўленую на продаж ягоную кнігу.

Гэтая падзея нацыянальнага маштабу наштурхоўвае на процілеглыя думкі. Па-першае, пра маральны бок справы, калі асобныя людзі набываюць кнігу, якая б зрабіла гонар нацыянальнай бібліятэцы ды і ўсёй краіне, галоўны праспэкт якой носіць імя першадрукара. Набываюць таму, што дзяржаўныя органы гэтай краіны тое мала абыходзіць. Па-другое, думаецца пра будучыню беларушчыны ў кібэрпрасторы. Другая тэма, безумоўна, цікавейшая, бо дазваляе казаць пра рэальныя справы і самыя неверагодныя фантазіі, якія пры новых тэхналёгіях можна ўвасобіць у жыцьцё. Мабыць, у наступным стагодзьдзі гэтая тэма стане галоўнай тэмай культуры ў Беларусі. А першая думка, наадварот можа завесьці ў прыгнечаны стан, чарговы раз прымусіць казаць пра пагібель беларушчыны, мовы, культуры. Калі ж дзьве гэтыя думкі зьвесьці разам, мы атрымаем яшчэ адзін доказ часовасьці сёньняшняга антыбеларускага рэжыму, які не знайшоў у сабе ані сродкаў, ані цікавасьці, ані элементарнага разуменьня, каб прыдбаць для нашчадкаў вечную кнігу.

Бадай, галоўная асаблівасьць Інтэрнэту — гэта ягоная ўсеагульнасьць. У гэтай прасторы беларуская культура сапраўды адкрытая сьвету. Яе творы могуць уваходзіць у Інтэрнэт у любой кропцы Зямлі і ў любой іншай кропцы прымацца. Яе будучыня тут залежыць толькі ад яе самой. Яшчэ трохі, і гэтая гіганцкая хваля зьнясе на сваім шляху ўсё, што прыносіць нам сёньня так шмат засмучэньняў і праблем.

Сяргей Паўлоўскі

НЕПРАМОЎЛЕНАГА СЛОВА

ўсіх таямніцаў гэтай зусім не сакрэтнай зброі. Я ўсё пра НАШУ МОВУ

«Мова — гэта ж як мама!», — гледзячы проста ў вочы праведніцы, гучна «дзівіўся» мой сябра зь яе неразуменьня «шклянкі гарбаты». Я ж шчыра быў зьдзіўлены той прыемнай пераменай у абслугоўваньні менавіта нашага купэ пасьля тае «мамы». Сапраўды, што можа быць лепшым за такі аргумэнт? Ды яшчэ з адкрытаю усьмешкаю. Меў рацыю Жаглоў — людзі любяць, калі ім усьміхаюцца.

Не франтавыя лініі дэмакраты-камуністы, ці правыя-левыя, ці прызнаныя-непрызнаныя, ці незалежныя-дзяржаўныя, а цьвёрда пастаўленая намі БЕЛАРУСКА-САВЕЦКАЯ граніца можа выратаваць нашыя імёны й нашыя справы. Граніца перш за ўсё па мове. Той, што, хутка як дзесяць гадоў, прысутнічае ў беларускай палітыцы. Мове, як нашаму кансаліданту, нашаму культурнаму полю, як галоўнай прыкмеце нашай «нашасьці», ды нават мове, як фактару эканомікі. Мяжа-прынцып, перш за ўсё ўзьведзеная ў сьвядомасьці, дзе шмат хто з нас ахоўвае сваю «сьвятую» мову ад зямнога ды банальнага блюючыся выпусьціць словы на волю, каб яны нарэшце працавалі.

«Куда едем?», — нахабна запытаў гомельскі таксіст, не пасьпеў я надысьці да машыны. «Дамоў», — адказаў я, сядаючы ў салён. Больш ён да самага дому не прамовіў ні слова, не забыўшыся ўключыць лічыльнік. Мы абодва былі трохі не ў сваёй талерцы. Ён ад таго, што ня ведаў, як сябе з мной, рэдкаю птушкай, паводзіць. Я — ад таго, што ўпершыню ехаў у таксі звычайным пасажырам, гэта значыць тым, хто плаціць і паказвае дарогу. Ад запляпаванага хамства закрыўшыся словам, нібы шчытом.

Разьбітыя расейска- ды ангельскамоўныя вітрыны й рэклямныя стэнды, выбітыя зубы няздольных адказаць на простае пытаньне «Колькі часу?», страх адкіта і ўголас станоўча выказвацца ў коле сваіх аднагодкаў у бок уладаў — можа, на чыюсьці думку гэта сюжэты маёй узбуджана-хворай фантазіі, на маю ж — цалкам магчымы занятак будучых гаўрошаў з Чыжоўкі ды Шабаноў. «Залатая моладзь» ужо дастаткова навыказвалася за мінулыя гады, слова за дзецьмі рабочых кварталаў. За тымі, хто, прыйдзе час, апране лейтэнанцкія й капітанскія пагоны каб прымусіць пані Гісторыю зноў стаць да нас і да нашай будучыні тварам. Але каб генэралы нашых кар'ераў пераходзілі на наш бок, яны ж павінны чуць наша слова. Прычым чуць амаль штодня й без мінорных таноў. Так, каб ім захацелася атаясамляць сябе з намі. Каб ім захацелася перайсьці на наш бок тае Мяжы.

На маё «калі ласка» лідзкая буфэтчыца прыязна перапытала — «ці ня зь Менску я?» Так разам з найлепшым нашым півам я пакаштаваў смак сваёй нечаканай сталічнасьці, дзякуючы белмове. Колькі разоў пасьля гэтага выпадку я з прыемнасьцю адначаўляў гэты смак пры выпадковых дарожных размовах. Зрэшты нічога дзіўнага я ў такой абгортцы нашае мовы не знаходжу. Словаў «калхоз» і «дзяроўня» я ня чуў даўно. Ці яны памёрлі, ці можа, яшчэ дзе жывуць у калхозах? Адным словам, калхозу — калхозава.

Не магу сказаць, што асабіста мне хапае сёньня культурнай ды жыцьцёвай прасторы па наш бок мяжы. Але жыць можна, хоць і прыходзіцца абмяжоўвацца. Хай я занадта мала важу ў ступені ўплыву на навакольную рэальнасьць, але мой грош таксама рэальны. І ніхто не прымусіць мяне «пить» яго «Coca-Cola», калі побач прадаецца «Траецкае піва». Я не прымушу сябе доўга выбіраць паміж «Биг-Маком» і беларускім хат-догам. Таксама як не пайду слухаць ніякую беларускую рок-групу на юбілейным «празьніке Мінска». Трэба адчуваць мяжу дазволенага. Але якраз з культурнаю ежай, прадчуваю, голаду на бліжэйшы час не намячаецца. Прыстойнага чытва мне хопіць, я ўжо не кажу пра тэатральныя ды мастацкія імпрэзы. Вось толькі што рабіць з рэстарацыямі? Была б мая воля, адкрыў бы ўстанову пад назваю «Толька для БЕЛ». Тыя ж, хто сьвядома рушыў на савецкі бок, перш за ўсё, што павінны пачуць — гукі нашых некалі адчыненых, дзьвярэй, што зачыняюцца для іх назаўсёды. Яны павінны адчуць жалезную халодную заслону. З нашага боку.

Ёсьць у Менску крама «Просто джинсы». Там сапраўды добрыя джынсы ня самых «наварочаных» фірмаў і па людзкіх коштах. На маё слова там адказалі мэім жа словам, і нашымі словамі разьвіталіся. Бліжэйшым часам я пайду ў гэтую краму и набуду сабе джынсы чым даражэй, вядома, не забыўшыся параіць ім памяняць пару літараў на шыльдзе. А пасьля зайду ў адну кавярню, дзе абмыю пакупку стопкай «Белай Русі» пад селядзец і шчырае «калі ласка» бармэна. Можа, даць адрасок тае крамы і таго шынка? А чаму гэта я ўвогуле павінен займацца справамі Таварыства Беларускай Мовы?

Зь нядаўняга часу я перастаў радавацца зь дзіцячым захапленьнем кожнаму пачутаму ў адказ ці прачытанаму беларускаму слову. Канчаткова зрабіўшы свой выбар на ягоную карысьць, я ўсё часьцей пераконваюся ў ягоных чарах ды выгодах. Я даўно ўжо не прадстаўнік пераможанага боку. Наадварот, я чалавек з глыбокай глебаю пад нагамі, зь цёплаю вераю ў сэрцы й пэўнымі прынцыпамі ў галаве. Я жыхар з усіх бакоў зручнай для жыцьця эўрапейскай краіны, і нават зь нядаўняга часу яе сталічны абітальнік. Да таго ж, як высьветлілася, у мяне цудоўнае менскае вымаўленьне, якое ў спалучэньні з маім чароўным голасам абяззбройвае нават тралейбусных кантралёраў. Калі ж яшчэ дадаць, у якім кантэксьце я працую ды зь якімі людзьмі побач, то мне становіцца нават перад самім сабою крыху няёмка. І хай у мяне ў гэтую хвіліну няма грошай на тыя джынсы, я не ўяўляю — што можа прымусіць чалавека перайсьці тую мяжу, якая ўсё больш відавочна становіцца мяжой паміж «учора» й «заўтра»

«Міратворства Расеі — блеф»

Дзьве гутаркі з расейскім праваабаронцам Сяргеем Кавалевым

У Менску адбылася канфэрэнцыя «За свабоднае грамадзтва ад Балты да Чорнага мора», зладжаная Міжнароднай Хельсынскай Фэдэрацыяй і Беларускім Хельсынскім Камітэтам Зьбіралася канфэрэнцыя дзеля таго каб засьведчыць салідарнасьць з барацьбоі за правы чалавека у краінах, дзе адбываецца рэстаўрацыя таталітарызму у тым ліку, у Беларусі Аднак, ці удалося арганізатарам, якіх цікавілі правы і свабода чалавека, так бы мовіць у чыстым «пазбаўленым нацыянальнае афарбоўкі» выглядзе, дасягнуць мэты? На маю думку, размовы на зададзеную тэму ў гэткім «лябараторным» выглядзе не атрымалася. Парушальнікам эўрапейскага акадэмічна нэўтральнага падыходу стаў вядомы расейскі праваабаронца Сяргей Кавалёў. У яго знайшлося некалькі важкіх «кампліментаў» як на адрас беларускага чынавенства — за іхнюю дэмагогію (яны зачыталі на канфэрэнцыі «аптымістычны» даклад, маўляў у Беларусі з правамі чалавека ўсё у парадку), так і арганізатараў — за іх ляяльную рэакцыю на гэты «аптымізм» Большую частку сваго дакладу Кавалёў прысьвяціў прыродзе цяперашняе расейскае ўлады якая асабліва яскрава праявілася ў вайне з Чачэніяй

С.Кавалёў Згадайце, дзеля чаго Расея разьвязала гэтую вайну. Каб ухіліць так званы нелігітымны рэжым Дудаева? Дудаева ўхілілі, рэжым застаўся. Каб захаваць Чачэнію ў складзе Расеі? Але пытаньне пра статус вырашае цяпер сама Чачэнія, без Расеі. Яшчэ адна мэта — барацьба са злачыннасьцю. Сёньня там злачыннасьць у дзесяць рэзоў вышэйшая, чым да вайны. Што яшчэ? Абарона некарэннага насельніцтва? Але сёньня зь гэтым насельніцтвам таксама разьбіраюцца толькі чачэнцы. Ну і, нарэшце, — барацьба з ісламскім фундамэнталізмам. Якім да вайны ў Чачэніі нават і ня пахла і які цяпер расквітнеў буйным цьветам. Такім чынам, вайна прывяла чі цалкам процілеглых наступстваў.

«НН»: Ці ўсе палітыкі у Чачэніі перакананыя, што чадуць рады існаваць незалежна?

С.К.: Я ведаю нямала палітыкаў, якія кажуць што Чачэніі цяжка ажыцьцявіць сваю дзяржаўнасьць Таму яны згодныя, што паміж Чачэніяй і Расеяй павінны складвацца асаблівыя дачыненьні пасьля таго, як Чачэнія атрымае незалежнасьць.

«НН»: З чаго складаюцца гэтыя асаблівыя дачыненьні?

С.К.: Зь пяці ўмоваў якія нічым не адрозьніваюцца ад тых, што мы абмяркоўвалі яшчэ з Дудаевым. Агульная армія, агульная мяжа, агульная валюта, супольны зьнешні курс і супольнае кіраваньне нафтаздабычай і нафтаперапрацоўкай. Паўстае пытаньне: за што ж яны ваявалі? За ваўка на сьцягу? Бо ўсё пералічанае — гэта й ёсьць сувэрэнітэт. Я спытваю расейскі бок чаму ў 94-м, замест таго, каб прыняць умовы чачэнскага кіраўніцтва, Расея пачала вайну? Маўчаць. Так што прыгожыя словы пра мітарворства Расеі аказаліся блефам. А мір у Чачэніі — ваенная перамога чачэнцаў.

Алена Лукашэвіч

«Я дауно прызвычаіуся што праваабаронца — ен зауседы недарэчы У Расеі я недарэчы, таму што лічыцца, што я здраджваю інтарэсам расейскага народу.. У Чачэніі таксама не асабліва дарэчы таму што з палітычнымі інтарэсамі адміністрацыі я не магу, ды и не лічу неабходным асабліва лічыцца». Так скончалася маё інтэрвію зь Сяргеем Кавалёвым 24 студзеня гэтага году у адным з чачэнскіх селау Мы працягнулі размову 6 сьнежня у Менску

«НН» Сяргей Адамавіч, на канфэрэнцыі Вы сказалі, што даведаліся шмат новага пра факты хлусьні беларускіх уладаў Што Вы думаеце з гэтым рабіць?

С К.. Гаварыць пра гэта Мяркую што ў нас у Маскве будуць у бліжэйшы час прэс-канфэрэнцыі. Акрамя таго, я таксама сябра Асамблеі Рады Эўропы у Страсбургу І імкнуся бываць там на сэсіях рэгулярна. Урэшце гэта ж эўрапейскія справы!

«НН»· Як Вы ацэньваеце сеньняшнюю сытуацыю ў Чачэніі?

С К.. Атрымаўшы перамогу, чачэнцы сталі панічна баяцца адзін аднаго. Яны баяцца выглядаць недастаткова патрыётамі недастаткова добрымі мусульманамі, што занадта мякка ставяцца да Расеі — так бы мовіць прарасейцамі. Існуе так званае звычаёвае права горцаў — адаты так званыя чачэнец не пакрыўдзіць чачэнца. Таму чачэнец можа заступіцца за чачэнца калі яго іншы чачэнец крыўдзіць. А за «чужога», якога крыўдзіць чачэнец, ён заступіцца ня так энэргічна. Цяжка паверыць, што ў маленькай Чачэніі, дзе усе адзін аднаго ведаюць Масхадаў ці Басаеу не здагадваюцца, хто і дзе трымае закладнікаў-нечачэнцаў. Але іхныя імёны не называюць І ніколі не назавуць.

«НН»: Ці есьць мяжа паміж станоучымі і адмоўнымі рысамі нацыянальнага характару?

С.К Ва ўсіх народаў і самыя узьнеслыя і самыя агідныя рысы характару — з адной крыніцы. У чачэнцаў гэта —гіпэртрафаванае пачуцьцё ўласнай годнасьці. Яны праўдзівыя і шчырыя людзі, яны пагарджаюць сьмерцю яны грэбуюць болем. Я ніколі ня бачыў ніводнага чачэнца, які б стагнаў. Калі ён прытомны. Але іхная сварлівасьць фанабэрыстасьць, ганарыстасьць — так сама іхнае пачуцьцё ўласнай годнасьці...

На гэты конт ёсьць старая чачэнская легенда Канец сьвету Усё жывое гіне. Вецер такі моцны, што забівае ўсіх. І адзін воўк стаіць на скале і стрымлівае гэты вецер. А вецер такі моцны, што шкуру зь яго зьняў. І воўк стаіць голы, бяз шкуры І што ж кажа гэты воўк? Ён кажа: «Калі б я раней ведаў, што я такі моцны я б ім усім паказаў!»

Таццяна Сынiтко

Жоўты пясочак

Працяг са старонкі 1

было выбіць з арыштаваных. А тыя, праклятыя ворагі, таксама маталі ім нэрвы, нізашто не хацелі прызнавацца — выкручваліся, ашуквалі сьледчых, і нават ужо падпісаўшы прызнаньне, адмаўляліся ад яго на судзе. І ўсё бубнілі сваё: нічога ня ведаем, ні ў чым не вінаватыя. Ня шкодзілі, не шпіёнілі, нікога не вэрбавалі. Трэба было выбіць — і прызнаньне, і сьведчаньне, — прозьвішчы, даты, сустрэчы. Часам перабіраў, гэта праўда. Але ж на карысьць справы не для сябе. Той Сёмух сканаў у ягоным кабінэце. Што сканаў, бяда не вялікая, але, сканаўшы, забраў усё з сабою. А на яго была надзея. Як добра далі, пачаў што-нішто паказваць. Думалі, праз яго раскруціць усю іхнюю арганізацыю, да таго ішла справа. А ён узяў ды сканаў...

Купцова застрэліў з таго новенькага ТТ. Але Купцоў кінуўся на яго з кулакамі. А кулакі ў двухмятровага каваля з прэсавага цэху такія што двума ўдарамі мог увагнаць у падлогу Добра, Сурвіла пасьпеў прымяніць зброю. Так што, як глядзець, як вінаваціць Калі строга, паводле новай правазаконнасьці, дык можа, і правільна, — ён вінаваты. А калі паводле рэвалюцыйнай пралетарскай... Зрэшты, ён ня дужа і апраўдваўся — прызнаў усё. Але ў глыбіні душы хацелася спадзявацца, што пакараюць ня надта. Усё ж ён не такая контра, ня польскі шпіён ці беларускі нацыяналіст. Ён жа свой брат чэкіст. Павінны ж на тое зважаць. І цяпер яму крыўдна, што ня зважылі на розьніцу паміж ім і сапраўднымі ворагамі народа піхнулі ў гэтую машыну зь іншымі разам З гэтымі шпіёнамі і шкоднікамі, нацыяналістам і нават недарэзаным буржуем. Кінулі ў адну машыну і яшчэ, глядзі, кінуць у адну яму. Але ж гэта яўны апартунізм правы ўхіл. Ці нават шкодніцтва ў саміх органах.

У машыне панавала цішыня, толькі чуваць было як ляскаюць колы на бруку ды штось наскрыпвае ў куце буды, асабліва калі машына трапляе на выбаіну.

— Гэтак! На кудыкіну, кажаце? — ня мог чагосьці уцяміць Аўтух і зусім апанурыўся ад кепскага прадчуваньня. Відаць, тое прадчуваньне дужа яго гняло і ў хуткім часе ён зноў заварушыўся ў цемры Недзе тут наблізу сядзеў ягоны зямляк, нават аднавясковец хоць і ўдвая маладзейшы за яго з гэткім самым прозьвішчам Казёл Як навучыўся на настаўніка і пачаў пісаць вершы дык зьмяніў тое нягеглае прозьвішча на лепшае і падпісваўся пад вершамі, што часам друкаваліся у газэтах, Фэлікс Гром Праўда, Аўтух вершаў не чытаў, толькі чуў пра іх ад людзей. Зрэшты, пра вершы на сьледзтве зь ім гаварылі мала, болей пра тое, як гэты Фэлікс Казел-Гром завэрбаваў Аўтуха ў сваю шайку Цяпер Аўтух ціха паклікаў:

— Фэля, а Фэля?

— Ну! — пачулася здаля у мэшыне

— Куды гэта нас вязуць?

— На выканаьне прыгавору, — зь нядобрым надломам у голасе адказаў Фэлікс. І менавіта гэты выразна адчуты надлом яшчэ болей устрывожыў Аўтуха.

— Няўжо на расстрэл?

— А ты думаў...

— Але ж... Я дык думаў... Можа, яны...

— Памаўчы лепш! — абарваў размову зямляк якому, відаць па ўсім, было не да таго

Сапраўды, размаўляць Фэліксу Грому было проста неяк, пасьля допыту ў яго душа балела ў грудзёх, было не ўздыхнуць. Ён толькі падзівіўся дзіцячай няўцямнасьці дзядзькі Аўтуха — ня ведае, куды вязуць, ці ня хоча паверыць, што ўсё ўжо скончана. Пазаўчора быў суд — дзесяць хвілін чыткі загадзя нарыхтаваных папераў, зь якіх яшчэ да прысуду ўсё стала зразумела. Відаць нічога не зразумеў з таго ягоны аднавясковец Аўтух Ці ўсё думае пра сваю пакінутую аднаасобніцкую гаспадарку пад лесам?

Фэлікс Гром даўно перастаў думаць і пра родную вёску і пра Менск, дзе жыў і вучыўся як паступіў у пэдагагічны тэхнікум і нават пра сваю паэзію, зборнік якой ужо падрыхтаваў да друку і вясной здаў у выдавецтва. Цяпер яму ўжо не пабачыць таго зборніка, які, відаць, пакаралі раней за аўтара. У час сьледзтва на допытах розныя сьледчыя наперамен цытавалі старонкі ягоных арыштаваных вершаў — чыталі, крэмзалі і падкрэсьлівалі рознымі алоўкамі, пільна шукаючы хітра замаскаванай крамолы. *Бліскае раніца агністая на хмарах восені маёй...* Што значыць гэтыя вашы хмары? Анічога, апроч таго, што значаць хмары наогул. Э, не, у паэзіі хмары — гэта нешта іншае, казалі літаратуразнаўцы з наганамі на баку. Гэта на небе хмары ёсьць хмары, а тут штосьці іншае. Таемнае. Дык што такое гэтыя хмары? Што вы разумееце пад раніцнімі хмарамі?

Ён нічога не хацеў разумець пад хмарамі, затое нешта разумелі яны, але яму не казалі. Ён павінен быў сам здагадацца пра іхныя думкі і падказаць ад сябе. Вось тое было б прызнаньне якога гэтак дамагаліся ад яго, і яму было б куды лепей. Але ён не здагадваўся й не прызнаваўся. Тады яго білі — палкай па нагах ботам у грудзі, не давалі спаць трое сутак

А пасьля пачалі шыць шпіянаж на карысьць Польшчы І прыплялі да яго дзядзьку Аўтуха, што жыў за вёскай на хутары і не ўступаў у калгас А ен з тым Аўтухом па сутнасьці і гутарыў усяго адзін раз летась, як прыяжджаў зь Менску да хворага бацькі Тады хадзіў пазычыць каня, каб зьезьдзіць да доктара Ды дзядзька Аўтух каня ня даў, сказаў узяць у калгасе а яму трэба пасьпець звазіць сена, бо зьбіралася на дождж І гаворкі ў іх было якіх пяць хвілін І вось цяпер за тыя хвіліны — расплата. Абодва — да вышэйшай меры

Ну што вы не насядзеце? Усё тузаецеся, як на патэльні, — пачулася незадаволеная буркатня ў цемры.

— Ды каб выглянуць дзе. Тут жа веска мая Зялёны Луг, — адказаў той, што тузаўся.

— Ты ж гарадзкі, казаў, — азваўся ад дзьвярэй Сурвіла. — Паказваў на допыце: з Камароўкі.

— То ж жыў на Камароўцы. Як на чыгунцы рабіў. А нарадзіўся ў Зялёным... Дэ

— Во — высьняецца! — мовіў Сурвіла. — А то ўсё — рабочы, чыгуначнік. Блытаеце нешта, Шастак.

— Нічога ня блытаю. Паходжаньнем зь вёскі. Але ж рабочы. Тое трэба ўзяць пад увагу І парцейны!

— Быў — каротка абвясьціў Сурвіла.

Рэпліка былога чэкіста зачапіла балючую струну у параненай душы рабочага Шастака які загаманіў як пра што недагаворанае і балючае.

— Быў і астаюся. Ужо не адмоулюся не тэкі Перад парціяй я чысты.

Машыну моцна трасянула на нейкай калдобіне паэт Фэлікс Гром аж войкнуў ад болю ўсярэдзіне Хтось сьпераду ў цемры вылаяўся.

— Падлы! І перад канцом ня могуць па людзку! У бога душу іх маць!..

— А цішай нельга? — зласьліва папракнуў Сурвіла.

— А што цішай?! Цішай-цішай! Ды найшлі вы...

— Ты хто? Як прозьвішча?

— А табе што? Ты сьледчы?

— А хоць бы й так.

— Ну, Зайкоўскі. Калі сьледчы, дык, мабыць запісана ў вашым сратым прыгаворы. Такую іх маць... Ды не навальвайся ты гэтак буржуйскі чмур! — вызьверыўся ён на кагосьці ў цемры. — У мяне во рука зламаная...

Здаровай рукой Зайкоўскі пхнуў у плечы суседа, які на паваротах няўзнак дужа хіліўся да яго і вярэдзіў зламаную лапатку. Пералом быў нутраны, закрыты, стаўся які тыдзень таму на допыце, калі яго з паўгадзіны ахаджвалі два сьледчыя — малады, танклявы, як гліст, і пажылы — вусаты з ордэнам на гімнасьцёрцы. Дабіваліся падпісаць, што ён польскі шпіён, зьвязаны з дыфэнзывай, па прозьвішчы Млынец. Але Зайкоўскі ня быў лазутчыкам, тым болей Млынцом, бо быў звычайны маскоўскі грабежнік, які надумаў ратавацца ад крымінальнага вышуку ў Менску У Маскве за ім лічылі аж восем рабункаў, хоць, папраўдзе грабянуў ён болей (ці не чатырнаццаць) і ўсё неяк выкручваўся, не даваўся ў рукі ні крымінальнаму вышуку, ні ГПУ, ні міліцыі Аж покуль яго ня выдала палюбоўніца Вандзя Подлая стукачка Вандзя сьпярша прыгрэла, а затым прадала. Добра, што ён такі вёрткі і ўцёк зь міліцыі, замачыўшы аднаго мільтона І скеміў, што ў Маскве ягоныя справы скончыліся, трэба рваць кіпці. Тады ён успомніў, што ў Менску некалі пражываў ягоны

САБОР

Страсбур... Штрасбург... Заходне эўрапейская Беласточчына, ня першае і не апошняе спрэчнае скрыжаваньне ў Старым Сьвеце. Калі ўнукі Карла Вялікага ў 843 г дзялілі паміж сабой «саюз нерушымы» дзедавай імпэрыі, старэйшаму Лотару дасталася сярод іншага, скіба тэрыторыі на памежжы Галіі й Нямеччыны увекавечаная пазьней як Лятарынгія. А Страсбург (ад нямецкага Strasse+Burg — фартэца на дарозе) і дагэтуль мае амплуа брамы Аформіўшыся ў якасьці галоўнага гораду Альзасу, ён да канца Трыццацігадовай вайны належаў нямецкаму імпэратару, потым Францыі, пасьля паражэньня Напалеона — зноў пад немцамі а пасьля Першай сусьветнай — зноў у Францыі і, зь перапынкам на гітлераўскую акупацыю, застаецца пад крылом гальскага пеўніка па сёньня

Цяпер Страсбург — адна са сталіц Эурапейскай Супольнасьці, тут месьціцца Рада Эўропы (ня блытаць з Эўрасаюзам у Брусэлі) Альзаская брама расчыненая ў літаральным сэнсе. Франкфурцкі аўтобус на поўнай хуткасьці праносіцца ў цемры каля казённай будыніны былога КПП, дзе — ні душы

Страсбург — той выпадак калі слова «эклектыка» ня мае лаянкавай танальнасьці, а элегантна перадае склада назлучаны характар архітэктурна-мастацкага сказу: нямецкая готыка, клясыцыстычныя палацы a-la Paris, наднацыянальны функцыяналізм кварталу з офісамі Рады Эўропы. І ніводнага паліцыянта! Пазьней мы ўбачылі іх пару разоў. Дужыя малойцы ў пілотках стаялі ля сабору пад час цырымоніі рукапалажэньня новага арцыбіскупа ды яшчэ вязалі нейкіх «ліц алжырскай нацыянальнасьці» ў раёне вакзала.

А першыя патрулі тут наладжвалі цэнтурыёны яшчэ за жыцьця Хрыста, у часы Аўгуста. На пагорку, дзе месьціўся рымскі castrum (умацаваны лягер), пазьней вырасла галоўная хрысьціянская царква і дагэтуль захаваўся легіянэрскі малюнак вуліц. XII ст — эпоха сабораў — уславіла альзаскую мэтраполію. Началася 300-гадовая будоўля і ўпрыгожаньне бэжніцы якой



наканавана было да канца 19 стагодзьдзя заставацца найвышэйшым гмахам Эўропы: вышыня вежы - 162 мэтры Набліжаючыся да гатычнага волата, забываесься пра лічбы. Ягонае магутнае цела і гордая страла вянчаюць сабой горад. Яго бачна адусюль, гэта — вечны архітэктурны маналёг калёса ў прасторы і часе. На сярэднявечных выявах будаўніцтва нагадвае мурашнік. Чалавечкі рупліва чэшуць камяні, караскаюцца зь імі на рыштаваньні І так пакаленьне за пакаленьнем, зь цярплівасьцю кітайца, які, замешваючы адмысловы гатунак гліны ніколі ня ўбачыць канчатковую форму пасцалянавай вазы. Бо патрэбныя стагодзьдзі і творчыя, калектыўныя намаганьні некалькіх хваляў чалавечай энэргіі. Неаслабным прыбоем не баючыся часу выратоўваючы гэтым добрым учынкам свае душы, дойліды скульптары, жывапісцы вітражысты, простыя будаўнікі ствараюць прыступка за прыступкай лесьвіцу ў неба каб быць бліжэй да Бога.

Фасад і парталы страсбурскага сабору — як цудоўны сон, бажавольны дэлірыюм звышчалавечай Anima Divina. Камень губляе сваю фізычную прыроду. Трубным хорам сьпявае арган. Цыкляпічныя карункі выгібаў, вімпэргаў, рэльефаў каменна-паветраным павуціньнем імкнуцца да кругглага вакна-ружы ў цэнтры галоўнага фасаду Боскае вока глядзіць на сьвет, кідае ў прыцемкі інтэр'еру афарбаванае вітражамі сьвятло. Ад пачатковых радкоў Кнігі Быцьця на старонках архітэктурнай кнігі разгортваецца ўнівэрсальная энцыкляпэдыя, сфармуляваная мадэль сярэднявечнага сьвету: біблейскія і эвангельскія сюжэты выявы каралёў і біскупаў, штодзённыя клопаты рамесьнікаў (гэта групавыя партрэты гільдыяў, якія ўклалі свае грошы і працу у будаўніцтва). І яшчэ розная чартаўшчына, якой прысьвяціў свае палымяныя філіпікі рэфарматар каталіцкай царквы Бэрнард Клярвоскі. Таму ў храмах бэрнардынскіх кляштараў на менскім Вышгарадзе мы не сустрэнем падобных «лірычных адступленьняў».

Але вось што дзіўна. Вобразы Збаўцы Мадоны, Царквы гатычны плястык увасабляе з глыбокім піетэтам і павагай да канонаў. Гэта велічная, спакойная ў сваім суладзьдзі скульптура. А як толькі чарга даходзіць да эдмоўных герояў, творчая ініцыятыва расьпярэзваецца і сьмела вырабляе авангардовыя па. Какетліва выгінаюцца грэшныя дзевы перад зямным спакусьнікам (а ззаду, на сьпіне юнака затаіліся гадзюкі і жабы). З карнізаў нястрашна ашчэрваюцца монстры. Прыгожая жыдовачка з завязанымі вачыма і паламанай дзідай — гэта Сынагога. Дынамічны дысбалянс фігуры, багатая плястыка складак, няўпэўненасьць і разгубленасьць гучаць у кожнай рысе. Але праз пакуты і супярэчнасьці мастак дасягае катарсысу — ачышчэньня красой. Проста ня можа быць, каб гэты шэдэўр стварыла нянавісьць. І ўспамінаюцца перад ім ня толькі тысячы ахвяраў страсбурскага пагрому 1348 г., але й мужная пазыцыя некалькіх нямецкіх біскупаў якія здолелі спыніць забойства у той жа год Вялікай Чумы.

Ачалавечаная геамэтрыя фахвэркавых дамоў вядзе нас мілымі вулкамі старога гораду, цераз забудаваныя масты каля млыноў з запрудамі (цяпер тут рэстараны). Шыльды паўсюль дзьвюхмоўныя па-францускуі на альзаска-нямецкім дыялекце Чахарда ўладаў у рэтраспэктыве, здаецца, ня надта хвалюе абарыгенаў. Кожны зь іх, ну як выліты аджарац або мэгрэл, горда заяўляе: «Я — альзасец». Школы выключна французкія але выкладаецца нямецкая мова усе аднолькава свабодна размаўляюць на абедзьвюх. Аднак спроба праз рэфэрэндум адкрыць нямецкамоўныя школы правалілася дзесяць гадоў таму

Выбар сядзібы дзеля Рады Эўропы і ейных структураў быў такім чынам невыпадковым. Мы з Алесем Бяляцкім прыехалі ў Палац Правоў Чалавека ад праваабарончай арганізацыі «Вясна-96» на канфэрэнцыю з удзелам прадстаўнікоў краінаў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы пад эгідай Фундацыі Фрыдрыха Наўмана. На жаль адразу патрапілі ў цэнтар увагі ўсёй стракатай грамады. Такое як у Беларусі, не адбываецца нават у Босьніі і Герцагавіне. Палякі пыталіся: «Чы то праўда?» А ўдушэньне беларускага школьніцтва шакавала нават цыганскую дэпутатку парлямэнту Вугоршчыны. Пасьля нашага дакладу сакратарка пачала раздаваць, як гарачыя булачкі, прэс-рэліз Рады Эўропы пад назвай «Беларусь: паў апошні бастыён дэмакратыі», прысьвечаны закрыцьцю газэты «Свабода». Украінская дэлегацыя адразу выступіла з ініцыятывай прыняцьця рэзалюцыі ў падтрымку дэмакратыі ў Беларусі, супраць парушэньня правоў чалавека і прыгнёту беларускай культуры і мовы рэжымам. Устрымалася ад галасаваньня толькі частка расейскай дэлегацыі.

Перад галоўным будынкам комплексу ўзьняліся шыхтом сьцягі дзяржаваў-сяброў рады Эўропы: ад чорнага арла Альбаніі да сіня-жоўтага ўкраінскага прапара. Мы упэўненыя, знойдзецца тут месца бел-чырвона-беламу сьцягу. А пакуль што афіцыёз РБ быў пазбаўлены статусу спэцыяльна запрошанага госьця за фальшывыя рэфэрэндумы ды посьпехі ў камуністычным будаўніцтве

Валеры Буйвал

дзядзька, зь якім ён ня бачыўся ад самага нэпу. Прыехаўшы, доўга шукаў патрэбны яму нумар на нейкай Заслаўскай вуліцы, а як знайшоў, зразумеў, што дзў маху: дзядзька кудысьці вытрахнуўся у зялёным, з садком дамку жылі іншыя людзі, якія пра дзядзьку й ня чулі. Дзе было яго шукаць і дзе начаваць нават? Пайшоў на вакзал. Ведаў жа: вакзалы — ня самае лепшае месца для такіх, як ён, валацугаў. Але здорава нахадзіўся за дзень, прытаміўся, якраз лінуў дождж, і ён думаў пасядзець крыху, абсохнуць. Ды не стрываў — заснуў. На вакзале яго і ўзялі. Проста гэтак, з усьмешкай два мільтоны папрасілі прайсьці. Во і прайшоў свой надта кароткі, блытаны шлях — ад вакзальнай лавы да лавы падсудных. І цяпер — вышэйшая мера.

Каб ня гэтая лапатка, ён бы, ведама, рызыкнуў. Было яшчэ сілы яшчэ ня ўсю яе выбілі на касталомных допытах. Але з такой лапаткай, лічы, аднарукі. А з адной рукой — квіты, і крантьі. І Зайкоўскі толькі кусаў вусны — ад болю і роспачы, што нічога ня мог перайначыць у сваім недарэчным лёсе.

Між тым аблаяны ім буржуйскі чмур Валяр'янаў адхіснуўся ад сварлівага суседа і не прамовіў ні слова Наогул ён мала зважаў на тое, што рабілася навакол і звыкла жыў у сьвеце ўласных думак — адзіным сьвеце у які мог не пушчаць нікога. Нават у турме. Ні з кенскім, ні з добрым, якое ў гэты праклёты час магло лёгка ператварыцца ў сваю супрацьлегласьць Як і звычайная чалавечая спагада, прыветнасьць што абарочваліся няшчасьцем. Стрыечная сястра Валяр'янава, што пасьля вайны апынулася ў Кракаве, выпадкам дазналася пра гаротны лёс брата які зарабляў на хлеб рахункаводам у Менску і гадаваў двух маленькіх дзяўчатак. Сястра паспагадала. Вясной пад каталіцкі Вялікдзень Валяр'янаў атрымаў на пошце маленькі пакуначак зь нетутэйшымі штампамі, і знайшоў там дзьве дзіцячыя сукеначкі белыя панчошкі, безапасную брытву для сябе і пакецік цукерак у бліскучых абгортках. Для ягоных дзяўчатак то была вялікая радасьць, ды й ён парадаваўся — найбольш першай за пятнаццаць гадоў вестачцы ад сястрычкі-гімназісткі якую, думаў, назаўжды страціў у дзевятнаццатым годзе калі яны разьвіталіся у Кіеве Аднак нядоўгаю была тая іх радасьць. Не мінула і месяца, як неяк пад ранак у дзьверы пастукалі. Жонка Дуся ўскочыла з ложка і адразу заляманталала — яна ўжо прадчувала што гэта такое. Ды й ён здагадаўся адразу адчыніў дзьверы і ўжо не зачыніў іх — зачынілі за ім чужыя. Таксама як і за жонкай, якая білася ў істэрыцы і крычала, і кідалася на кожнага з цэлай зграі чэкістаў што пераварочвалі ў іхным пакойчыку ўсё дагары дном Ужо назаўтра тыя сукеначкі і панчошкі сталі на сьледзтве рэчавымі доказамі ягоных шпіёнскіх сувязяў з польскай разьведкай.

Гэта быў яго шосты арышт пасьля рэвалюцыі. Ён ужо стаміўся апраўдвацца і на допытах збольшага маўчаў, прымаючы зьнявагі і пабоі як штось правамернае і заслужанае. Паміж допытамі жыў у роспачных успамінах аб сваім даўнім, дарэвалюцыйным, гэткім не падобным на цяперашняе, жыцьці. Хоць і там было рознае, але была вучоба, вайсковая служба і нават два перадваенныя падарожжы — у Баварыю і Аўстрыйскія Альпы. У Кракаве ён ніколі ня быў і ня думаў, што гэты незнаёмы горад так трагічна прычыніцца да ягонага лёсу.

Часам бывала, калі трохі сьціхаў вэрхал у камэры, Валяр'янаў маліўся — размаўляў з Богам. Прасіў у яго — не за сябе — за двух маленькіх дзетак, што засталіся цяпер немаведама дзе Болей яму маліцца не было за каго. Прасіць Бога за жонку, мабыць, ня мела сэнсу — ведаючы яе характар, Валяр'янаў думаў, што па-добраму зь ёй не абыдуцца. А на зло яна кідаецца, нібы тыгрыца, не паглядзіць, хто перад ёй — сьледчы, канваір ці нават начальнік турмы, яна ня зважыць ні на чын, ні на сілу. Арыштаваўшы, чэкісты павялі яе са зьвязанымі рукамі. З уласнага досьведу Валяр'янаў ведаў, што такія характары у турме доўга не вытрымліваюць. Або іх забіваюць, або яны — самі забіваюць сябе Страціўшы ў рэвалюцыі першую жонку-дваранку, ён ажаніўся з дворнікавай дачкой Дусяй, думаў, што цяпер прыйшоў іхны час. Але памыліўся. Час настаў, відаць, зусім непрыдатны ні для тых, ні для іншых Не далі жыць з Дусяй, не далі жыць і самой Дусі. І во засталіся цяпер дзьве дзяўчынкі-дашкольніцы што зь імі будзе?

Пра тое, што неўзабаве будзе зь ім самім, Антон Аркадзевіч ня надта турбаваўся, ён разумеў, што прысуд яму вынесены не пазаўчора, а мабыць, яшчэ ў сямнаццатым І то цуд, што ён пражыў пасьля яшчэ столькі гадоў — тэарэтычна тое было немагчыма, — практычна ж неяк атрымалася. Толькі навошта? Што далі яму тыя дадатковыя гады жыцьця? Несканчоную плойму страху, клопату, рызыкі — за сябе, за жонку, за малых дзяцей. Усё ж, мабыць кепска ён зрабіў, што ажаніўся і пусьціў на сьвет галоту, бязбацькавічаў. На што спадзявацца малечы бяз бацькі і маткі — на добрых людзей? Але дзе тыя добрыя людзі. Выведіся дарэшты. Асталася надзея на сьвятое правідзеньне, на Госпада, які няўжо не паможа? Няўжо ня возьме пад сваю боскую апеку маленькіх бездапаможных анёлкаў?

Падобна, машына выехала з гораду, а можа, і збочыла з шашы Рух яе прыкметна запаволіўся, вялізную буду раз за разам трэсла і хістала на выбоінах, часам здавалася, вось-вось яна спыніцца, натужна равучы маторам Партыец-бальшавік Шастак таксама добра ведаў гэтую дарогу і беспамылкова вызначыў, дзе яны едуць Чым далей ад'яджалі ад турмы, тым ён турбаваўся усё болей. У турме за паўгода апошкі ён не сказаць, каб надта і непакоіўся — там у яго былі свае абавязкі: дагадзіць сьледчым, запомніць і як мага дакладней перадаць ім, пра што гаварылі арыштанты. Ужо другі год Шастак быў членам ВКП(б) і разумеў перадавую ролю рабочае клясы ды ейнага авангарду — партыі бальшавікоў. Ён няблага працаваў у дэпо, лічыўся ўдарнікам. Але калі ўжо здарылася такое, што ён апынуўся ў турме, дык і тут трэба паводзіць сябе, як бальшавік: памагаць органам выкрываць ворагаў. Усім ведама, што ворагі — страшэнна хітрыя людзі, яны ўсё тояцца, хітруюць і ашукваюць; патрэбныя д'ябальскія высілкі, каб іх выявіць і пакараць. І Шастак стараўся. Прыкідваўся дурнем, распытваў, слухаў і запамінаў, часам даваў парады. Як гэтаму аднаасобніку Казлу. Прыгаломшанаму і скатаванаму на першых допытах, параіў яму прызнацца ва ўсім і падпісаць, што патрабуюць сьледчыя: маўляў, тады дадуць меней, а то й пусьцяць дамоў. А будзе ўпарціцца — станецца горш, могуць і шлёпнуць. Казёл, здаецца, паверыў і пакрысе падпісаў. І праўда, сьледчы Кутасаў Шастака не ашукаў: Казла перасталі цягаць на допыты, той пасупакайнеў і пачаў чакаць вызваленьня. Сьледчы пахваліў Шастака, які нават парадаваўся за Казла, падумаў, можа, і сапраўды выпусьцяць. Але менавіта пасьля гэтае справы з Казлом штось саскочыла і ў Шастака, падобна, у чымсь западозрылі яго самога Западозрылі, ведама, па-дурному, ні ў чым ён ня быў вінаваты, бо ўсё рабіў, як казалі. І тое, што ад яго запатрабавалі падпісаць паказаньні аб шкодніцтве на пыгунцы, сьпярша здалося яму непаразуменьнем. Але ягоны сьледчы Кутасаў растлумачыў, што як член ВКП(б) ён абавязаны не пярэчыць органам, а пасабляць ім у іхнай ганаровай рабоце. І павінны памятаць, што органы не памыляюцца. Няхай нават каго абвінавацяць несправядліва, але так трэба, каб выкрыць асабліва небясьпечных лазутчыкаў, што зацясаліся ў згуртаваныя рады партыі. Зноў жа нехта павінны і ахвяраваць сабой, як гэта рабілі палымяныя рэвалюцыянэры, — дзеля інтарэсаў рабочае клясы, у імя вялікіх ідэяў Леніна-Сталіна. Партыя ацэніць усё па-справядлівасьці і не забудзе нічых ахвяраў. Такі паварот справы ня дужа падабаўся Шастаку. Натуральна, ён гатовы быў і далей дапамагаць партыі і яе органам, і ўжо нямала зрабіў для таго, але адчуваў, што той шлях, на які яго падштурхоўваў сьледчы, усё ж тоіць у сабе небясьпеку. Адзінае, што суцяшала яго, дык гэта тое бясспрэчнае меркаваньне, што партыі лепей відаць, мабыць, так трэба, партыя не памыляецца. І, сьцяўшы сэрца, ён пагадзіўся. Падпісаў паперы, быццам ён, Шастак Мікалай Іванавіч, зьяўляецца ўдзельнікам групы шкоднікаў пад назвай «Наперад за свабоду» (НЗС), якую ачольвае намесьнік наркама шляхоў зносін. Сказалі, што ён мог бы ўдзельнічаць там і па заданьні органаў і Шастак ужо ведаў, што бывае й так. Галоўнае — пагадзіцца і падпісаць, а пасьля на судзе ўсё адкруціць назад, і яго апраўдаюць. Судзьдзі — яны кваліфікаваныя чэкісты і свайго чалавека з органаў не дадуць у крыўду.

Дагэтуль у Шастака ўсё ішло быццам няблага. Яго ня білі на допытах, абыходзіліся ветліва, з павагай здаралася, нават частавалі гарбатай з цукеркамі. А тут нешта

Працяг на старонцы 6

ЭЎРАПЕЙСКАЕ РЭХА ПОЛАЦКАЙ ТРАГЕДЫІ

Генадзь Сагановіч

Помню, у асьпіранцкія гады ўразіла тэза патрыярха нашай гістарыяграфіі Мітрафана Даўнара-Запольскага які пісаў, што сярэднявечная Беларусь была краінай эўрапейскай. І вось цяпер заўважаю што новавыяўленыя сьведчаньні пра гэта зусім не зьдзіўляюць, а ўспрымаюцца хутчэй як нешта тыповае. Факты трывала ўпісваюць Беларусь у эўрапейскі кантэкст. Варта толькі ўгледзецца

Пра вайну маскоўскага цара Івана Жахлівага ў Інфлянтах захоп Полацка і акупацыю Паўночнай Беларусі пішуць нарэшце нават у школьных падручніках Аднак новыя крыніцы адкрываюць новыя, надзвычай цікавыя аспэкты гэтых здавалася б, хрэстаматыйных падзеяў. Рэч у тым, што з усёй той гісторыі менавіта лёс Полацка выклікаў найбольшы рэзананс у Эўропе

Так увагу Сьвятой Рымскай імпэрыі нямецкай нацыі прыкаваў не напад вялізнай арміі маскоўскага цара на Інфлянты, і нават ня поўны разгром Інфлянцкага ордэна. Нямецкую публіцыстыку тых часоў па-сапраўднаму ажывілі зьвесткі пра зьнішчэньне Полацка. Трагедыі найстарэйшага беларускага горада прысьвечана дзесяць асобных інфармацыйных лісткоў што пабачылі сьвет у тым жа 1563 годзе ў Нюрнбэргу, Аўгсбургу, Любэку ды іншых гарадох, у тым ліку дзьве рукапісныя «газэты». Дзякуючы ласкавай дапамозе прафэсара Андрэаса Капэлера (Кёльн) і Монікі Банькоўскай-Цюліх (Цюрых), мне ўдалося сабраць копіі амаль усіх гэтых старадрукаў, што і дазваляе пазнаёміць зь імі чытачоў «НН»

З усіх датычных Полацка «лятучых лісткоў» бадай першым на часе стала аўгсбурскае выданьне з тытулам «Праўдзівая і страшная газэта пра жудаснага ворага Маскавіта» Яно выйшла пасьля 15 лютага 1563 году недзе адразу пасьля захопу Полацка і друкавалася у некалькіх варыянтах. Вось пачатак лістка «Некалькі тыдняў таму Маскавіт уварваўся ў зямлю польскага караля і вялікай сілай за шостым штурмам заваяваў цьвярдыню, званую Полацак, або Плескі (Pleski), што знаходзіцца ў Літве, 16 міляў ад Вільні. Увесь горад і нават зямля былі выпаленыя а больш за дваццаць тысячаў чалавек... загадаў пасекчы і падушыць. Нельга і расказаць усяго пра тое тыранства якое ён распарадзіўся чыніць над жанчынамі дзяўчатамі і дзеткамі. Шэсьцьдзесят тысячаў чалавек з гэтых і прылеглых месцаў павёў на Маскву, загадаў гнаць жанчын і дзяўчат зусім распранутых, павязаных і палонёных голымі... У гэтай краіне цяпер такі жах, што князь Літвы пан Мікалай Радзівіл ўцёк са свайго княства зусім выракшыся яго».

Эўропу моцна ўражвала апісаньне нечуванай жорсткасьці заваёўнікаў у Полацку і зьвесткі пра масавую дэпартацыю яго жыхароў. Невыпадкова гэты лісток стаў асновай шэрагу іншых падобных друкаў, у прыватнасьці яшчэ трох нямецкіх, лацінскага, францускага і чэскага. Зь ім жа генэтычна зьвязаная і гістарычная нямецкая песьня, выдадзеная ў Любэку ў тым жа 1563 годзе — «Новая песьня пра тыранічнага ворага Маскавіта, як ён напаў на польскага караля і яго зямлю, горад Полацак забраў, разбурыў пабіў і папаліў усё, што яму сустрэлася» Гэта даволі вялікі паэтычны твор (26 слупкоў), у якім цар Іван Жахлівы называецца «ворагам хрысьціянаў» і вершавана апавядаецца пра трагедыю Полацка — дзясяткі тысячаў забітых, дэпартаваных, зьдзекі з палонных ганьбаваньне жанчын і дзяўчат пра гетмана Радзівіла ды інш.

Што да самога заваяваньня Полацка, дык пра гэта, бадай, найпадрабязьней апавядаецца ў нюрнбэргскім «лістку» друкара Мікалая Кнора «Праўдзівае апісаньне таго, як быў заваяваны і забраны Маскавітам вялікі купецкі горад Полацак што ў Літве». Яго асновай стаў ліст зь Вільні, датаваны 9 сакавіка 1563 г.зн. пісаны тады, калі нечакана заатакаваны край ужо прыходзіў у сябе Добра інфармаваны невядомы нам аўтар апісвае ўсе сем груповак войска, прыведзенага царом у Беларусь дэтальна характарызуе яго артылерыю, а потым апавядае пра аблогу горада, яго капітуляцыю і тое, як пераможцы абышліся з насельніцтвам Полацка. Вось фрагмэнт гэтага «лятучага лістка»:

«Такім чынам 15 лютага быў захоплены вялікі горад Полацак, забраная багатая здабыча ў грошах, срэбры і таварах у што, аднак, мала верыцца. Кажуць таксама што ён загадаў абезгаловіць некаторых засьпетых там манахаў, а юдэяў усіх утапіць. Але што далей з русінамі якіх ён выгнаў з горада, — ці дазволіў ім вярнуцца ў горад, ці не — нашыя ведаць ня могуць Андрэю Гесэ, якому было даручана з дваццацю стральцамі ахоўваць арсэнал, адстрэліла па локці абедзьве рукі, да таго ж кавалкам дрэва выбіла вока і адарвала паўбарады. Яго разам з жонкаю і зь дзецьмі Маскавіт распарадзіўся таксама адвезьці ў Маскву, дзе хоча вылячыць і ўтрымліваць да сьмерці. Усе нашыя гарматы — нешта каля сарака вялікіх і малых — загадаў адправіць на Маскву, а горад Полацак заняў сваім людам. Адносна ягонай артылерыі афіцэры і пушкары кажуць што за жыцьцё ў паноў сваіх такіх гармат ня бачылі. Гэтых ён меў сто пяцьдзясят з трыццацю шасьцю вогнекідальнымі якімі страляў і кідаў у горад і замак, ды такія незвычайныя рэчы выстрэльваў і агонь выкідваў што і верыць цяжка».

Гэты самы ліст невядомага віленчука выкарыстаны і як аснова «Дакладнага апісаньня вялікага і магутнага паходу Маскавіта на Полацак» надрукаванага зноў жа ў Нюрнбэргу. Яго асаблівай каштоўнасьцю зьяўляецца выява нерагоднага Полацка - гравюра на тытульным аркушы, на якой бачым вялікі эўрапейскі горад у адкрытую браму якога ўваходзіць коннае войска. Мастак паказаў момант здачы Полацка пасьля прыняцьця ўмоваў капітуляцыі. Беларускую цьвердзь тут не пазнаць высокія магутныя муры, зусім незнаёмыя сылюэты храмаў і вежаў Проста аўтар фіксаваў так званую суб ектыўную рэальнасьць — тое, што ўяўлялася пра наш Полацак у тагачаснай Эўропе. Невыпадкова і ўсе іншыя «лятучыя лісткі» называюць яго «знатным купецкім горадам і крэпасьцю» «самым высакародным замкам і горадам пасьля Вільні» Згадваючы вайну Івана Жахлівага, пазьнейшыя заходнія аўтары гэтаксама характарызавалі Полацак, паказваючы яго вялікім, абнесеным мурамі эўрапейскім горадам.

Асабліва арыгінальным помнікам прысьвечаным гым падзеям зьяўляецца «Вельмі страшная новая газэта пра Маскавіта, які некалькі дзён таму зь дзікім тыранствам захапіў і падавіў Полацак — высакародны горад і крэпасьць Літоўскай зямлі ў Польскай Кароне». Гэта вершаванае апавяданьне пра полацкую трагедыю, напісанае інфлянцкім немцам Ёганам Райнгардам і двойчы друкаванае асобнай брашурай на варш-

Працяг на старонцы 11

ЖОЎТЫ ПЯСОЧАК

Працяг са старонкі 5

перамянілася Тыдні два яго зусім не вадзілі да сьледчага, быццам забыліся, што ён тут сядзіць і чакае. Пасьля павялі на суд. Шастак думаў, што ў адносінах да яго суд — пустая фармальнасьць, але на справе аказалася ня так. Не фармальнасьць. Найперш да яго адразу злосьліва паставіліся канваіры, сурова сустрэлі судзьдзі Кароткі злы допыт здаўся яму недарэчным' мусіць гэтыя судзьдзі ня ведалі, што ў яго інакшая, чымся ў астатніх, справа. Пэўна, ня ведалі. Магчыма, сьледчы Кутасаў штосьці не перадаў ім Якіх папераў ні якіх указаньняў. І калі яму аб'явілі: да вышэйшай меры з канфіскацыяй маёмасьці, ён найперш шчыра зьдзівіўся. Але тут жа падумаў, што мабыць так трэба. Усё ж ён там быў не адзін — іх было шмат, абвінавачаных ворагаў народа. Значыць, яго трэба было прыкрываць, каб не западозрылі іншыя. Хоць бы й той самы Казел Аўтух, які таксама атрымаў вышку А пасьля, можа Шастака і выпусьцяць Бо завошта ж яго расстрэльваць? Яго ўзнагародзіць трэба за ягоныя пяцімесячныя турботы ў турме, за паслугі якія ён аказваў органам і партыі. Пасьля дзён колькі ён цярпліва чакаў у камэры ды марна. Тады пачаў патрабаваць сьледчага, таго ж Кутасава. Аднойчы, калі ён, дужа затрывожаны, грукаў у дзьверы, увайшлі два наглядчыкі й пачалі яго біць. Тады ён адчуў выразна, што ягоная справа дрэнь. Але ўсё роўна не хацелася верыць у кепскае, чакаў, што нарэшце Кутасаў яго пакліча і ўсё стане як трэба. А калі ня кліча, то, можа, яго няма ў турме, можа зьехаў куды ў камандзіроўку У Маскву Ня мог жа ён забыцца, што ў турме-«амэрыканцы» яго чакае верны памагаты органаў, партыец Шастак.

Ён выглядаў сьледчага уначы на падворку як іх вывелі для пасадкі ў машыну, але сьледчага не было і тут. Бы скрозь зямлю праваліўся. Тады Шастак пачаў думаць, што, мабыць, той зьявіцца перад самым расстрэлам і ў апошні момант адлучыць яго ад іншых І ён думаў што галоўнае для яго цяпер, як і раней, — не раскрыцца, не зазлаваць, да канца выканаць свой сакрэтны абавязак Тады ўсё будзе добра. Павінна быць добра.

Машыну дужа пахіліла набок, страсянула матор, чутна было, гучна зароў, але, падобна на тое, яны спыніліся. Сурвіла прыкладна вызначыў, дзе — у лагчыны, дзе заўжды была разьбітая дарога і у мокрыя дні стаялі глыбокія лужыны Надоечы якраз пачаліся дажджы, лужыны маглі й пабольшаць. Седзячы ля дзьвярэй, ён слухаў, як над машынаю марна шархацелі у каламуці колы — машына буксавала. Наперадзе бразнулі дзьверцы кабіны, і пачуўся голас — гэта вылез на дарогу памкамэнданта Косьцікаў, які цяпер ехаў выканаць прысуд.

— Лявей, лявей бяры ты, ахламон! — раздражнёна гукаў ён да шафёра, які старанна газаваў маторам Але машына толькі тузалася на месці камякі гразі пяскаталі па яе жалезным днішчы

— Дай я...

Пачаў газаваць Косьцікаў — і дужа, і цішэй, але падобна дарма — яны толькі глыбей садзіліся у багну.

Некалі гэтага Косьцікава, тады маладога хлопца які толькі пачынаў службу ў органах, перавялі з раёну ў іхную ўправу турмы. На працы яго першым сустрэў Сурвіла, які тады заступіў на дзяжурства. Хударлявы, пясьмелы Косьцікаў уважна слухаў аповед пра заведзеныя ў турме парадкі, абавязковыя строгасьці з арыштантамі. Усё тут было яму новае, Сурвіла ж ужо меў сякі-такі досьвед. Тады ён параіў маладому чэкісту дзе пашукаць кватэру, і той сапраўды знайшоў ладны дамок ля Кальварыйскіх могілак; неўзабаве запрасіў Сурвілу на госьці, і яны добра там выпілі Праз нейкі час Сурвіла перайшоў у сьледчы аддзел на павышэньне, а Косьцікаў застаўся ў камэндатуры на ягонай пасадзе памочніка камэнданта. Цяпер, калі чэкісцкая служба Сурвілы гэтак трагічна канчалася, як бы той самы Косьцікаў не заняў ягонае месца у сьледчым аддзеле. Што ж Сурвіла ня меў падставы пярэчыць: Косьцікаў хлопец талковы, сапраўдны чэкіст не глядзі, што малады гадамі

Урэшце памкамэнданта, відаць зразумеў, што сілаю рухавіка з багны ня вылезьці. Уключыўшы малы газ, ён выскачыў з кабіны і забразгаў засовам машыны.

— Ану — падпіхнем! Ты Мікалай і ты Казёл, вылазьце!

Яны сядзелі блізка ля дзьвярэй і згодна падняліся Сурвіла рашуча скочыў ботамі ў твань, а Аўтух замарудзіў, ня ведаючы, куды тут ступіць Але Косьцікаў зноў злосна прыкрыкнуў, і Аўтух няспрытна плюхнуўся лапцямі ў ваду.

— Давай! Як я скажу — камандаваў Косьцікаў, стоячы на ўзбочыне. — Шафёр, паддай газу! Ну, раз, два — узялі!

Што было сілы яны пачалі піхаць у зад нізка аселай буды — Сурвіла з аднаго боку, Аўтух — з другога. Вакол было цёмна. Збоч ад дарогі чарнеўся ў тумане лес, з начнога перадранішняга неба церушыў дробны дожджык. Колы шалёна кідалі ў іх ашмёткамі гразі Сурвілава скуранка стала хутка макрэць, таксама, як і руды суконны Аўтухаў армяк. Яны дужа стараліся, упіраючыся нагамі ў гразкае дно лужыны, але машына ня зрушвалася зь месца, мусіць, села, як трэба. Калі Косьцікаў зразумеў гэта, то крыкнуў шафёру, каб перастаў газаваць — па-дурному паліць бэнзін. Цяжка дыхаючы, Сурвіла з Аўтухом выпрасталіся У той час з буды пачуўся глухаваты Шастакоў голас:

— Дык гэта... Пусьціце і мяне. Пасаблю..

— Давай! — сказаў Косьцікаў і ступіўшы адною нагой у багну, адчыніў дзьверы. Шастак рашуча скочыў у гразь. Косьцікаў зноў прычыніў дзьверы.

— А ці трэба? — ціха сказаў да яго Сурвіла.

— Нічога! — махнуў рукой памочнік камэнданта — Не ўцякуць...

Ужо ўтрох яны зноў пачалі піхаць машыну, але усе марна тая тузалася, дрыжэла ад натугі, а не кранулася зь месца. Разам зь ёю ўсім целам тузаўся у будзе паэт Фэлікс Гром. Ён думаў, што мабыць трэба было б і яму вылезьці і памагчы, усё ж няёмка сядзець, калі побач надрываюцца людзі. Але яго ня клічуць і, мабыць, не паклічуць. Ён вораг. І ужо куды большы, чым ягоны аднавясковец Аўтух ці рабочы-партыец Шастак, ня кажучы ўжо пра чэкіста Сурвілу. Чаго тут гэты Сурвіла, Фэлікс Гром не зразумеў дагэтуль. Справу таго разглядалі асобна ад іхнай, і, папраўдзе, ягоны лёс ня дужа й цікавіў паэта. Зрэшты, як і лёсы астатніх апроч хіба ягонага земляка Аўтуха. Дзіўна, аднак, што справу камсамольца-паэта зьвязалі з асобаю аднаасобніка, зь якім ён нічым зьвязаны ня быў, апроч хіба таго, што паходзіў з той самай вёскі. Фэлікс Гром быў ужо заўважаны ў літаратуры, а Казёл Аўтух з прычыны свае малапісьменнасьці, наўрад ці чытаў нават газэты. Але во зьвязалі абодвух. Не адразу і мабыць толькі тут у турме, Фэлікс зразумеў, што трапіў у пастку не таму што пачаў пісаць вершы а што пачаў іх пісаць па-беларуску. Расейскія вершы не выклікалі да сябе і дзясятай долі тае ўвагі з боку рэдактараў і крытыкаў, якую выклікалі беларускія. І ён думаў цяпер, які д'ябал падбіў яго да паэзіі, тым больш — беларускай. Калі папраўдзе, дык ён нашмат больш падабаў расейскую — Пушкіна, Лермантава і асабліва Фета. Але пісаць так, як некалі пісаў Фет было немагчыма, яго засьмяялі б свае ж сябры камсамольцы. Належала браць прыклад з Маякоўскага, які зусім не падабаўся Фэліксу Грому. І ён памкнуўся да згуртаваньня «Маладняк», у які дружна ўступалі іншыя маладыя паэты, і пачаў пісаць, як яны, — знарок прыўзьнята, задзірыста, «бурапенна» Стараўся перайначыць у сабе прыроджаныя, а значыць, абывацельскія схільнасьці і густы — усю гэтую любасьць да бору і лесу, пяшчотныя праявы жыцьця засвоіць іншую эстэтыку, інакшы слоўнік, напоўнены грымотай заводзкіх цэхаў, дымам фабрычных труб, калектыўнай працай людзей, будаўнікоў камунізму. І, здаецца, нешта ў яго пачало атрымлівацца. Газэта «Савецкая Беларусь» у аглядзе паэзіі памянула ягонае прозьвішча ў ліку маладых пралетарскіх паэтаў. Нават надрукавала адну страфу зь яго лепшага, на думку крытыка, верша пад назвай «Майскія радзіны»:

Грымяць і стукаюць машыны
турбіны радасна гудуць, —
спраўляюць майскія радзіны
гэта ўдарнікі ідуць

Працяг на старонцы 11

ІНФАРМАТАР

Бясплатныя прыватныя абвесткі

Жыве нацыя! Рэдакцыя «Тыднёвіка Магілёўскага» выпусьціла свой 30-ы нумар. Яшчэ бліжэй да вольнага панства...

Канцылярская пра ца ў хатн х умовах $70 на тыдзень. 2 капэрты, 1 са зв адр + купоны б/з 220082 Менск, а/я 53

Ксэракопія. Фармат А-4, 700 рублёў. Тэл.: 253-92-26

Вайсковая камісія Слуцкай рады БНФ віншуе вайскоўцаў з Новым 1998 годам і жадае ім посьпехаў!

Разглядаем дзіцячыя п'есы беларускіх аўтараў. 224030 Берасьце, Леніна, 56. Тэл.: 26-33-59

Віншую жоначку Надзею з Новым годам, Днём нараджэньня. Любая, няхай спраўдзяцца твае спадзяваньні на будучыню. Аляксей

З Калядамі і Новым годам віншую свіх сяброў па Супольнасьці Літвы, якая ўтварылася 8 лістапада 1997 году. Ганна

Але злосьць – кепскі дарадчык. Часам яна можа штурхнуць высакароднага ў такое балота, у якім сядзіць яго подлы вораг. Ул.Караткевіч

Аліна, віншую цябе зь пятнаццацігодзьдзем! Будзь здаровай, прыгожай, разумнай і шчасьлівай, сьмелай і ўпэўненай у любых абставінах. Шышкевіч Галіна

Ня выжыве дзяржава тая доўга, дзе большасьць неразумная перамагае. Л.Сапега

Прадам 2 жаночыя касьцюмы новыя Тэл.: 221 23 68

КУПОН

Бясплатнай прыватнай абвесткі

Тэкст:

Імя і прозьвішча

Адрас, тэлефон

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220030 Менск, а/с 71

ЗАПРАШАЕ ДОМ ЛІТАРАТАРА

15 сьнежня, панядзелак

Абмеркаваньне творчасьці маладых. Пашыранае бюро сэкцыі крытыкі і літаратуразнаўства Канфэрэнц-заля. А 15 гадзіне

17 сьнежня, серада

«Тут, у Беларусі». Паэтычны тэатар «Зьніч» з Алегам Атаманавым Вялікая заля А 18 гадзіне

18 сьнежня, чацьвер

Сэкцыя прозы Канфэрэнц-заля А 18 гадзіне

22 сьнежня, панядзелак

Прэм'ера дакумэнтальнага фільма «Дыярыюш наваградзкі». Да 200-х угодкаў Адама Міцкевіча. Вялікая заля. А 18 гадзіне

23 сьнежня, аўторак

Сэкцыя літаратуры для дзяцей і юнацтва Канфэрэнц-заля. А 15 гадзіне

Сардэчна запрашаем!

Менск, вул. Фрунзэ, 5. Тэл 236-09-09

NOVA

ГАЛЕРЭЯ ВІЗУАЛЬНЫХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

16 СЬНЕЖНЯ А 18 ГАДЗІНЕ

Alexandro Jodorowsky и ягоны сымбалічны кінематограф (Мэксыка).

El Topo, Santa Sangre

Асыміляцыя славянскай ідэі у лацінаамэрыканскай рэчаіснасьці?

23 СЬНЕЖНЯ А 18 ГАДЗІНЕ

Гітара

Гісторыя аднаго інструмэнта (Кіфара мандаліна, лютня). Фламэнка й Robert Fripp «Віла лобас» дэ Фалья і шмат чаго іншага

Чакаем вас. вул. Веры Харужай 16 чытальная заля. Па дадатковую інфармацыю зьвяртайцеся праз тэлефон 234-22-35

У нашай бібліятэцы для вас. спэцыяльны фонд пэрыёдыкаў па сучаснаму мастацтву на ангельскай нямецкай, польскай мовах. Самыя аўтарытэтныя выданьні Амэрыкі и Эўропы, самыя апошнія навіны art сьвету Пытайцеся ў чытальнай залі

Народны Альбом супольны музычны праект асобных прадстаўнікоў Народа Беларусі

Супольны Музычны праект ажыцьцяўляецца асобнымі прадстаўнікамі на дабраахвотнай аснове.

Народны Альбом зьяўляецца дарам асобных прадстаўнікоў Народа Беларусі ўсяму Народу Беларусі.

Народ Беларусі, такім чынам, прысутнічае ў супольным праекце ў якасьці асобных прадстаўнікоў (выканаўцаў і дапаможных), у якасьці слухачоў, гледачоў, а таксама ў якасьці вобразаў і пэрсанажаў.

Народны Альбом прэзэнтуецца ў аўдыёвізуальнай вэрсіі (касэта і зборнік тэкстаў) а таксама традыцыйным мэтадам (вусная перадача).

Вусная перадача ажыцьцяўляецца праз папярэдняе завучваньне на памяць і пазьнейшы паўтор твору самастойна ці супольна зь сябрамі.

Асоба, якая ажыцьцяўляе вусную перадачу залічваецца да супольнасьці асобных прадстаўнікоў з усімі наступствамі.

Народны Альбом складаецца з 26 песень пра Змаганьне, Застольле, альбо Каханьне Асобна вылучаюцца песьні-развагі пра жыцьцё і долю

Падзеі адбываюцца ў акупаванай белапалякамі Заходняй Беларусі (міжваенны перыяд).

Музычны стыль Альтэрнатыўны Фольк

Крыніцы.

1 Справаздачы этнаграфічных экспэдыцыяў Інстытуту Этнаграфіі і Фальклеру АН БССР 1958-1989 гг.

2 Sergiusz Pesecki «Kola Rahojszy» — London, 1952

3 Песьні Змаганьня (зборнік). — Жэнэва, 1949.

Прэзэнтацыя: 28 сьнежня 1997 году ў памяшканьні Тэатра Юнага Гледача Пачатак а 20.00.

Удзельнічаюць: Кася Камоцкая і «Новае Неба», Вераніка Круглова і «Крыві», Зьміцер Вайцюшкевіч і «Палац», Лявон Вольскі і NRM, Памідораў і хаўрусьнікі, Міхал Анемпадыстаў



Беларускі патрыятычны сьпеўнік

Наша Ніва супольна з камэрным мужчынскім хорам «Унія» працягвае новы праект стварэньне сучаснага Беларускага патрыятычнага сьпеўніка. Апрацаваныя намі тэксты і ноты песень будуць друкавацца на старонках газэты, а вынікам праекту стане кніга «Беларускі патрыятычны сьпеўнік» і аднайменная аудыёкасэта або CD у выкананьні хору «Унія» Выкананьне гэтага праекту мы прымяркоўваем да 80-х угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі (25 сакавіка 1998 г)

МАРШ БЕЛАРУСКАЕ МОЛАДЗІ

Сл Я.Купалы
Муз М Шча лова-Куліковіча

1 На цябе, наша моладзь, надзея
Нашай сумнай забранай зямлі;
Твой арліны палёт цьму разьвее
І запаліць векзвечны агні.

2.Ты разбудзіш прыспаныя сілы
І на вольны паклічаш прастор
З забыцьця беспрасьветнай магілы
Да бліскучага сонца, да зор.

3.Схамяніся-ж, ты, моладзь, арліна
Ў бок другі віхры веяць прымусь,
Бяры сьветач, ідзі за судзьбінай,
Ідзі з словам сьвятым – Беларусь

СЬПЯШАЙЦЕСЯ БАЧЫЦЬ!

Хто з нас калісьці ня марыў пра тую краіну, дзе усялякаму злу наканаванае пакараньне, дзе каханьне заўжды ўвеньчваецца шлюбам а самы жахлівы тыран становіцца сьмешным і недарэчным З гадамі мы не даем веры казкам, але мары не пакідаюць нашыя душы захоўваючы на самай іх глыбіні веру у цуд.

Як робіцца цуд? Занадта проста, як і ўсё геніяльнае Вэнэцыянец Карла Гоцці напісаў цудоўную казку мянчук Рыгор Барадулін перакладае яе на нашу цудоўную мову а масквіч Мікалай Шыйко стварае у Менскім Тэатры юнага гледача цудоўны спэктакаль На якім любы стары тэатрал зь вялікім задавальненьем зможа забыцца на сваю шкодную звычку даваць усяму адзнакі ды цалкам аддацца таму яскраваму дасьціпнаму и музычнаму што адбывалася на сцэне. Калі ж я гэтак апошні раз сьмяяуся да сьлёз? Калі яшчэ я так непасрэдна захапляўся прыгажосьцю прынцэсаў? Калі я так нясьцерпна чакаў канца антракту каб дзея як мага далей не сканчалася? Можа тады калі яшчэ верыу у цуды?..

У мяне няма ніякіх сумневаў у яркай будучыні гэтай краіны ў наступным тысячагодзьдзі. Я таксама ні на хвіліну не сумняваюся ў тым, што праз гэты парог у залаты наш век пяройдзе ўсё лепшае и таленавітае, што было створана беларускімі мастакамі насуперак небеларускаму часу. У тым ліку спэктакаль «Шчасьлівыя жабракі». Але гэта будзе заўтра. А зараз трэба ехаць на вуліцу Энгельса, дзе адбываецца неверагодна сьмешнае, дзёрзкае й прыгожае тэатральнае баляваньне

Зьміцер Бартосік

ЗАЛЬЦБУРСКІ СЭМІНАР

На мінулым тыдні у Менску адзначылі пяцідзесяцігадовы юбілей з дня заснаваньня зальцбурскага сэмінару. Імпрэза ладзілася створанай у мінулым годзе Асацыяцыяй выпускнікоў гэтай установы у памяшканьні фонду IREX.

Зальцбурскі сэмінар заснаваны рыма выпускнікамі Гарвардзкага ўнівэрсытэту ЗША, ставіць сваёй мэтай абмен досьведам і інфармацыяй спэцыялістаў розных краінаў сьвету ў самых розных галінах грамадзкага жыцьця, як напрыклад – палітыка, эканоміка, экалёгія, журналістыка, міжнацыянальныя дачыненьні і гэтак далей. Па асноўных кірунках ладзіцца некалькі дзясяткаў сэмінараў у год. На пачатку сваёй дзейнасьці ў 1947 годзе галоўнай мэтай, якую ставілі перад сабой заснавальнікі, была пабудова адкрытага дэмакратычнага грамадзтва ў Эўропе. У сёньняшнім часе – пашырэньне кантактаў паміж прадстаўнікамі грамадзтваў розных краінаў сьвету, розных ладаў жыцьця. Узаемапранікненьне і пазбаўленьне ад стэрэатыпаў.

З часу свайго заснаваньня курс лекцыяў сэмінару праслухалі 17000 ягоных выпускнікоў, у тым ліку 24 зь Беларусі, якія сёньня плённа працуюць у галінах бізнэсу навукі, палітыкі, адукацыі.

Зальцбурскі сэмінар – вядомая і прэстыжная ўстанова. У сьвяткаваньні з нагоды 50-цігадовага юбілею прымалі ўдзел Міхаіл Гарбачоў і Хілары Клінтан.

Тым, хто жадае папоўніць беларускую калонію выпускнікоў гэтае ўстановы, дадатковую інфармацыю аб умовах конкурсу можна атрымаць у Інфармацыйным цэнтры пасольства ЗША

ПАДПІСКА

Васіль Быкаў

СЬЦЯНА

Каб замовіць новую кнігу прозы Васіля Быкава «Сьцяна», трэба 68.000 (кошт выданьня) + 20.000 (паштовыя выдаткі) пералічыць на рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г Менску Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі у сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць тэлефон

Аляксандар Лукашук

«ЗА КІПУЧАЙ ЧЭКІСЦКАЙ РАБОТАЙ»

Сцэны з жыцьця катау

Новы кнжны праект «НН» — вынік шматгадовага архіўнага пошуку, на падставе дакумэнтау дасьледуюцца унутранае жыцьцё НКВД і норавы чэкістаў-курапатчыкау, мэханізмы цэнзуры і драма сучаснага маральнага выбару, адкрываюцца невядомыя старонкі нацыянальнай трагедыі

Кніга «За кіпучай чэкісцкай работаи» стане чарговым ілюстраваным выданьнем пад грыфам Архіву Найноўшае Гісторыі сьледам за ужо вядомымі нашаму чытачу «Менскаи вяснои 96», «Гартам» і «Філістовічам».

Папярэдняя замова (сабекошт + кошт перасылкі) складае 44 000 + 15 000 БРБ

Каб замовіць кнігу, неабходна пазначаную суму плюс суму за перасылку праз пошту пералічыць на наступны рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ Поіск» г Менску, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кніг и Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон

Зьвяртацца можна праз пошту 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч

КНІП – ПОШТАЙ

Каб замовіць патрэбную Вам кнігу, неабходна пазначаную суму плюс суму за перасылку праз пошту пералічыць на наступны рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г Менску Код 987

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

Зьвяртацца можна праз пошту: 220085 Менск, а/с 5 Віталь Супрановіч

№	Аўтар і назва	кошт	кошт перасылкі
1	Гарт. З успамінаў пра Саюз Беларускіх Патрыётау.	60.000	16.000
2	А.Лукашук. Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста.	28.000	12.000
3	А.Цьвікевіч. «Западноруссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў 19 і пачатку 20 в.	40 000	16 000
4	І.Абдзіраловіч. Адвечным шляхам. Дасьледзіны беларускага сьветапогляду.	10.000	10.000
5	Е.Ширяев. Русь Белая, Русь Чёрная и Литва в картах.	40.000	12.000
6	М.Говард. Сучасная культурная антрапалёгія.	25.000	16.000
7	У.Ла Бар. Асабістасьць з псыхалягічнага пункту гледжаньня.	12.000	10.000
8	Дж.Эйчысан. Гаваркія істоты. Уводзіны ў псыхалінгвістыку.	10.000	12.000
9	Што такое параўнальнае літаратуразнаўства	25.000	12.000
10	Б.Фэйган. Уводзіны ў археалёгію.	10.000	12.000
11	Дж.Лоўзі. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі.	20.000	12.000
12	Ж.Дзюрасэль. Эўропа з 1815 году да нашых дзён.	15.000	16.000
13	Ф.Брэтон. Выбух камунікацыі.	20.000	12.000
14	Ж.Эрш. Філязофскае здумленьне.	30.000	12.000
15	Ш.Дэбаш. Уводзіны ў палітыку.	30000	16.000
16	К.Рын. Дэмакратыя і этычнае жыцьцё.	25.000	10.000
17	Дж.Бэрдшоў. Эканоміка. Ч1: Мікраэканоміка. Дапаможнік для студэнтаў.	45.000	20.000
19	Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры) №2(97)	40.000	20.000
20	Крыўя. №1, 1994	45.000	12.000
21	Крыўя. №1, 1996	55.000	12.000
22	В.Кіпель. Беларусы ў ЗША.	15.000	16.000
23	М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі.	20.000	10.000
24	Т.Сапач. Восень.	10.000	6.000
25	А.Глёбус. Толькі не гавары маёй маме.	30.000	16.000
26	А.Глёбус. Скрыжаваньне.	10.000	6.000
27	Э.Сміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі.	15.000	12.000
28	Беларускі вайсковы строй і зброя.	20.000	6.000
29	Беларускі рок-н-рол.	10.000	6.000
30	П.Бэрк. Рэнэсанс.	25.000	12.000
31	Ю.Штайнэр. Эўрапейскія дэмакратыі.	25.000	20.000
32	Ё.Тэрборн. Эўропа сёньня і заўтра(1945-2000).	32.000	16.000
33	А.Дэні. Гісторыя эканамічнай думкі.	70.000	24.000
34	Я.Найдзюк. Беларусь учора і сёньня.	30.000	12.000
35	В.Гапоненка. Іван Яркоўскі. У пошуках гармоніі сусьвету.	10.000	6.000
36	А.Ятусевіч. Слоўнік зоапаразіталагічных тэрмінаў.	20.000	10.000
37	Ніл Гілевіч. Любоў прасьветлая.	35.000	12.000
38	С.Станкевіч. Русіфікацыя беларускае мовы ў БССР і супраціў русіфікацыйнаму працэсу.	10.000	6.000
39	Г.Сяржаніна. Беларуская навуковая тэрміналёгія. Біялёгія.	10.000	10.000
40	Ніл Гілевіч. Талісман.	15.000	10.000
41	Я.Станкевіч. Маленькі МАСКОЎСКА-БЕЛАРУСКІ слоўнічак.	10.000	6.000
42	Л.Мірачыцкі. Сьветлым ценем Адама Міцкевіча.	10.000	6.000
43	Рэформа беларускага правапісу 1933 года.	6.000	6.000
44	Тэрміналягічны СЛОЎНІК па вышэйшай матэматыцы для ВНУ.	20.000	10.000
45	Ул.Арлоў. Адкуль наш род.	85.000	15.000
46	Я.Запруднік. Беларусь на гістарычных скрыжаваньнях.	55.000	16.000
47	Новы Запавет.	65.000	16.000
48	Каралеўства Беларусь: Посткаляніяльная культура.	105.000	15.000

ДЗІЦЯЧАЯ КНІГА

1	Кася ў школцы	9.000	14.000
2	Шарль Пэро. Чарадзейныя казкі.	20.000	26.000
3	Лагодны Цмок.	15.000	21.000
4	Гарасьо Кірога. Казкі трапічнага лесу.	15.000	21.000
5	Графіня дэ Сэгюр. Зачараваная хатка.	20.000	26.000
6	Марві Яла. Дзівосная Ноч.	15.000	21.000

ЛІТОЎСКАЯ МЭТРЫКА

Выйшла з друку чарговая кніга Мэтрыкі – том 11 (Кніга запісаў). Папярэдне выходзілі тамы 5, 6, 7, 8, 10. Просьба ахвотным дасылаць свае заяўкі пісьмова на адрас: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч. Калі Вы маеце тэлефон пазначце яго

Даведкі праз тэл. 249 08 88 да 10 гадз нау раніцы

Новыя кнігі, дасланыя у рэдакцыю

Аксёнчык Н. Беларусь на крыжы – Вільня «Наша Будучыня» 1997. – 46 с. – Наклад 1.500 ас

Белы А. Любіць Радзіму – шанаваць родную мову. Кніга-альбом / Укладальнік, рэдактар А.Белы. – Менск Выдавецтва клуба «Спадчына», 1997. – 96 с.

Верабей А. Абуджаная памяць: Нарыс жыцьця і творчасьці У.Караткевіча. – Менск: Мастацкая літаратура, 1997. – 256 с іл. – Наклад 2.500 ас. ISBN 985-02-0259-9

Гардзей В. Зялёныя дажджы: Вершы. – Менск: Мастацкая літаратура 1997. 350 с., іл. – Наклад 1 000 ас. ISBN 985-02 0284-X

Илькевич Н. «Душа двоилась...». Повесть, рождённая в Смоленске Смоленск: Библиотека журнала «Край Смоленский» 1997 36 с. ISSN 0868 7242

Илькевич Н., Платонов Р. Александр Ульянов и версия НКВД об антисоветском подполье в БССР (Фальсификация органами НКВД уголовных дел в 1937 1938 гг.) – Менск: Беларускі навукова-дасьледчы інстытут дакумэнтазнаўства и архіўнай справы 1997. – 100 с ISBN 985-6099-33-1

Крапіва К. Збор твораў у 6 т. Т. 1. Вершы, байкі, эпіграмы паэмы / Уклад., прадм., камэнтары С.Лаўшука; Мастак А.Александровіч – Менск: Мастацкая літаратура 1997. – 462 с., іл ISBN 985-02-0247-5 (Т. 1)

Масленицына И., Богодзяж Н. Радзивиллы – несвижские короли. –Менск: Выд-ва «Триоль», 1997. – 224 с., іл. Наклад 5 000 ас. ISBN 985-6445-01-9

Менскае мастацкае вучылішча імя А.К.Глебава пры Беларускай акадэміі мастацтваў. 1947-1997. Каталёг / Укладальнік М.Басалыга. – Менск: Беларусь, 1997. – 47 с. – Наклад 1.000 ас.

Уния в документах: Зборнік / Склад. В.Цяплова, З.Зуева Менск: «Лучи Софии», 1997. – 520 с. ISBN 985-6171-09-1

Фрагмэнты філязофіі, культуралёгіі, літаратуры Сярэднеэўрапейскі культурны агляд. – 1997, № 3-4.

Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі: У 3 т. Т. 1: Ад вытокаў да пачатку XX стагодзьдзя / Беларускі ўнівэрсытэт культуры; Уклад., рэд. тэкстаў, уступны артыкул камэнтары А.Сабалеўскага – 2-е выд., пашыранае і ўдакладн. Менск: Беларуская навука, 1997. 444 с. Наклад 1.000 ас ISBN 985-08-0064-X

Цыбулько Валадзімер. Анёл супрацiву / Пераклад з украінскай Міхася Баярына Менск: ЭўраФорум, 1997. 50 с. (Бібліятэка «Фрагмэнты»).

Шамякин И. Злая звезда: Раман: Для ст. шк. веку / Пер. зь бел Т.Шамякінай; Мастак В.Дударэнка – Менск: Юнацтва, 1997 318 с. – Наклад 7.000 ас. ISBN 985-05-0207-X

Шыцік У. Пойдзеш направа: Аповесьці: Для ст. шк. веку / Мастак І.Налімава – Менск: Юнацтва, 1997. – 366 с., іл. ISBN 985-05-0236-3

Kultura. – № 11 (602) 1997. – Paryż: Instytut Literacki. ISSN 0023-5148

НАРЭШЦЕ!

У сыстэму кнігараспаўсюджаньня паступаў каталёг мастацкае акцыі «Каралеўства Беларусь: Посткаляніяльная культура». У рэпрадукцыях і тэкстах праз кансэрватыўнае мысьленьне але авангардныя формы рэпрэзэнтаваная сучасная беларуская культура Цікавая ўжо не залежна ад рэжыму

Умовы падпіскі – у блеку «Кніга – поштаи» (пазыцыя № 48)

КАСЭТЫ – ПОШТАЙ

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт 38 000 + 7 000 БРБ)

Ален. Нармалёк (1995)
Ален. Нармалёк 2 альбо Мафія (1996)
Вольга Акуліч.Трохкутнік
Вальжына Цярэшчанка (1991 1995)
Беларускія народныя казкі
Музычныя казкі (1996)
Бонда. Найлепшыя песьні
Данчык. Я ад вас далёка. Мы адной табе належым
Данчык. Мы яшчэ сустрэнемся.
Новае неба. Дзеці чорнага гораду (1991)
Новае неба. Сон у трамваі (1994)
Новае неба. Go home (1995)
Новае неба. Мая краіна (1996)
Крама. Хворы на рок-н-рол (1993)
Крама. Гэй, там, налівай! (1994)
Крама. Камэндант (1995)
Крама. Лепшыя песьні (1993-1995)
Мроя. Найлепшыя песьні з праграмау 1988 1990
NRM. LaLaLaLa (1995.)
NRM. Одзірыдзідзіна (1996)
Беларуская музычная літаратура (т.1-4)
Залаты фонд Беларускага рок-н-ролу (т.1-5) т.1. Бонда. Уліс. Рэй. Мясцовы час. Блізьняты (1986-1990) т.2. Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае неба. Мясцовы час. Тутэйшыя хлопцы (1990-1993) т.3. Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & Доктор Моро. Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо (1986-1991) т.4. Палац. Уліс. Крама. Новае неба Мроя (1992-1994) т.5. Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Торнадо. Флэт (1992-1994)
Рок па вакацыях-96 (НРМ. Уліс. Флэт. Торнадо. Крама Рублёвая зона. Новае неба. А.Шадзько і А.Юшын)
Будзьце алтымістамі, рабіце дзетак (Новае неба Ляпис Трубецкой. НРМ. Палац, 1996)
Беларускі джаз т.1. Рэнэсанс т.2. Ігар Сафонау т 3 Яблычная гарбата. Пчаліны танец.
Беларуская гітарная музыка (1996)
Беларуская сымфанічная музыка (1996)
Яўген Паллаўскі. Творы (1996)
Лепшыя музычна-драматычныя творы радыестанцыі «Беларуская маладзёжная» т.1. Чалавек, якому хацелася ўсяго (памяці Ф.Мэркуры) т.2. Лесьвіца ў нябёсы (фантазія па матывах Лед Зэпэлін, Робэрта Планта і Рычарда Баха) т 3 Танец поўні (прагулка са Стынгам)
Андрэй Мельнікаў. Успамін (1994-1995)
Андрэй Мельнікаў. Салам Саўкам (1993)
Андрэй Мельнікаў. Песьні выгнаньня (1991-1993)
Андрэй Мельнікаў. Камяні майго вогнішча (1994-1995)
Андрэй Мельнікаў. Да апошняга камісара (1995-1996)
Андрэй Мельнікаў. Гэта мы (1996)
Андрэй Мельнікаў. Шлях. 2 часткі (1996)
Уліс. Краіна доўгай белай хмары (1990)
Уліс. Чужаніца (1991)
Уліс. Танцы на даху (1993)
Уліс. Life-96
Уліс. Блуканьне (1996)
Мясцовы час. Наша ўскраіна (1991)
Віктар Шалкевіч Смутны беларускі блюз (1996)
Палац (1995)
Песьні беларускіх бардаў (1992)
Рок супраць рэвалюцыяў (Новае неба Зіндан Уліс Мроя. Крама. 1994)
Маладзёжныя хрысьціянскія сьпевы Прыйдзі і праслаўляй (1996)
Ліцьвіны. Неба і зямля (1994)
Ліцьвіны. Пятае сакавіка (1996)
Зьміцер Бартосік. Да пабачэньня... (1996)
Уладзімер Клімовіч. Дзеці вятроў (1997)
Камэлот. У краіне талераў. (1995)
Эдуард Акулін. Мая Крывія. (1996)
Неруш (1997)
Ігар Палівода. «Максім» (1997
Новае неба. Выбранае. Песьні з альбомаў 1990 1996
Уліс. Ратуйце вашыя душы. Песьні з альбомаў 1996 г
NRM. Made in NRM. Песьні з альбомаў 1995-1996
KRIWI - праект фольк-мадэрн студыі «Палац»
Купалінка - Kupalinka. Folk-group
Ліцьвіны. Галуб на чарэшні.
Песьнярок. Песьні «Песьняроў» у выкананьні «Крамы», NRM, «Троіцы», «Тарнада», «Пані Хіды» «Ляпис Трубецкого», «Нейродюбеля», Валіка Грышко
Белы сон (Беласток, 1997)
Харошкі. Полацкі сшытак, традыцыйная музыка (1997)
Жыгімонт Ваза. Стан Галюцынацыі
Марыя Скуратовіч. Табе, Хрысьце!
Песьнярок. CD (170.000)
Кардон. Радыяцыя
Мроя. Дваццаць восьмая зорка
Небясьпечная Зона (Exhumator, Sarcastic Green Barf y s Dreams, Gernunnos, God's Tower ды інш.)

КОШТ КАСЭТАЎ 43.000 + 7.000 ПОШТА

Gods Tower. The Eerie.
Gods Tower. Canticles.
Plastic Hardcore. Ultra.
Chemical Warfare. Demolition Tape
Headcleaner. Hash. Hash. Resistance
Insania Trivium. Candle of Fire.

Касэты можна замовіць праз пошту 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч

НАВІНКА!

Самсон Пярловіч. Чарадзейны агонь. — Наваградак, 1997. — 309 с. — 500 ас

Інфармацыю пра выхад гэтае кнігі даслаў нам аутар «Шуфляды» сп. Кастусь Рамановіч. Вось як ён пракамэнтаваў кнігу:

«Шмат зь вершау, надрукаваных у гэтаи кнізе, дапамагаў Пярловічу ў лягерох ГУЛАГу захоўваць і я, запісваючы іх агрызкам алоўка на дошчачцы драўлянай. Вывучвоў іх на памяць, а потым з дошчачцы саскрэбваў шкельцам, каб запісаць на ёй наступны верш. Дошчачку, агрызак алоўка й шкельца старанна хавалі ад «шмону». У гэтай кнізе мастацкай прозай напісаны Пярловічам успамін пра выеаз у Сібір кулакоў – апавяданьне «Да белых медзьвядзёў». У паэме «Адам Чабоцька – слаўны Друг» – успамін пра вываз Самсона й Адама ў нямецкі лягер а пазьней – у савецкі, дзе і я разам зь імі быў»

Умовы атрыманьня кнігі:

Трэба даслаць на адрас сп. Пярловіча 70.000 руб (50.000 – кошт выданьня, 20.000 – кошт перасылкі), а на квітанцыі напісаць свой дакладны адрас.

Пярловіч Самсон Георгіевіч

Наваградак 231400 вул Менская дом 29

«М Ф Клюб» запрашае 19 сьнежня 1997 году ў «Рэзэрвацыю» (вул. Бяды, 4) і 3 студзеня 1998 году ў кінатэатар «Бярэсьце» на «Беларускія дысткатэкі». Пачатак а 19 гадзіне.

21 сьнежня 1997 году у канцэртавай залі «Менск» гурт «Палац» ладзіць прэзэнтацыю новага альбому «Дарожка». Возьме ўдзел праект студыі Палац – гурт «Крыві».

17 сьнежня 1997 году ў Доме літаратара ад будзецца сольны канцэрт барда Алега Атамана ва. Пачатак а 18 гадзіне Кошт квіткоў 30 000 рублёў.

БЕЛАРУСКІЯ МУЗЫЧНЫЯ НАВІНКІ:

1. Сяржук Мінскевіч. Жахі. – Літаратурна-мастацкая суполка (1997).
2. Андрэй Мельнікаў. Гэта Мы! – Анархія рэкардз (1996)
3. Якаў Навуменка. Сіні Сон. – Каўчэг, З.Б.С (1997)
4. Палац. Дарожка. – Часопіс «Уши» (1997).

НАВІНКА!



Цыбулько Валадзімер. Анёл супрацiву / Пераклад з украінскай Міхася Баярына – Менск: ЭўроФорум, 1997. – 50 с (Бібліятэка «Фрагмэнты»)

Выхад кніжкі сучаснага ўкраінскага эсэісты быў прымеркаваны да канфэрэнцыі «Беларусь і Ўкраіна Вынікі стагодзьдзя», якую 12 14 сьнежня ладзіў ЭўроФорум

НАВІНКА !

ФРАГМЭНТЫ філязофіі, культуралёгіі, літаратуры Сярэднеэўрапейскі культурны агляд – 1997, № 3-4.

Новы нумар «Фрагмэнтаў» прысьвечаны Супрацiву й Бунту – іхнім сэнсу и нонсэнсу

грамафон.

Андрэй Аляксандраў

Я меў нахабства
размаўляць па беларуску
на вуліцы.
Натоўп глядзеў тужліва
са шкадаваньнем
бо народ наш добры
сардэчны
ім шкада вар'ятаў

Калі пачуў адказ
на нейкай мове
(мне кажуць што расейскай
але Пушкін
напэўна,
у труне перавярнуўся)
я моўчкі паглядзеў
на гэты шэры сьляпы натоўп
і сьлёзы жалю
і шкадаваньня
мне заслалі вочы
як і заўжды,
калі гляджу
на мёртвых

Аляксандар Антончык

НАСТАЛЬГІЯ

Калі вечар блакітны настаў,
І неба зоркамі стала пакрыта,
Я ўспомніў родныя мясьціны
дзе юнацтва імгненьнем пражыта

Я ўспомніў, як жыў там і рос
Між сяброў — бясклапотных падлеткаў
Як хацеў пахутчэй і назаўжды
Зьехаць у горад ад хат і палеткаў

Як ірваўся з надзеяй знайсьці ў ім
Крышку шчасьця, прызнаньня, каханьня
Вецер часу пажар мой прыстудзіў
прыглушыў смагу юных жаданьняў

Ціш палёў, шум гаёў і дуброў
Прамяняў я на рокат матораў,
Пах асфальту і дым ад машын
Узнагарода за вольны мой нораў

Я зьмяняў сарамлівую вёску
На каменьняў красу гарадзкую
Я зьмяніў, дык чаму ж і аб чым
Па начах у адзіноце сумую?

Я сумую ручай, аб табе,
Сьпевах вод тваіх чыстых, іскрыстых
Моры пырск, што ляцела ўгару
Да нябёс залаціста-празрыстых

Аб узгорку зялёным тужу
Адкуль бачыў блакітныя далі
За якім жыла цуда-тайны,
Што мяне ў той час хвалявалі

Жыву ў горадзе, мары збыліся.
Нехта скажа, што гэта ўдача,
Але ж у моры людзкой мітусьні
Сэрца зноў неназіцца й плача.

Аб рабінках яно плача, тужыць,
Што як сёстры жылі каля хаты,
Пакуль іх, ненаглядных красунь,
Не пагрыз зьвер жалезны зубаты

Аб абшарах зялёных уздыхае
Загубіўшыся ў травах крыніцы
Вераб'ях на палёвай сьцяжыне
І пахучай чырвонай суніцы

Не, ня кіну я шум гарадзкі
Зь мітусьнёй разналікага люду
І яшчэ не адзін — многа год
Жыць у каменным раі гэтым буду

Буду плыць сярод мора турбот
Па фарватары з назвай — Надзея
Пакуль ветразь на якім жыцьця
Не парве нечакана завея

Сяргей Герасімаў

ТАПЕЛЬСКІЯ ПАМКНЕНЬНІ

Маё каханьне адплывае ў ночы
На лодцы, што трымае цяжар цела
У апошні момант некуды саскочыць,
Апошні раз у глыбіні сьцямнее

Твой позірк нагадае тое сьвята,
Дзе я спазьніўся на адну хвіліну
Твае далоні выкажуць жаданьне
Але бывай я згіну у новай плыні

Няхай у цемры нешта адаб'ецца
Хутчэй сьвятло, напэўна калярова
Ды ўсё ж мяжа між імі не вядзецца
Ні цыркулем, ні пальцам, ні алоўкам

Вада ня стане нафтай аніколі
Якой бы чорнай ноч ні малявала
Застанецца яна празрыстым цікім болем
Успамінам месца вырашанай справы

Духмяны водар ранішы паветра
Перачыркне тапельскія памкненьні
Бо то — ў мінулым, і забыцца трэба
Маліць у каханай шчыра прабачэньня

Тацяна Будовіч

Вы мяне паклічце
Імем не маім.
Не такім нязбытным,
Не такім забытым
Вамі, дарагі

1833

Адна я дагледжаю сына
Адну сябе павінна я любіць,
Каб не было балюча зноў.
Яшчэ дзіця — а бараніць
вымецца штосьці
Зусім як бацька
зь дзядай у руцэ
Свабоду барэны

Генадзь Драгун

РЭВАЛЮЦЫЯ

Кожную раніцу народ, як кісель кіпіць
Выліваецца з кватэр
Запаўняе сабой транспарт
Хвалюецца булькае пад стольлю
Прывозіць сябе на месца працы
Павольна выцякае
У той дзень народ ня стаў
Разбрызгваць сябе па трамваях
Пругкам кісельнай масаю пакрыў
Вуліцы плошчы праспэкты парк й скверы.
Так пачалася рэвалюцыя.
Цяжка прыйшлося потым прыбіральшчыкам
Змываць з асфальту чырвоныя кісельныя плямы
Вычышчаць з бруку салодкія кавалачкі крухмалу
О то было для ўсіх незабыўнае уражаньне

Уладзімер Жаўняк

НЕ ПІШЫ, ШТО ТЫ НЕ ГЕРОЙ

Час ліецца імклівай ракой
Ты прайшоў праз усе перашкоды
Не пішы, што ты не герой,
Для мяне ты ім будзеш заўсёды

Ты ня любіш людзей — эгаіст
Але ты і сябе не шкадуеш —
Ты ідзеш, а вакол куляў сьвіст
Толькі ты іх ніколі ня чуеш.

Ты гатовы пайсьці на усё,
Кожны крок твой за нашу Айчыну
Па табе даўно плачуць лязо
І твае маладыя жанчыны

Твае вершы аж хлешчуць жыцьцём
Маладосьцю і нечым нязнаным.
Ты — змагар, і прайшоў праз усё,
Хай гаіцца хутчэй твае раны.

Пройдзе час вораг сыдзе у нябыт
Промні сонца прабіюцца праз хмары,
Будзем вольнымі жыць, бачыць неба блакіт
І зьдзейсьняць нашы сьветлыя мары

Пётар Касьцюковіч

БЕЛАРУСКІМ «КАМУНІСТАМ»

Васілю Новікаву лідэру ПКБ прысьвячаю

Камуніст — гэта гонар планэты:
Зь ім надзеі на шчасьце прыйшлі;
Камуніст — гэта заклік к Сусьвету
Даць дзяржаўнасьць народам Зямлі!

Камуніст не заве к абрусеньню
Зьвышдзяржавы суседняй ахвяр!
Камуніст гэта мовам спасеньне
Незалежнасьці нацый пясьняр

Камуніст — гэта шчырая вера
У перамогу сьвятла і дабра;
Камуніст — гэта сьвятасьці мера
І яднаньня працоўных зара!

Камуніст — гэта родная мова
І прыстойнасьць ларывау душы
Камуніст — гэта божае слова
У ахопленай горам цішы

Камуніст! Гэта імя вам трэба
Каб уладу ізноў ахапіць,
Каб падняцца харомамі ў неба
І крыві вальнадумства папіць!

Камуніст! Вы ня маеце права
Гэтым імем сябе называць:
У вас праўды душыцеляў слава
У вас здольнасьць адна — забіваць

Хто з вас ведае родную мову?
Хто свабоду чачэнцаў вітаў?
Кожны з вас беларускае слова
Ненавідзець, як ворага, стаў!

Вам рухае тайная мэта —
Далучыць нас к Расеі хутчэй
з другімі зрабілі б вы гэта,
Каб другія ня мелі вачэй!

Вы зьнішчаеце родную мову
Каб краіну Расеі прадаць;
Пастраляць патрыётаў гатовы
Толькі б нацыі выжыць ня даць!

Таму вы не радня камуністам.
Саюз з рускімі шлях да ярма
У Расеі раздольле фашыстам —
Камуністаў у Расеі няма!

Аляксандар Конан

Сумненьні, поўныя адчаю,
Зьнішчаюць думкі твае зноў.
Дзеля чаго ўвесь час шукаеш,
Зьбіраеш праўды сотні слоў.

Чаго ж душа твая жадае?
Куды ляжыць ад сэрца шлях?
Няўжо так хутка забываеш
Што кроў і сьлезы на губах

За што змагаесься нястрымна
Няўхільна адбіваеш крок
Навошта ўсё табе хлапчына
Ці можа лепшы гэта рок?

Ты сапраўды у гэта верыш?
Пакуль зямля твая гарыць.
Народ зьнявечаны ня зьмерыш,
Чаму ж тады твой рок маўчыць?

Ня скажа нават ён і слова,
І вечна будзе ён маўчаць!
Пакуль ня зьнішчыш злое кола
Што стала нас пераможцаць.

Пакуль ня устане кожны з долу
І не дапоўніць праўды рэць.
Ня ўставіць палку ў тое кола,
Датуль нас будзе прыціскаць.

Яўхім Корчак

•

Мне паказалі: рэйкі
Сказалі, што гэта чыгунка
Сказалі і пасадзілі
На самы лепшы цягнік.
Вагоны сьпявалі песьні,
І грукалі колы гулка
Поезд ляцеў да шчасьця
А напаткаў тупік

Мне паказалі рэйкі...
А лепш паказалі б кветкі,
А лепш паказалі б рэчку
І не садзілі нікуды,
Нікуды б і не вязьлі

Марыля Лагодзіч

Мае вэхно маўчыць дрымотай ночы,
Фіранкамі глядзіць на сонны горад.
А побач Воля Шляхам Млечным крочыць
Гуляю валасамі дзёрзкіх зорак

І сьвечка танчыць у пакоі цёмным
І на канале плача Адрыёта —
Я ня ўзяла яе з сабою сёньня,
Калі ляцела па-над срэбнай слотаі

Пакінула Каханьне на падлозе
Разьбіла келіх з думкаю распутнаі
І з Воляй, што чакала на парозе
Пайшла шукаць Надзею і пакуту

Паміж радкоў незразумелаі хвалі
Гучалі ненапісаныя песьні.
І туманы цыгарныя хавалі
Вясны недамалёваныя крэслы

І ліхтароў няўрымсьлівыя вочы
Міргцелі над карункамі рэклямы.
І нейкі цень непрадказальны, змрочны
Пісаў алоўкам згубленую драму.

І колькі вусны поўню цалавалі
Ды ў іхніх пацалунках
Плыла вада і мроі, і адчаю
пакуты і надзеі падарункаў.

Дзяніс Лісейчыкаў

КАНТРАСТЫ РЭЧАІСНАСЬЦІ

ЯК БЫЛО

Патанулі ў дрыгве нябёсы
Сьветлай ноччу ды зь ціхім крыкам
Напалоханы рыбы рыкам,
Пагубляў свае боты босы

Засьмяяўся вялікі трагік,
Хадуном захадзілі горы,
Трохпудовы ліхі сьціжорык
На талерку нарэзаў брагі

А з вулкана нясло марозам,
Аж замерзла вада ў Сахары,
І прыемным цяжкім перагарам
Дыхаў п'яна му ў твар цьвярозы

Уся Зямля засынала ураньні
Быў сталіцай Эўропы Кобрын
Чалавек жыў разумна й добра
А жыцьцем кіравала каханьне

ЯК ЁСЬЦЬ

Ахапіўся лядашчы шчасьцем
Абнадзеіўся сном самагубца
Конь стары, атрымаўшы дубцам
Ад адданасьці хоча ўпасьці

Раскідаўся магутны замак
Спарахнелі старыя косьці,
Зноў татары жаданым госьцем
У двор заходзіць, і дом той самы

Песьняру ботам сквіцу правіць
Рэгістрацыя йдзе для анёлаў.
Куцахвосты чарцяк камолы
Нумары ў дакумэнтах ставіць

У тэатры адбудзецца хутка
Дэманстрацыя мод нудыстаў.
У прыбіральнях, як неба чыстых
Палціраюцца Трэцім Статутам

У альманах заварочваюць сала
І плююцца штодня ў студню,
У вульлёх каранююцца трутні,
А сымболь гаспадараньня — джала

Засьвісьцела зіма сьнягамі
Закавала ільдзінамі лета.
Як надзея праз зьдзек, камэта
пакруцула хвас ом над намі

Зьміцер Літвін

У СЭКЦЕ

Сэктанцкі настрой вітаў над намі
І чулі мы словы доктара Муна
Я каляханак зьядаў вачамі,
Я слухаў прамовы доктара Яна
Я тут сустрэў Надзею, Яну
Сьвятлану, Касю, ды і шмат іншых
Тут нават былі сёстры з Кітаю
Сёстры зь Японіі, і што за Крышну
Але ўсе словы ляцелі сналамі
Сэктанцкі настрой вітаў над намі
А гэта значыць былі дурныя
Усе мы разам, і я разам зь імі
Але ж была альтэрнатыва
Прапанавала вучэньне Муна
Замест трох шклянак апэрытыву
Каб выпіць сокі краіны Карэі
Каб нарадзіліся асыміляты
Пад сьцягам сонца сэктанцкай веры
Палова сям'і каб была з Кітаю
Ну а другая была з Жэневы
Дык вось чамусьці маё шчасьце
Мяне і ў сэкце не адпускала.
Я такім чынам, не спакусіўся
Узяць сабе ў жонкі дзяўчу з Кітаю
Сэктанцкі настрой вітаў над намі
Цяпер яны лічаць мяне чужынцам
Не асыміляваў дзевак з Карэі,
Дзевак зь Вьетнаму і Парагваю
Толькі жыву я ў сваёй краіне,
Шаную я толькі сваю Радзіму.
Я не пад сьцягам сэктанцкай веры
Мне даражэй за ўсё родныя нетры

Ю.Максіменка

• •

Наканавана лесам мне
Адлюстраваньнем быць тваім
Дзень дужа хутка праміне,
Дзень зьнікне раптам, нібы дым
Адлюстраваньнем быць тваім
Наканавана лёсам мне...

•

Адноічы дзьверы мне адчыніш
Адноічы словы ціха скажаш
І задуменнымі вачыма,
Як навальніцаю, абпаліш.

За гэтыя вось, мабыць, вочы
Я пакахаў цябе адноічы

Алесь Менскі

НЕБЯСЬПЕЧНЫЯ ГУЛЬНІ

Пакрыўджаныя людзі зьбіраюцца на сход
Паразмаўляць пра зброю, паслухаць пра народ.
Увечары забудуцца яны нэрвовым сном
Небясьпечныя гульні —
гульні з вагнем!

Мой сябра хуткім крокам разьмервае пакой,
Абдумваючы нешта, згубіўшы свой спакой
Ваду п'е з поўнай шклянкі бы алькаголь нагбом.
Небясьпечныя гульні —
гульні з вагнем.

А нехта зноў сядае ў шыкоўнае аўто,
Захутваецца зьвыкла ў даўгое паліто
І пакрысе здагадваецца шостым пачуцьцём —
Небясьпечныя гульні
гульні з вагнём!

Янка Нарачанскі

ЗІМОВЫЯ МРОІ

Як цяжка дачакацца да вясны,
Дзе незвычайны казачны сьвітанак
У мае зямрочныя, марозныя сны
Прыходзяць часам, як ад ранак

Крадзецца ціха нібы шэры воўк
Цераз хмызьняк густы на паляваньне
І па начах так зноўк і зноўк,
Зімовыя імчаць усе вандраваньні

Мне не пазбыцца ад зімовых мроі
Яны імклівыя, нібыта летуценьні.
На ўвесь жыцьцёвы шлях яны са мной
Пакінуць многія прыемныя імгненьні.

Наперад, у бясконцасьць, на прастор
Нясецца жвавы конь усьведамленьня
Да месяца, ці мо да зор...
Уражаньняў нястрымаваных памкненьні

Праносяцца імклівы тут і там
Дарожныя заіней ыя талолі
Не Нарачанскі край я не прадам
Бо сэрца там — на сьнежным полі

З маленства закаханы у гэты кут:
У яго бары, палеткі, сенажаці.
І не пазбыцца ад яго нястрымных пут
Дзівосных шэрагаў прыродныя палацы

Азерны край, ты мой навек:
Бо Мястрам і Баторынам жывуюся
Тут нарадзіўся, як паэт і чалавек
І ўсё жыцьцё сваім я краем ганаруся!

Ігар Пракаповіч

РУЖА У ВАКНЕ

Студзень. Дождж. Ізноў адліга
Сьне чарнее ад вады,
І туман пануры ціха
Ліжа сьцежкі і сьляды

То варона карэне хрыпла
То сабака голас дасьць
Дзень у змрок сьцякае зьвыкла
Як на дно ў бузу карась

Дрэвы у кроплях выпарэньняў
Плачуць быццам... Час паўзе...
Як надзея...
Як маленьне..
Ружа белая ў вакне

Сяргей Прылуцкі

• •

Прыйдзі
і расчыні усе дзьверы
Імчы удалячынь.
Самлелая трава
Насустрач
першароднасьці... тварэньню
Несупыннаму сухавею
здавальненьняў
спрэчак —
насуперак
Да пачатку
зацярушаны шлях

Па-за
Фатальнае...
Сьвіцца ..
Згарэць у полымі
Упусьціць у самую сутнасьць
іншароднасьць
Сутнасьць
акружы
сваю
сабой
сваім
сваёю
У русе узрасьці

Падымалася постаць...
І пачуўся гук...
Варушыцца лістота —
сьцелецца па дому
Згубіўся час...
Імкнецца ўперад дух
Мільгаюць збоку шэрыя сутоньні.
Ліхтар міргае ўдалечыні...
У іншым вымярэньні і прасторы...
Як лёгка заблудзіцца і пайсьці
па іншаі бессэнсоўнае дарозе

...Здавалася, шукаў я у глыбіні
а апынулася,
што блукаў па паверхні
Бяз сэнсу,
без надзеі,
безь зямлі —
Трухлее ўсё яшчэ да нараджэньня

Ноч адышла за чорны гарызонт.
Ляжыць вакол раскрышаная цэгла
І дзесь удалечыні трымціць мяжа
Скрозь вечнасьцю разбураныя сьцены

Браніслаў Пяткевіч

УДАВА

Аўдавела наша ніва,
Зарасла уся травой.
Працаваў хто тут руплівы,
Колісь трапіў пад канвой.
Завязьлі ўсіх у Расею
Камуністы-павукі,
Там ня косяць і ня сеюць
Доля з граніт нае мукі.
Тут залезьлі у іх хаты
Батракі і бедякі
І ніхто ня стаў багатым
Бо ім праца не з рукі.
Абібок-алкаш бедалага
Пасяліўся ў жыцьцё.
Летам глотку рэжа смага,
Сьцюжай з голаду жыцьцё
Бо саўгасы й калгасы
Падымалі агульны плён
На дзяржаўныя запасы
Тут аставілі праклён.
Той, хто крыху працавіты,
То для нівы ўдавы
Атрымаў папоркі-квіты,
Валачэцца ледзь жывы
Пракарміць сябе, сямейку —
Трэба красьці, мець даўгі.
А прыблуднікі капейку —
У карчомку ад тугі.
Там на поўначы ў Сібіры
Косьці сёе беларус.
Тут старшыні, брыгадзіры
Учыняюць землятрус.
І прыціхшая змарнела
Наша ніва-удава.
Не аздобленае цела
бяз думак галава.

Руслан Равяка

ДЗЬВЕ КАРТКІ

ПАЗЫТЫЎ

Чорнае неба й белае сонца
Сонца ня грэе, ды сьвеціць самому сабе свайму прывіду.
Неба ня толькі над галовамі, але паўсюдна
Яно спусьцілася да зямлі і захапіла прастору,
дзе некалі панаваў чалавек
Людзі захварэлі. Захварэлі цемраю
Вочы хворыя на чэрнь.
Пачуцьці хворыя на чэрнь.
Адчуваньні хворыя на чэрнь.
Памяць хворая на чэрнь (склероз)
Душы хворыя на ....

НЭГАТЫЎ

Белае неба й чорнае сонца.
Сонца грэе, але ня сьвеціць.
Неба ня толькі над табою, але и абапал цябе.
Яно падобнае да гібрыду тумана
з крышталёвай празрыстасьцю
Людзі захварэлі беласьцю.
Вочы хворыя на беласьць.
Пачуцьці сталіся белымі.
Адчуваньні хворыя на бель.
Памяць хворая на ідэалізацыю
Душы хворыя на чысьціню

Гандрусь Стрэмка

•

Чорны стогн праляцеў над зямлёю:
Гром грыміць так пякельна, тужліва,
І страшэннасьцю змрочнай сваёю
Праклінае ён век нешчасьлівы

Разьдзірае маланка нябёсы
Гнеўна рве на кавалкі, рашуча
І ліюцца халодныя сьлёзы
Ад таго што нябёсам балюча

Плача неба і падаюць кроплі
Сьлёз сьвятых у зямную пустэчу
Водгук ім не знайсьці, бо засохлі
Усе расткі дабрыні чалавечай

Бог глядзіць з тых нябёс разарваных
На стварэньні, людзьмі што завуцца
І ён бачыць забойцаў старанных
Што так прагна да улады імкнуцца

А на троне сядзіць крывахарны
Злы тыран, сатанінскі нашчадак
Апэтыт да улады празьмерны
Падказаў яму новы парадак

Мудрацоў цемрашалы прэч гоняць
І любоў на крыжы расьпінаюць
І за кратамі праўду няволяць
Зь людзьмі разам што ім замінаюць

На Свабоду надзелі кайданы,
Замяніўшы тыранскаю ласкай
Разгуляліся злыя шайтаны,
Што анёльскай прыкрыліся маскаі

Поклік сэрцаў гарачых згубіўся
Паміж сьценам бруднай няпраўды...
Каб камень размаўляць навучыўся,
Ён аб многім яшчэ расказаў бы.

Толькі нешта маўчыць ён цярпліва
У надзеі, што ўсё добра будзе
Агляд аючыся палахліва,
Ён ляжыць ціха-ціхенька ў брудзе

Выклікае зямлю гром на бітву
Ёй у сэрца маланкі кідае.
Тая ж шэпча старую малітву,
Рукі дрэў да нябёсаў ўздымае

Ды чакае дарма яна сонца
І малітва ёй не дапаможа:
Будзе дождж ліць, халодны, бясконцы
Пакуль Праўда не дапаможа.

У нябыт змрок непагадзь згіне —
Толькі трэба за Шчасьце змагацца.
Трэба з тронаў тыранаў ўсіх скінуць
Трэба Праўдзе на іх ўсталявацца

Тацяна Ульянычава

Сяджу ў сваёй хаце, як у турме
І дрэнна і сумна адной тут мне.
Павінна прабыць я дома два тыдні,
Стагодзьдзямі цягнуцца гэ ыя дні

Сябры завіталі на колькі хвілін,
Паседзелі крыху і зноў я адна.
Паслухала песьні я групы «Палац»
А потым настала ізноў цішыня.

Хутчэй бы самой завітаць да сяброў
Пайсьці паблукаць у калысцы Сноў,
І выбрацца з гэтай хатняй турмы,
Дзе сустракаць я павінна была
Цемру адна.

А.Шадрын

АПОШНЯЕ ЖАДАНЬНЕ

Пахавайце мяне, мае родныя,
У мясьціне — цудоўнай, як сон,
Каб мы стрэліся потым — свабодныя
У краіне, дзе царствуе — Ён.

Пахавайце мяне, каб у бязьмежнасьці
Я спакой назаўсёды знайшоў,
Ад зямнога, ў сваёй незалежнасьці
Я грувасткіх пазбавіўся слоў.

Пахавайце, бяз плачу дарэмнага
Зразумейце, мне лепей у труне,
Бо, нарэшце, я ўцёк ад нікчэмнага
Існаваньня, — насустрач вясьне.

Вы мяне ва ўлоньне да Вечнасьці
Адпусьціце, без скрухі, бязь сьлёз,
Пахавайце, бо ў пошук спрадвечнасьці
Шчыра імкнуся я, з Ласкі Нябёс.

Алена Шарэпа-Лапіцкая

•

Утаплю ў мора глыбокай пучыне
Усё, што пісаў Ты прыгожай дзяўчыне,
Усю хлусьню, усе Твае прывітаньні
І фальшывыя словы каханьня...

І тады словы песьні звонкай, шчасьлівай
Панясуць Чайкі пад неба чародкай крыклівай...
А лісты твае ўхопяць буйныя ветры
І ўтопяць іх у мора глыбокіх нетрах

Каб не засталося па Табе аніякіх успамінаў
Непаўторных
Зыбучых,
Як мора хвілінаў...

Сымон Шаўцоў

НЕ ЗАБУДУ

Не забуду цябе, мой родны Менск
Дзе б ні быў я:
Ці буду ў Маскве
Ці буду ў Сыднэі
Ці буду ў Парыжы
Менск да майго сэрца
Заўжды блізкі.
Рэспублікі Беларусі сталіца
Цябе мне не забыцца.
Мне кожную ноч ён сьніцца.
Сьніцца сьпеў з тэатра оперы балета
Як зімой, так і летам.
Я чую плач у песьнях гэтых.
Я чую й плач з парку Купалы
Дзе манумэнт яго на п'едэстале
Часамі сьніцца Янка Купала
Разам зь Якубам Коласам
Яны сьпявалі адным голасам
З памяці сваёй не змагу сьцерці
Сталіцы Беларусі Менска
І гэтых волатаў
Да самае сваёй сьмерці

ЭПІКОН

Алесь Белы

ХВАРОБА

Як заўсёды. Нечакана подла. Зьявілася. Паклала мяне ў ложак і накрыла нейкай ромбападобнай коўдрай. Стала каля і сьмяецца. Пхае ў мяне нешта, рэжа на кавалкі, шукаючы нешта ўнутры мяне. Хоча адкруціць галаву, але яна моцна прывінчаная.

Нясмачна. Так заўсёды бывае пры ёй. Яна не дае адчуць смак. Смак паветра і бруднай вады.

Усё горш. Але яшчэ ня я. Нехта дакучліва стукаецца мне ў скронь. Яны прыйшлі па майго суседа, але памыліліся дзьвярыма. Ці проста хочуць нагадаць пра сябе. Але ня хочацца. Хочацца выгнаць іх усіх і ня бачыць іх больш ніколі. Але як бы далёка ты ня зьбег, яны вернуцца...

Суседа ўжо забралі. Ён зараз там, зь імі, пакінуў нам толькі сваю вопратку. Там не патрэбная вопратка. Мы напужаныя, а я яшчэ больш напужаны. Што можа пужаць больш, чым напужанасьць?

Яна, гэтая самая, адвярнулася. Спыніла свой дзікі сьмех, калі ўбачыла нянавісьць у маіх вачах. Самую сапраўдную нянавісьць замест звычайнай пакорлівасьці й маленьня. Яе можна забіць. Сваёй нянавісьцю. Яе можна забіць толькі пачуцьцём, нічым іншым. Яе трэба забіць, іначай яна зробіць зь цябе чучала, наб'е цябе плоскімі цыліндрыкамі едкага колеру. Ты будзеш увесь сьвяціцца і ня вытрымаеш гэтага жахлівага сьвятла. І ты сыдзеш да іх. І да свайго суседа.

Яна хоча зьбегчы, але прымітыўнае пачуцьцё уласнай годнасьці стрымлівае яе. Ніколі яшчэ яе не выстаўлялі. Ніколі яшчэ яна не зьбягала. Але зараз пэўна, прыйдзецца. Хутка й баязьліва, пакінуўшы мяне аднаго. Я дастану зь сябе ўвесь гэты едкі колер і закапаю яго ў садзе.

Я ўсё ж такі тут, а ня там. Я прагнаў яе. Яна зьбегла. Але хутка яна вернецца і зь ёю будуць яны.

Вольга Колас

УГЛЯДАЮСЯ Ў НЕБА...

*

Начное неба. Начное балота, дзе раскрыліся бліскучыя вяночкі цудоўных лілеяў зь вялікімі вачыма. Поўня, на твары якой ляжыць пячатка вечнай задумёнасьці, акаймаваная жоўтым зіхоткім кругам. Навокал – цёмна. Я гляджу на поўню, і яе халаднавае сьвятло пранікае праз мае вочы ў мяне. Бясслоўная размова.

**

Цяжка ўявіць, што неба – гэта блакітная пустэча, якая не зьяўляецца для нашай плянэты дахам. Мы адкрытыя магутнаму сусьвету. Калі б у нас была магчымасьць лятаць, мы б адарваліся ад зямлі, падняліся да аблокаў, уляцелі б у чорную цемру і маглі б там лётаць бясконца, пакідаючы за сабой зоркі, плянэты, галяктыкі. Кожны знайшоў бы месца для сябе, для роздуму. Можа там бы і застаўся жыць. Магчыма, ён шукаў бы там прытулак ад зямных праблем, праводзіў у Сусьвеце свой адпачынак, быў гаспадаром сваёй зоркі, хадзіў у госьці да суседзяў. Калі б для некага не было месца на Зямлі, ён бы ўтульна пачуваўся там, уверсе ці ўнізе, на захадзе ці на ўсходзе ад нашай Радзімы. Была б вялікая свабода дзеяньняў. Але наўрад ці калі мы перастанем быць жыхарамі плянэты Зямля і зможам зьнікнуць у блакіце.

*

Чалавек ня будзе адзінокім. Дзе б ён ні знаходзіўся, зь ім заўсёды будзе неба. Дастаткова падняць вочы, каб убачыць вернага сябра.

**

Па-мойму, патрэбна ставіць сябе побач зь вялікім сусьветам маленечкай зоркай на небасхіле, што сьвеціцца, пакуль ты жывы, адчуваць сябе часткай вялікай магутнасьці і рабіць намаганьні, каб пакінуць добры сьлед на адной з дарог бязьмежжа.

***

Вельмі выразна бачу чароды сьветлых зорак у чорнай галяктыцы. Побач з адной зь іх – сьлед чалавечай нагі.

***

Уначы неба ператвараецца ў высокі касьцел. Запальваюцца сьвечкі – зоркі ў чорным бязьмежжы. Нябачныя сьвятары – анёлы чытаюць малітвы. Урачыста грае арган. Мы схіляем калені, скрыжоўваем рукі і застываем у здранцьвеньні...

Сяргей Конан

СУСТРЭЧА

Ішоў Ён па вуліцы, чысты як само жыцьцё, белы як зіма. Крочыў, не зьвяртаючы ні на што ўвагі, толькі ўглядаўся ў твары мінакоў. Ішоў і не знаходзіў патрэбнае, у кожным твары нечага не хапала: то думкі, то сьвятла, то нечага яшчэ. А ня будзеш жа кранаць такіх, яны не зразумеюць і пройдуць міма, яшчэ й пасьміяюцца, а то й спалохаюцца. Але Ён настойліва крочыў па шырокіх і вузкіх вулках, па алеях і праспэктах, шукаючы суразмоўцу. Ужо колькі тысяч гадоў Ён ні з кім не гаварыў, прыйшоў час размовы. Душа балела і ныла. Так, і ў Яго ёсьць душа, якая можа балець. Да гэтага дня ўсё было добра, а вось сёньня ўзяло ды зашчаміла.

Калі вы даведаецеся, хто Ён, вы можаце засумнявацца. Падумаеце: «Мана то твая, хлопча». Не, не мана. Ён мне сам сказаў. Ну вось я і прагаварыўся. Добра, Ён сустрэў чалавека, зь якім можна было пагаварыць, гэта быў я.

– Прабачце, можна ў Вас запытацца, ці хочаце Вы пагаварыць аб тым, што ў Вас ёсьць цяпер на душы?

Учора я б усьміхнуўся і пайшоў далей, назаўтра можа б спалохаўся, але сёньня я сказаў:

– Так.

Ён спыніўся, паглядзеў на мяне уважліва і пачаў гаварыць:

– Я стаміўся, хоць не магу стамляцца, адчуваю, хоць гэта немагчыма. У Мяне чалавечыя клопаты, але Я не чалавек.

Вы пачынаеце ня верыць мне. У вас пытаньне. Калі ты не вар'ят, то чаму размаўляў далей з гэтым «не чалавекам». Але я вас папярэджваў, я быў такім у гэты дзень. Бываюць жа ў вас моманты, калі вы стаіце перад вакном глыбокім вечарам. Зоры, ліхтары, і вас цягне няведамая сіла, хочацца растаяць за вакном. Бывае? Хай рэдка, але такі рэдкі дзень быў у мяне сёньня.

– Я гэтаму не дзіўлюся, у кожнага ў сваім «сёньня» можа быць тое, чаго ніколі не было. Я сёньня адчуваю зачараванасьць, але праз тое не лічу сябе нечалавекам.

Мой суразмоўца усьміхнуўся:

– Але Я сапраўды нечалавек. Справа ня ў гэтым. Я ішоў тысячы кілямэтраў, не адчуваючы ні стомы, ні адчаю. Шукаў, часам знаходзіў, але знойдзена было так мала. Зярняты, пасаджаныя тысячы гадоў таму, далі ўсходы. Я думаў, што будзе суцэльная прастора іх, але ёсьць толькі купіны, як на якім балоце, а навокал твань. Яна, можа, і ня злая, але гэта твань без чысьціні, без надзеі, без анічога.

– Але што, што за зярняты былі пасаджаныя?

Зярняты любові, гэтага найпрыгажэйшага пачуцьця. Яны далі ўзыходы, але ня шмат, і зьяўляюцца то там, то тут. Зьяўляюцца і зьнікаюць, і таму мне стала сумна.

– Я ня згодны. Чаму мала? У кожнага у сэрцы есьць зярнятка любові. Праўда, ня кожны і ня кожнаму ствараюць тую атмасфэру, у якой магчымае прабуджэньне. Многія, толькі абудзіўшыся, адразу гібеюць, а каторыя так і застаюцца ссохлымі.

– Ссохлымі. Значыць, высілкі шмат у чым марныя, а як цяжка ізноў сеяць і хадзіць па вулках, гаварыць свае прамовы, абнадзейваць, зачароўваць, потым чуць і не адчуваць кпіны і боль-узнагароду за маю любоў. Я ішоў і іду зь любоўю ня толькі ў словах і сэрцы, а і ў дзеях. Кожны мой крок – гэта толькі любоў да ўсіх і ўсяго. Да добразычліўцаў, да тых, хто лічыць Мяне ворагам. Многія Мяне ўспрынялі, слухалі, запісвалі мае словы, ішлі за Мною да апошняга. І нават пасьля ішлі з маім імем у сэрцы. Але любоў гублялася. Яны верылі Мне, стараліся рабіць, як Я казаў, але любоў зьеў страх. Ён кіраваў ужо імі – не рабі так, не рабі тое, бо будзеш пазбаўлены краіны любові, якой людзі так жадалі і жадаюць зараз. Краіна, дзе ціш і спакой.

А яна ёсьць, гэтая краіна? Можна яе пабачыць, быць там, ці ўсё прыгожае – прыдумка?

– Яна ёсьць. Што ты адчуваеш зараз?

– Я? Цікаўнасьць, спакой, мора любові. Я сеньня люблю ўсіх і ўсё... Сёньня такі дзень.

– Табе патрэбная зараз нейкая цудоўная краіна?

Не.

– Вось бачыш, яна есьць, яна зараз у табе самім. Ня трэба адчуваць страх, адчуваць нейкі боль, біцца галавой аб сьцяну часу. Проста трэба адчуць любоў і не пакідаць яе.

Сьнег, які падаў павольна, закружыўся, пачаў неяк мітусіцца вакол нас.

Я паглядзеў у Ягоныя вочы, упершыню за час нашай размовы, і скамянеў, зачараваны: там быў час, прастора і нешта яшчэ, невядомае, магчыма, нікому. Гэта быў Ён. Перада мною стаяў сам...

Убачыўшы маю ўтрапёнасьць і скамянеласьць, Ён проста сказаў:

– Так, гэта Я. Дзякуй за размову. Я шмат гаварыў, ты слухаў, таму ёсьць над чым падумаць. Толькі зараз Я ня быў Ім, а проста суразмоўцам. І ведаеш, можа ў суцэльнай любові губляецца сам чалавек.

Я стаяў і глядзеў, як Ён ішоў прэч. Раптам павярнуўшыся, кінуў мне:

– Да сустрэчы.

Але я не злавіў ягоных словаў. Яны бразнуліся і пакаціліся па засьнежанай алеі.

Юрась Юркавец

БАРАДА

У майго аднаклясьніка Сярожкі Р. у сёмай клясе нечакана для ўсіх і для яго самога, паверх россыпу прышчоў вырасла барада. Праз сваю безнадзейную сьлепату даўгалыгі аксэлерат Сярожка сядзеў за першаю партай, і настаўнікаў апаноўваў шок, калі, узьняўшы вочы ад кляснага журнала, іх позірк упіраўся ў дрымучую гаспадарскую барадзёху. У свавольстве прыроды ім бачылася нейкае небясьпечнае вальнадумства, праява, так бы мовіць, рэзыстансу, накіраванага супроць усяе школьнае сыстэмы.

Абураныя да глыбіні душы, пэдагогі пачалі крэмзаць дакладныя дырэктрысе. І дырэктрыса, сваім зьяўленьнем гвалтоўна парушыўшы нясьпешную плынь уроку літаратуры, запатрабавала зголіць бунтарскую парасьць. Сярожа пратэставаў юнацкім басам і, разгарнуўшы дзёньнік на правілах паводзінаў вучняў, настойваў, каб яму паказалі пункт, які забараняў бы яму, навучэнцу сярэдняй школы, наведваць заняткі ў барадзе і абавязваў галіцца штораніцы перад урокамі...

Была сабраная пэдрада, Сярожкавых бацькоў тэрмінова выклікалі ў школу. І пад такім магутным напорам Сярожка адступіўся. Назаўтра ён зьявіўся ў клясу ўжо паголены і шляхетна пыхацеў адэкалёнам «Шыпр». Як ня дзіўна, але ён не выглядаў прыгнечаным, наадварот – ягоныя вочы зьзялі пераможным агнём. У адказ на ўсе роспыты ён зацягнуў хлопчыкаў нашае клясы ў прыбіральню і, прыспусьціўшы штаны й майткі, прадэманстраваў нам ніз уласнага жывата... Мы проста ахнулі!.. Маманька родная! Барада нейкім чынам перамясьцілася на жывот!.. Мы, хлапчукі, зь яшчэ голымі падбародзьдзямі й целамі, пазіралі на гэтае відовішча затуманенымі ад прыбалдзеньня вачыма..

І калі на вялікім перапынку у дзьвярах зьявіўся абрыс дырэктрысы, каб засьведчыць паразу супрацiўніка, мы зь Сярожкам па-змоўніцку абмяняліся ўхмылкамі: бунт працягваўся.

Андрэй Задорын "Стара Барысаўскі тракт"

Ірэна Янчанка

БАЛЯДЫ СОНЦУ

Што я есьць? Што ёсьць я?

Грунтоўныя пытаньні.

Адказы ўтрымліваюць сэнс жыцьця. Майго.

Гэтыя адказы – неабходныя і дастатковыя ўмовы для таго, каб знайсьці ўсё астатняе: мэты, шляхі да іх, адносіны да таго і да тых, хто побач, разуменьне Сябе, Людзей, Сьвету...

Мне здаецца, што я вось-вось дацягнуся да іх. Трэба зрабіць толькі адзін крок. Пераступіць далягляд.

Што я ёсьць? Што ёсьць я?

Калі ласка, адкажы мне!

***

Тралейбус падскочыў на выбоіне. Я уключылася у рэчаіснасьць.

«Настрою ніякага... Я ж ведаю людзей. Тады чаму я ізноўку пакутую? Я ж не памылілася і пра ўсё здагадвалася. Усё гэта – мроі...»

Нехта сеў побач. Я адвярнулася ад вакна.

Выдатнае надвор'е, так?

– Не.

Сустрэла просты позірк васільковых сьмяшлівых вачэй. Прыкра й агідна: чаго яшчэ ад мяне трэба?! Я зноў утаропілася ў вакно.

«А сапраўды надвор'е – ня вельмі: хмарна ды брыдка. Адкасьніцеся ўсе ад мяне! Але ж вочы былі неблагія.

– Можна задаць крымінальнае пытаньне?

Задаць – можна.

- Ці не назаве жыцьцярадасная фэя сваё імя?

– Нашто?

– Хацеў ведаць, як зьвяртацца. Я сеньня прачнуўся Міхасём.

– Тады я, пэўна, Вярэнай.

«Ну што ж. Усё адно ён хутка сыдзе. Бо хутка мой прыпынак – апошні... Нешта ў ім ёсьць. Няма звычайнага нахабства. Магчыма, у яго проста добры настрой?!»

– Я ўжо моцна Вам надакучыў?

А якога адказу Вы чакаеце?

Ня ведаю. Проста не хацеў бы.

– Хм, хіба Вам не здаецца.

– Але ж...

– МНЕ не патрэбны псыхааналітык. Тым больш ... такі ёлупень.

– Якая самакрытычнасьць.

– Крыўдна...

Менавіта што?

– Кожны раз чуваць: «Ды пайшоў бы ты...» – у больш менш ветлівай форме.

Я ня гэта мела на ўвазе.

– У Вас прыгожыя зялёныя вочы.

– Якія?! Яны спрадвеку былі шэрым.

«Нішто сабе! У мяне шэра-блакітныя вочы. Калі гэта камплімэнт, то своеасаблівы да недарэчнасьці...»

– Дзе Вы сыходзіце?

– Гэта прынцыпова?

– Але ў Вас цікавая рэакцыя.

– ??

– Ды так. Я – праз два прыпынкі.

«На маім. Ат, «пашанцавала»... Але ж ён сапраўды цікавы...»

– Вы слухаеце музыку?

– Усе слухаюць яе так ці інакш.

– Я маю на ўвазе – інструмэнтальную?

– Так.

– Я жыву у тым доме. Заходзьце да мяне. Паслухаем музыку.

«Вось дык так! І гэта – «няма нахабства». Я памылілася?! Але позірк – шчыры...»

– Гэта цяпер так завецца?

Вярэна, Вы ж разумееце, што глупа мяне баяцца.

– Баяцца?! Сьмешна...

«Ой, хлопча, каму ты гэта кажаш?.. Баяцца, мне?!. Наколькі я разьбіраюся ў людзях, ты, здаецца, нічога. Але гэта варта праверыць...»

***

Вера, табе каву ці гарбату?

– Гарбату.

– Як табе гэтая музыка?

- Вельмі. А што гэта? Цікава и незвычайна.

– «Баляда Сонцу». Мая.

***

– Шчасьліва, Міхась.

– Я хацеў бы пакінуць табе гэтую касэту.

Пакінуць?!

– Праз колькі дзен я зьяжджаю.

– Дзякуй.

І табе дзякуй. Удачы.

«Вось цікава: прысьвячэньне Сонцу. Таксама. Як тады.

***

Неба зацягнута хмарамі,
а я хачу паглядзець у вочы Сонцу.
Гэта вельмі цяжка,
але часам неабходна.
Яно – мой лепшы сябра – саграе
маю цьмяную душу.
Калі Яно доўга не зьяўляецца,
я страшэнна сумую.
«Сонейка маё,» – кажуць адзін аднаму людзі,
калі іх сэрцы перапоўненыя пяшчотаю.
«Радасьць мая,» – кажу я Сонцу,
калі мне цяжка,
і Яно атуляе мяне сваёй любоўю.
З-за хмараў зьявіліся першыя праменьчыкі.
Вітаю Цябе!.

ЭЎРАПЕЙСКАЕ РЭХА ПОЛАЦКАЙ ТРАГЕДЫІ

Працяг са старонкі 6

татах таго ж Мікалая Кнора. У падназьве аўтар дакладна вызначыў тэму свайго твора — «Жаласны плач горада Полацка». Рэальныя полацкія падзеі ён увязаў у рэлігійны кантэкст і старэйшы беларускі горад паўстаў у пэрсаніфікаванай іпастасі, а перажытая ім бяда трактаваная як справядлівая Божая кара за грахі жыхароў.

У даўнім архіве Цюрыха дасюль зьберагаецца рукапісная газэтка, датычная нашай гісторыі — «Пасланьне зь Пётркава ад 3 сакавіка 1563 году пра тое, як справы у Польшчы». У ёй аўтар паведамляе, як «мінулага месяца лютага... жахлівы вораг Маскавіт зь сілай блізу 200 тысячаў чалавек уварваўся у Княства Літоўскае польскага караля Апрача іншых, ён прыцёг з сабою 120 вялізных гарматаў. З жудаснымі забойствамі і пажарамі ён прасунуўся прыкладна на 80 міляў да ракі Вяльлі. Тут ён падышоў да высакароднага горада Полацка і падпарадкаваў яго штурмамі ды вогнекіданьнем. Так, пасьля вялікіх шкодаў ён захапіў горад і замак, дзе жудасным чынам пабіў шмат нашых; многіх ён паланіў, спаліў, утапіў, выслаў і зьдзекаваўся зь іх зусім не па-хрысьціянску. Але апісваць усё гэта было б страшна і складана». І ўсяго на дзень пазьней у Базэлі быў створаны яшчэ адзін рукапісны помнік пра разьню на Дзьвіне, зьбераны таксама ў Цюрыху. Гэта «Новая газэта... пра тое, як барані Божа, вялікі князь маскоўскі з 150 000 чалавек аблажыў Полацак, горад і замак у Літве».

Страшныя весткі пра вайну у Беларусі зь нюрнбэрскіх лісткоў Мікалая Кнора хутка разыходзіліся па Эўропе, тыражаваліся на розных мовах. Па-чэску яны пераказваліся ў надрукаваных у Празе ў 1563 годзе «Навінах грозных, страшных і жаласных...», па-францyску ў выданьні зь Ліёна, па-лацінску у пэрыёдыку з Дуацы Ёсьць інфармацыя быццам існаваў

Гравюра на тытульным аркушы "Дакладнага апісаньня вялікага й магутнага паходу Маскавіта на Полацак" Нюрнбэрг

і мясцовы, беларускі варыянт выданьня гэтых «навінаў»: «Новіны грозные а жалостлівые о нападе княжаті Московского Івана на землю рускую которі то князь паленьем тыранством мордованем мест замков добываньнем веліку і знаменіту шкоду вчыняст... З доданьнем реляцый Его Мілості Гетмана В.К.Л. княжаті Радзівіла о поражцы места Полоцкого 1562». На жаль, сам помнік дасюль ня выяўлены, таму пра беларускія «навіны» нічога пэўнага пакуль ня скажаш

Як бачым беларускія падзеі тады адразу сталі справай эўрапейскай. Полацкая трагедыя амаль імгненна апынуліся ў цэнтры ўвагі цэлай хвалі эўрапейскіх пэрыёдыкаў, геаграфія паходжаньня якіх надзвычай шырокая — ад Любэка да Ліёна. Гэтыя газэты і лісткі сталі важнай крыніцай гістарычнай інфармацыі ня толькі для тых колаў, якім прызначаліся, але і для гістарыёграфаў. Іх сьведчаньні храністы ўключалі ў свае творы, часам нават нічым не дапаўняючы

І вось што прыкметна. Пасьля 1563 году у Эўропе таксама друкаваліся «лятучыя лісткі», прысьвечаныя падзеям у ВКЛ Прыкладам, тую ж кампанію караля і вялікага князя Баторага асьвятляла амаль дваццаць пэрыёдыкаў. Аднак Полацак больш не трапляў у цэнтар увагі такой колькасьці эўрапейскіх выданьняў, як да яго зьнішчэньня, і ўжо больш ніколі яны не называлі яго «вялікім» ды «высакародным» Полацак больш ня ўзьняўся.

Адно маскоўскія пасды пра ўтыненае на Дзьвіне гаварылі «правільна», выдаючы чорнае за белае і цьвердзячы паўсюль «И государь наш как есть государь христианский, взяв вотчину свою мечом над народом милость показал побити не велел и никоторого нападения на них людем своим учинити не дал»

ЖОЎТЫ ПЯСОЧАК

Працяг са старонкі 6

Акрылены афіцыйным прызнаньнем свайго таленту, Фэлікс напісаў яшчэ з тузін падобных вершаў і адчуў сябе запраўскім песьняром пралетарыяту.

Усё ў яго ішло добра, і раптам гэты недарэчны арышт. Пэўна, хтось на яго настукаў данёс за якое неасьцярожна, па п'янцы сказанае слова. У турме сьпярша дапытвалі толькі пра вершы ды размовы у асяродзьдзі паэтаў, а пасьля, мабыць, сьцяміўшы што з таго будзе невялікі набытак, зьвязалі ягоную справу зь дзядзькам Аўтухом — прызнавайся што польскі шпіён! Здаецца, таго ж дамагаліся і ад Аўтуха. І дамагліся. Па сваёй сялянскай дурноце ці можа, не стрываўшы зьдзекаў на допытах, Аўтух падпісаў паказаньні, нібыта Фэлікс Казёл завэрбаваў яго ў агенты дыфэнзывы, каб той хадзіў праз мяжу Трэба было яму вэрбаваць гэтага маласьвядомага аднавяскоўца? І навошта яму патрэбная была тая мяжа? І навошта патрэбна было фальсыфікаваць усё тое органам?

Штурханіна і лясканг колаў знадворку раптам спыніліся, адно ледзь чутна гудзеў матор Паньылы голас чэкіста абвясьціў

— Ну што? Селі?

— Селі на дзіфер, — сказаў Шастак

Фэлікс Гром далікатна пастукаў у дзьверы

— Можа, і я памагу? Усё ж учатырох...

Адтуль, знадворку, ніхто не адказаў але дзьверы бразнуўшы, расчыніліся.

— Ану давай усе! Усе вылазь маць вашу за нагу І піхаць! Дружна, усе разам! — закамандаваў памочнік камэнданта з папускной, аднак, злосьцю.

Менавіта такая яго злосьць не палохала і не абражала. І Фэлікс падумаў што, можа, гэты чэкіст і не такі ўжо благі чалавек. За два месяцы турмы, допытаў і катаваньняў ён натрываўся рознага і ўжо думаў, што сярод іх няма ніводнага людзкага чалавека, адныя зьвяры. А так хацелася хоць пры канцы сустрэць чалавека з дабрынёй у душы, які б паставіўся да небаракі калі не з разуменьнем, дык хоць з маленькаю да яго спагадай Усё ж ён быў чалавек. Хоць і паэт. І вораг, прысуджаны да вышэйшай меры пакараньня

Фэлікс Гром скочыў у цемру адразу ледзьве не да каленяў трапіўшы ў каламутную багну дарогі. Аднак астатнія двое за ім не пасьпяшаліся, і памкамэнданта Косьцікаў зноў перайшоў на свой звыклы, зьедлівы крык

— Ну вы! Доўга чакаць маць вашу растак!

— А скульля табе! — пачулася з буды, — гэта спакойна азваўся грабежнік Зайкоўскі — Я прыгавораны, мне не паложана штурхаць машыну.

— Як гэта — не паложана? — апешыў Косьцікаў

— А так! Крымінальны кодэкс РСФСР стацьця сто дваццаць сем прым. Чытаў?

Азадачаны Косьцікаў на хвіліну змоўчаў шырока расставіўшы ля буды ногі, каб ня ўлезьці у самае глыбокае месца. Цяжка сапучы ад перастомы, маўчалі іншыя. Фэлікс Гром ямчэй прыладжваўся ў лужыне, каб спрытней было папіхаць з твані Нарэшце Сурвіла сказаў:

— Ды залівае ён! Ніякай пра гэта стацьці няма

— Хай і няма. Усё роўна ня выйду Хоць задавіцеся! Прысудзілі расстраляць, дык будзьце любезныя даставіць у цэласьці і сахраннасьці да месца казьні. Панятна?

— Зараз я табе пакажу месца казьні! — ускіпеў Косьцікаў і дастаў з кабуры пісталет. — Будзеш у мяне ў гразі валяцца, як дохлы пёс, бандыцкая твая морда! — страшна пагражаў ён. Аднак да дзьвярэй ня лез — усё баяўся трапіць у глыбокае месца багны

— А што табе начальства скажа? — чулася з машыны. — Вёз — не давёз...

Падобна, становішча ўскладнялася Аддзелены шырокаю лужынай, Зайкоўскі пакуль заставаўся недасяжны.

— Ну падла ты ў мяне дачакаесься! Я на цябе абоймы не пашкадую Пасьледавацельна!

— Давай, дуй! Пасьледавацельна...

Апошнія словы Зайкоўскага Косьцікаў пакінуў, аднак, без увагі — яго турбавала іншае. Ён моўчкі агледзеў у цемры змакрэлыя постаці асуджаных нібы палічыў іх

— А там буржуй гэты, — падказаў Шастак

— Белагвардзеец — удакладніў Косьцікаў. — Ану вылазь, гражданін Валяр'янаў! Ваша сранае блага родзьдзя!

З буды паказалася лысая, бяз шапкі галава Валяр'янава, які сьпярша сеў на парог, пашукаў, на што абаперціся нагамі, нерашуча перабраў побач рукамі.

— Сігай, ня трусь! — падбадзёрыў яго Сурвіла.

Белагвардзеец, аднак, не сігануў, а ухапіўшыся за плячо Аўтуха, грузна апусьціўся ў лужыну.

— Ну — узялі! Раз, два — узялі! — трохі адышоўшыся ўбок, закамандаваў Косьцікаў усё размахваючы пісталетам.

Яны зноў узяліся піхаць Шафёр газаваў рыўкамі, спрабуючы скрануць машыну з глыбока выкапанай коламі ямы А ў зачыненай будзе чуўся прыглушаны, бы здаля, голас пакінутага ў адзіноце Зайкоўскага.

— Піхайце, піхайце! Дружней піхайце, жалкія рабы сацыялізму! Гнюсныя прыслужнікі трацкістаў! Піхайце на сваю пагібель! Шчыруйце за крывавы ЧК! Давайце, дружней! Мацней крэнчэ і вышэ!..

— Ты глядзі! — цяжка соп ля буды Шастак. — Тут кішкі рвеш а ен там абражае Во сачок праклятый!..

— Давайце дужэй, пралетарскае адродзьдзе! То вам зачцецца бальшавіцкаю куляй!

— Замоўкні! Я загадваю замоўкнуць! Буду страляць, — гразіўся Косьцікаў, гупаючы па ўзбочыне ля машыны

Аднак асуджаны Зайкоўскі не сунімаўся і яшчэ крычаў штось — нядобрае і абразьлівае. Тады Сурвіла першы адарваўся ад вугла буды і параіў:

— Ды страляні ты яму ў ягоную глотку! Дакуль слухаць будзем?

— Лічу да трох і выпускаю ўсю абойму!

— Выпускай! Калі казённай машыны ня жалка — неслася з буды.

Аднак не пасьпеў Косьцікаў пачаць свой адлік як матор дужа стрэльнуў выхлапам і заглух. З-пад машыны напасьледак пыхнула сінім дымком зрабілася зусім ціха.

— Што такое? — зьнерухомеў Косьцікаў

— Усё. Бэнзын скончыўся, таварыш памкамэнданта, — глуха азваўся з кабіны шафёр Косьцікаў вылаяўся.

Усе стаялі моўчкі, быццам расчараваныя або ашуканыя чымсьці. Сапраўды, гэтак стараліся, столькі патрацілі высілкаў, і ўсё марна І зноў прыйдзецца пачынаць спачатку.

— Так! — пасьля нядоўгай маўклівай паўзы вызначыў Косьцікаў. — Шафёр давай дуй у гараж Хай прысылаюць бэнзыну.

— Хай Чысьцякову скажа, — параіў Сурвіла — Чысьцякоў у курсе. Пад'едзе.

— І далажы дзяжурнаму — удакладніў памкамэнданта. — Давай, дуй! Хутка!

Малады баец-шафёр зморана патрухаў па дарозе у горад. Асуджаныя паволі выбраліся з гразі на сушэйшую ўзбочыну. Усе чакалі, што далей закамандуе іхны начальнік. Той аднаруч расшпіліў шынэлак, з другой рукі не выпускаючы пісталета.

— Так! Думаеце цяпер пашабашыць? Чорта з два! Ану бярыцеся! Зноў штурхаць будзем.

Ня надта ахвотна ўсе зноў паўлязалі ў багну і зноў уперліся рукамі ў запэцканы гразёй зад машыны — Сурвіла і Шастак — па вуглах, Аўтух і Фэлікс побач Валяр'янаву дасталося самае гіблае месца — пасярэдзіне. Машына грунтоўна асталявалася на самай глыбіні лужыны, і здавалася, вось-вось паплыве па ёй. Ды не плыла, нават ня краталася зь месца. Косьцікаў, размахваючы пісталетам, зноў пачаў дырыжыраваць з узбочыны а яны, месячы нагамі багну, піхалі і піхалі.

Аднак зноў усё было марна. Машына асела зусім нізка, і, падобна, ніякая сіла не магла яе вывалачы з дарожнае прорвы. Праз нейкі час уладны голас памкамэнданта заглух, і яны расслабілі рукі.

— Так ня пойдзе! — з гарыччу загаманіў Шастак. — Калі піхаць, дык трэба ўсім піхаць. А то як у брыгадзе — адзін укалвае а другі адлыньвае.

— Хто гэта адлыньвае? — насьцярожыўся Сурвіла

Працяг на старонцы 12

ДЗЬВЕ ЗОРКІ

Да сьмерці Аляксандра Кішчанкі і дзясятых угодкаў сьмерці Эндзі Ўорхала

Яны нарадзіліся у розных краінах і ў розных абставінах Андрэй Варгола нарадзіўся ў 1928 годзе ў амэрыканскім Піцбургу. Ягоныя бацькі, праўда родам з русінскае горнае вёскі Мікова, што ў Славакіі, на сумежжы Ўкраіны і Польшчы Бацька дванаццаць гадоў працаваў у Штатах перад тым, як выклікаць жонку з роднае вёскі ў вольны сьвет.

Аляксандар Кішчанка нарадзіўся ў вёсцы Белы Калодзеж што ў Варонескай вобласьці, на сумежжы з Украінай, у 1933 годзе. Ягоныя бацькі нікуды не зьяжджалі. Яны былі савецкімі калгасьнікамі.

Андрэй Варгола зь цягам часу перабраўся у багемны квартал Нью-Ёрку, Соха. Тут ён стаў Эндзі Ўорхалам. А Кішчанка перабраўся ў Менск. Праўда, ён застаўся Кішчанкам.

Ўорхал быў паўальбіносам, пакутаваў на хваробу Паркінсана. Праз гарманальныя праблемы яшчэ падлеткам ён згубіў валасы. Затое пазьней насіў шыкоўны парык — славутую плацінавую шавялюру. Кішчанка таксама насіў сваю прыкметную шавялюру, праўда, натуральную. З узростам і ў яго валасы набылі плацінавы адліў.

Эндзі Ўорхала называюць першасьвятаром поп-арту Паспаліты амэрыканец гадоў дзесяць таму мог ня ведаць Рэмбранта, але Ўорхала ён ведаў абавязкова. У сукнях у кветачкі намаляваных Эндзі, ходзяць мільёны

жанчын Зробленыя ім партрэты Мэрылін Манро Элвіса Прэсьлі, Леніна і Мао Цзэ Дуна можна сёньня пабачыць у рэстарацыях і кавярнях ад Мэхіка да Вільні. Ягоныя інсталяцыі з кансароўкамі таматнага супу «Кэмпбэл'з» сталі абразом для пастіндустрыйнага сьвету Ён здымаў фільмы, рабіў сцэнічны імідж і вокладкі альбомаў для «Ролінг Стоўнз», быў мэнэджэрам рок-гурта «Вэлвэт Андэграўнд». Ягоныя падзелкі ў выглядзе амэрыканскіх зорачак, сьцягоў арлоў, джынсаў, «Кока-Колы», можна было пабачыць у вітрынах крамаў. Як напісалі пазьней, ён зрабіў амэрыканскую мару трывіяльнай.

Навязьлівасьць славы Ўорхала стала настолькі адыёзнай, што ён заслужыў тэрарыстычнага замаху. Паталягічная фэміністка Саланас, якая засадзіла у яго колькі куляў матывавала гэта тым што Ўорхал эксплюатуе сьвет. Ягоны ўласны твар ператварыўся ў гэткі ж самы сымбаль, што і партрэты суперзорак, якія ён рабіў за шалёныя грошы для музэяў і прыватных калекцыяў Вяршынята ягонага снабізму стаў лэнч у парыскай рэстарацыі «Рыц» разам з Сальвадорам Далі і Джонам Ленанам...

З кім мог папалуднаваць Кішчанка? Пэўна ж з Савіцкім і, бадай, з Вуячычам. Можа дзе-небудзь у Кіеве, на днях культуры БССР На яго ніхто не рабіў ніякіх замахаў. Хоць недабразычліўцаў у яго хапала. Ягоная слава ў БССР таксама пераходзіла ўсялякія межы савецкага ўяўленьня. Росьпісы санаторыя «Беларусь» у Крыме, гіганцкія мазаікі на Юбілейнай плошчы і на гатэлі «Беларусь» у Менску, велізарныя, у 10 павярхаў, пано на дамах у мікрараёне «Ўсход-1». Сотні жывапісных працаў адметнага, пазнавальнага «аплікатыўнага» стылю, вывешаных у розных музэях СССР і растыражаваных у маскоўскіх і менскіх альбомах.

Зусім асобнае гутаркі заслугоўваюць габэлены Кішчанкі. Пры ім габэлен стаў часткаю ідэалягічнага будаўніцтва ў БССР. Вядома, тое што габэлены рабіў сам мастак трэба успрымаць умоўна. Яны ткаліся дзясяткамі майстрых на габэленавай фабрыцы. Але які размах! Габэлены для ЦК КПБ для тэатраў Менска і Віцебска, для пасольстваў, для гатэльных холаў, аграмадны габэлен-запавеса для тэатра Музычнае камэдыі... Але асобная старонка ў творчасьці Кішчанкі адкрылася зь незалежнасьцю Беларусі. Ягоны габэлен «Чарнобыль» пабачыў Нью-Ёрк. Шкада, Уорхал не дажыў. Яны маглі б сустрэцца. Чужаніца-бунтар, які сваім эпатажам скарыў бамонд авангарду, і савецкі прагматык-канфарміст які ўсё жыцьцё абслугоўваў дзяржаву. Гэты габэлен і дасёньня вісіць у ААН

Самай вялікай кропкаю (15 на 19 мэтраў) у творчасьці Кішчанкі стаў габэлен «Дваццатае стагодзьдзе». У гіганцкай мандорле, як у павелічальным шкле, сабраныя дзеячы БНР і БССР беларускія і ня толькі, дзеячы культуры, навукі, выбітныя асобы палітыкі і царквы. Па-над імі лунае Хрыстос Пантакратар справа ад якога прымасьціўся Лукашэнка ў німбе. Нашто спатрэбіўся гэты вобраз? Рэч у тым, што працу над габэленам мастак пачаў яшчэ ў 1991 годзе. Гэтак зьявіліся на ім браты Луцкевічы Ластоўскі, Ігнатоўскі... Які лёс мог напаткаць гэты твор пры новым рэжыме?.. Гэтак і зьявіўся Лукашэнка. У самым версе, дзе яго на вышыні 20 мэтраў разгледзіш хіба што ў бінокаль.

Натуральна, Кішчанка разьлічваў, як і ўсё сваё жыцьцё, на салідны ганарар. Бо месца для габэлена ўжо было перадвызначана ў будучым Палацы Рэспублікі І нават Лукашэнка паглядзеў, «адобрыў» Але ў дзяржавы не знайшлося грошай на выкуп гэтага твора...

Як і Ўорхал, які памер зьнянацку ад няўдалае апэрацыі на жоўцевым пухіры Кішчанка таксама памёр заўчасна, ад раку.

Прыхільнікі Ўорхала засталіся расчараваныя спадчынай, якую пакінуў іхны кумір: цынічныя скандальныя «Дзёньнікі Ўорхала» і куча хлуду, якім быў завалены ягоны дом (Уорхал штодня рабіў шматлікія і часам абсурдныя пакупкі). Паказны нонканфармізм апынуўся геніяльным камэрцыйным трукам Яшчэ праз дзесяцігодзьдзе ягоную біяграфію бадай, можна будзе хутчэй прачытаць у даведніках шоў-бізнэсу

Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Кішчанка, які ў свой час быў адным з самых заможных людзей краіны, памёр, ледзь зводзячы канцы з канцамі. Сёньня дзяржаўны бюджэт не прадугледжвае расходаў на дзяржаўных мастакоў. Шчыры канфармізм стаўся пасткаю

У вёсачцы Мікова, на радзіме бацькоў Уорхала, дзе яго абагаўляюць, створаны калясальны музэй яго імя у былым Палацы культуры перад якім стаяць двухмэтровыя бэтонныя кансароўкі супу «Кэмпбэл'з». У Нью-Ёрку ж пра «Папу попу» сёньня згадваюць толькі знаўцы.

У райцэнтры Багучар, на радзіме Кішчанкі, у музэі баявое і працоўнае славы, засталася распісаная ім заля і габэлен «Мой родны край»...

А ў Менску «Габэлен стагодзьдзя» ўжо два гады ляжыць у спусьцелай майстэрні Унікальны твор, найбуйнейшы ў сьвеце ў сваім жанры, разам з выяваю Лукашэнкі пакрысе жарэ моль. Што чакае гэты твор варты кнігі Гінэса, заўтра альбо праз якіх пятнаццаць гадоў?

Сяргей Харэўскі



ЖОЎТЫ ПЯСОЧАК

Працяг са старонкі 11

— А то ня бачыце? Во буржуй гэты! Толькі за борт трымаецца.

Валяр'янаў ніякавата сьцепануў плячыма

— Я не трымаюся...

— Ну як жа! Хіба ня бачыў! Яшчэ адпіраецца — не сьціхаў Шастак. — Дзеля прыліку толькі...

— Хто яшчэ бачыў? — насупіўся Косьцікаў. Астатнія, аднак, маўчалі і памкамэнданта пачаў пэрсанальны допыт:

— Аднаасобнік, бачыў?

— Не, не. Нічога ня бачыў

— А ты, паэт?

Фэлікс Гром ніякавата пераступіў у лужыне каламуцячы і без таго скаламучаную твань.

— Ну, можа, і ня дужа... Усё ж чалавек у гадах — няпэўна адказаў ён

— Ага, у гадах! Значыць ня можа? А шкодзіць савецкай уладзе можа? Так я сам прасачу за кожным. Сачка прыстралю без размоваў І кіну пад колы. Тады вылезем.

Фэлікс Гром сам піхаў ледзь, адною рукою, другой ня мог высока ўзяцца — балела ў грудзях І цяпер ён спалохаўся каб таго ня згледзеў пільны Шастак ці нават сам памкамэнданта Косьцікаў. Што яму перашкодзіць тут выканаць сваю пагрозу: прыстрэліць і кіне ў гэтую багну. Ад адное думкі пра тое Фэлікс здрыгануўся і страхавіта зірнуў на цьмяную постаць у шынялі на ўзбочыне.

Яны зноў піхнулі. На гэты раз па камандзе і з усяе сілы у Фэлікса Грома ад болю аж пацямнела ўваччу. Побач, адчуваў ён, нямала высільваецца і белагвардзеец-буржуй Валяр'янаў, — мабыць, таксама пабойваецца чэкіста. Хоць, калі падумаць, чаго ўжо было ім баяцца, куды імкнуцца? Наперад, да свае сьмерці? А можа, справа ў тым, што кожны быў пастаўлены перад просьценькім выбарам, дзе лепей легчы — у пясчаную сухую зямельку ці ў гэтую багну, ад якой у яшчэ жывых да каленяў задубелі ногі. Так можна і прастыць, з ірoніяй вісельніка падумаў паэт Фэлікс Гром. Свой катафалк яны ж самі і штурхалі да месца пахаваньня. Гэта было штосьці новае у спрадвечным абрадзе пахаваньняў Ці адмысловых мэтадаў катаваньня? Во пра што варта было б напісаць верш баляду ці сагу Але не распаўсюджаным ямбам, а каб гекзамэтрам, як Гамэр. Мабыць, Гамэр быў бы самым прыдатным паэтам для гэтай праклятай эпохі...

— Раз, два — узялі!... Ану — рушылі! Яшчэ раз! Яшчэ! — дзікім голасам крычаў побач Косьцікаў — Не адлыньваць! Дужэй! Яшчэ дужэй!...

Разы два ён пальнуў угару зь пісталета, прымусіўшы здрыгануцца іх, спатнелых і ўжо дашчэнту зьнясіленых «Давай! Давай!» І во, дзіва — машына трохі скранулася. Яны, узрадаваныя, паддалі яшчэ болей, напяліся рукамі і нагамі, і яна трохі пасунулася, напаўзла ў твані Тыя, што былі пасярэдзіне — Гром і Валяр'янаў, улезьлі у самую глыб, але не адступіліся, не прыбралі ад буды рук. І ўрэшце ўсе разам выпхнулі перапэцканую гразёй машыну з самага глыбокага месца. Хоць гразка было скрозь па дарозе, але ўшчэнт раскаламучаная лужына засталася ззаду і яны зьнямоглі спыніліся

— Ну во, такую вашу маць! — амаль ласкава вылаяўся памкамэнданта — Што значыць, умелае кіраўніцтва! А то — аслабелі, сілы мала... Прымусіць трэба! Дзесяць мінут перакур! — аб'явіў ён і адышоўся на сушэйшае каля канавы месца.

За ім нерашуча павылязалі з гразі асуджаныя, пакорліва стоўпіліся побач. Чэкіст засунуў пісталет за борт шыняля і вынуў з кішэні пачак «Беламору». Найперш як сябру працягнуў пачак Сурвілу

— Частуйся...

Той гразкімі пальцамі ашчадна дастаў з пачка адну папяросу, зважліва прыкурыў ад падстаўленай у прыгоршчах запалкі Над дарогай паплыў араматны тытунёвы дымок

— За ўдарную работу па ліквідацыі ЧП пры выкананьні заданьня аб'яўляю благадарнасьць — з фальшывай урачыстасьцю аб'явіў Косьцікаў

Асуджаныя нібы страпянуліся на дарозе ад тых даўно сьцёртых з памяці словаў, адчуўшы у іх пранізьлівы водгук назаўжды адрэзанага ад іх жыцьця Тут і цяпер яны зразумелі тое як жарт але й жарт быў адзнакай жыцьця, недасяжнасьцю якога нібы дражніў іх гэты незразумелы чэкіст, чым рабіў ім яшчэ больш балюча.

Адзін толькі Шастак здаецца гатовы быў усур'ёз прыняць сказанае.

— Дзякуй, таварыш Грамадзянін начальнік Каб гэта залічылася...

— Залічыцца, залічыцца — няпэўна паабяцаў пэмкамэнданта

— На тым сьвеце — ухмыльнуўся Сурвіла.

— Чаму на тым? — не пагадзіўся ягоны калега. — І на гэтым Я вам прадастаўлю самую лепшую ямку. Сухую з жоўтым пясочкам... Ня горш, чым ударнікам сацыялістычнага спаборніцтва

Было не зразумець казаў ён тое сур'ёзна ці хітравата зьдзекаваўся зь іх у ранішнім прыцемку быў кепска відаць выраз ягонага заўжды жвавага маладога твару. Але голас здаўся зусім памяркоўным і добразычлівым і тое міжволі заспакойвала

— Ну але ж во я — невінаваты — ступіў наперад Шастак — Ну праўда. Во той сьледчы таварыш Кутасаў ведае. Я ня шкоднік.

Косьцікаў смачна зацягнуўся папяросай і разважна выпусьціў даўгі струмень дыму

— Ну ведама, невінаваты. Калі б ты быў вінаваты, тябе б на сьледзтве кішкі выматалі. Косьці б пераламалі. Жонку б на тваіх вачах таго... Калі б быў вінаваты А так — спакойна застрэлім на сасновым пагорачку І ўсё. Праўда буржуй? — раптам зьвярнуўся ён да Валяр'янава, які стаяў трошкі збоч ад астатніх.

Падобна, ён хацеў зачапіць Валяр'янава, але той не адказаў на ягонае пытаньне. Ды ён яго й не пачуў гэтага маладога, самаўпэўненага чэкіста. Ён ужо нямала пабачыў іх на сваім вяку, пачынаючы зь дзевятнаццатага году, калі яго расстрэльвалі ў Алушце. Ён думаў пасьля, каб тады расстралялі, дык не было б тых пакут і прыніжэньняў, якія ён перажыў за ўсе наступныя свае гады. Але ў Алушце не расстралялі. Толькі давялі да дыстрафіі і выпусьцілі паміраць самахоць І гэта пратрымаўшы тры тыдні сярод паўсотні былых афіцэраў Добраахвотніцкай арміі ў сырым вінным склепе бязь ежы і вады, не выпускаючы па натуральнай патрэбе Гэтае апошняе дапякала Валяр'янава болей за голад і смагу, ён доўга ня мог прызвычаіцца хадзіць па-большаму і малому на вачах у натоўпу розных чынам і векам людзей і ўжо тады зразумеў нялюдзкую сутнасьць чэкістаў. Яны — нелюдзі, так і трэба было іх разумець калі толькі нармальным розумам магчыма было што зразумець Родны брат Валяр'янава, мілы паручнік Аркадзь Аркадзевіч, так і не зразумеў, мабыць, з кім мае справу — гарачыўся пратэставаў, спрачаўся. І звар'яцеў Прыстрэлілі бы сабаку, і кінулі ў прыдарожны быльнёг. Ён жа вось выжыў галоўным чынам таму што не пратэставаў, ніколі ні з кім не спрачаўся паводзіў сябе ніжэй за траву, цішэй за ваду. Зрэшты, і чаго дачакаўся? Таго ж што і брат. Толькі гадоў на пятнаццаць пазьней Ці варта было ашчаджацца?

Тым часам пачало днець. Абапал дарогі выплыў са змроку восеньскі палявы прасьцяг з пагорачкам звод даль і прыдарожным хмызьняком паблізу. Зьверху то імжыў, то перастаў дробны дождж з поля дзьмуў вільготны заходні вецер. На пагорак бегла гразкая разьезджаная дарога з налітымі дажджом каляінамі Гараджане тут езьдзілі нячаста, а каляіны былі ад машын наркамату ўнутраных справаў, які толькі й карыстаўся той дарогай. Асабліва ноччу. А то, бывала і ўдзень, пад час маскоўскіх праверак, калі ў горадзе тэрмінова разгружаліся турмы.

Тое, што Валяр'янаў ніяк не адрэагаваў на заўвагу не спадабалася Косьцікаву

— Ты буржуй! Да цябе абраччаюцца!

— Я чую — ціха аднымі вуснамі адказаў Валяр'янаў.

— Дзяч маёй дабрыні Хацеў прыстрэліць

— Дзякуй...

— Во! А то не напомніш — не падзякуюць Буржуйская нявыхаванасьць...

— Да сваіх яны дык дужа добра выхаваныя — падхапіў Шастак — Усё: благадару, благадару...

— Да сваіх. Але не да пралетарыяту, — заўважыў Сурвіла. — Пралетары — іхныя ворагі

Вострая Брама

беларускі культурны кантэкст XX ст

Новы супольны праект «Нашай Нівы» і беларускай рэдакцыі Радыё Свабода: рэпартажы, рэфлексіі, гутаркі — кожную нядзелю на зьмененых хвалях Свабоды Кожную сераду — паўтор перадачы

Адсутнасьць кантэксту культуры — гэта адсутнасьць глябальных арыенціраў нацыі. Яна нявечыць нашае жыцьцё і на вялікім і на малым узроўні. Беларусь нібыта сьцьвярджае сябе як незалежная дзяржава, але дзеля чаго гэта робіцца дзеля чаго тая незалежнасьць — разумее ня кожны. Людзі не задумваюцца над тым, што сувэрэнітэт патрэбны для самабытнага існаваньня нацыі, бо менавіта у самабытным існаваньні нацыя найлепшым чынам рэалізуе свой патэнцыял, уладкоўвае жыцьце у адпаведнасьці са сваімі прыроднымі рысамі характару. Калі народ існуе ў культурным кантэксьце, яму не прыходзяць у галаву розныя самаедзкія, дзікунскія ідэі, ён не азлоблены, а прагны да творчасьці і працы

Кожную нядзелю на хвалях Радыё Свабода паводле абноўленага раскладу

RADIO FREE EUROPE
RADIO LIBERTY

Дробязі мініятураў

Ирина Масленицина, Николаи Богодзяж Радзивиллы — несвижские короли. (Исторические миниатюры). — Менск Триоль, 1997

У Польшчы пра Радзівілаў напісана шмат Традыцыю літаратурных аповедаў пра славуты ліцьвінскі род пачынаюць яшчэ у пачатку мінулага стагодзьдзя Ходзька і Жавускі, працягваюць Крашэўскі, Сянкевіч, Васілеўскі. «Навукова-папулярныя» ці «навукова-мастацкія» «гавэнды» якія сталі папулярнымі ў другой палове нашага стагодзьдзя стваралі Мацкевіч, Сайкоўскі, Куховіч — іх кнігі досыць вядомыя і ў Беларусі — ва ўсялякім разе, для некаторых гісторыкаў яны часам ішлі за «крыніцы». Пішуць пра Радзівілаў і ў нас. У папулярным жанры рэй дагэтуль водзяць опусы аўтары якіхператвараюць выхапленыя ў Сыракомлі, Катлубая ці Жавускага зьвесткі ды байкі ў кульгава-рамантычныя «баляды», якія натхняюць ня надта ўніклівых студэнтаў ды экскурсаводаў. Апатэозам гэткай «радзівілаўшчыны» для мяне стаў выпадак, сьведкам якога быў некалькі гадоў таму у аўтобусе які праяжджаў па тады яшчэ «плошчы Леніна», нейкая дзяўчына на запыт свайго хлопца, пэўна госьця «Што гэта за будынак?» (меўся на ўвазе Чырвоны касьцёл) -- шчыра адказала: «Замак Радзівілаў!»

Новы ўнёсак у беларускую «радзівіліяну» зрабілі аўтары «Несвижских королей». Жанр «гістарычных мініятур», зь ня надта акрэсьленай доляй «навуковасьці» і «мастацкасьці», мусіў даць прастору аўтарскаму пяру, ня сьціснутаму жорсткаю рамкай дакумэнта, гістарычнага факту. Расейскамоўнасьць кнігі, напэўна, павінна была адкрыць ёй шырокую аўдыторыю уключаючы й яшчэ не заангажаваных праблемамі беларускай гісторыі й культуры чытачоў Выбраўшы абмежаваны гістарычны пэрыяд для сваіх мініятур — 16 і 17 стагодзьдзі — аўтары пайшлі не зусім трддыцыйным шляхам: абмінулі (ці адклалі на наступны том) прыгоды Пане Каханку і дасягненьні Нясьвіскага тэатру і паказалі буйным пляна нам менш вядомыя ў нас постаці Януша Радзівіла Барадача, Мікалая Чорнага, Сіроткі Крысьціны Эўфіміі. Не абышлося, зразумела і бяз Барбары Радзівілянкі, якую паэтычна пайменавалі «Джульеттой белорусского средневековья» Не зусім зразумела мне толькі, чаму «средневековья», калі на двары быў тады самы разгар беларускага рэнэсансу І як гэта «историю любви которых современники будут сравнивать с историей Ромео и Джульетты», калі «сучасьнікі» нават самыя прагрэсіўныя даведаюцца ад Шэксьпіра пра сумную гісторыю каханьня толькі праз гадоў шэсьцьдзесят Але гэта вядома дробязі Праўда што ні кажы з гэтых дробязяў складаецца цэлая кніга на дзьвесьце зь нечым старонак Напрыклад, вельмі мала верагодна, што Лукас Кранах Малодшы наведваў віленскі двор; а як гучыць фраза аб тым што «Миколай Радзивилл Рыжий и Миколаи Радзивилл Черный вызвали Сигизмунда Августа на мужской разговор» (гэта караля й вялікага князя!). Непавага да мовы, на якой пішацца (тыпова выглядае, напрыклад, такая фраза: «Иван IV в то время не успел еще приобрести славу Синей Бороды, что расправляется со своими женами, как только те ему надоедят») ці зь якой перапісваецца (цытата з «Пэрэгрынацыі» Сіроткі: «снасти рвались, катвага (лодка — Авт.) утонула» — паважанаму Авт. невядома, на жаль, што й па-польску и па-беларуску катвіга, котва — гэта па расейску якорь; далей: «в Далматии в венецианском городе Заре он вместе с местным простором смотрел на стены» — у «Пэрэгрынацыі» маецца на ўвазе прэтар прадстаўнік улады), аказваецца, можа датычыць ня толькі беларушчыны. Наш брат, беларус як бачым і зь іншых прыкладаў, на любой мове аднолькава гаворыць — і за цывілізаваным сьветам упарта ня йдзе.

На жаль, па-за гэткімі дробязямі ад кніжкі застаецца толькі графаманская кампіляцыя з усё тых жа даўно вядомых польскіх папулярызатараў гісторыі з натужнымі намаганьнямі на прыгожую літаратуру. За гэтым канчаткова губляецца ў прынцыпе пахвальная спроба стварыць папулярную і вольную ад забабонаў савецкага часу кніжку пра гісторыю «для народа». А шкада, такія кніжкі патрэбныя.

Вацлаў Арэшка

Умоўная паэзія

Ігар Сідарук Моукнасьць Вершы — Берасьце· Выдавецтва С Лаурова, 1997 — 36 с

Ці ня самае цікавае, што ёсьць у гэтай кнізе — назва Мяркую што Ігар Сідарук можа са мною пагадзіцца

зборнік вершаў назваць... і нічога болей ня ўмець і ня памятаць болей нічога

Што я маю сказаць пра вершы. Яны бляклыя Аўтар у сваёй палітры мае ўсяго дзьве фарбы, наздвычай папулярныя сёньня сярод паэтаў — чорную й белую. Іншым колерам на старонках кнігі не знайшлося месца. Як іх ні мяшай-камбінуй, у выніку ўсё адно атрымаецца тое ці іншае адценьне шэрага Неахайнасьць і выпадковасьць ужываньня тых ці іншых вобразных сродкаў, няўдаласьць ды недарэчнасьць эпітэтаў патыхае звычайнай бязглуздзіцай: «у вадзе / над вадою / лілея — / як ластаўка» або «нехта / растоння абцасам / твой голас» ці «... і такі цяжкі грузавік / як пацалунак у вусны / Юды...» і гэтак далей. Цалкам магчыма, што Ігар Сідарук разглядае гэтыя вершы як «Факт-Мяне». Вольнаму — воля. Але я не псыхіятар, а філёляг Мяне цікавіць выключна тое, што публікуе Ігар Сідарук. Ён публікуе неапрацаваныя чарнавікі.

Піша Ігар Сідарук пра кроў. Кроў, шмат крыві на старонках танюсенькага зборнічка Яна не пужае й ня ўражвае, яна ані цёплая ані стылая, ня мае ані водару ані смаку Кроў, як неабходная паэтычная ўмоўнасьць дэталь, безь якой верш нібыта перастае быць вершам. Як ружы ў паэзіі XIX-га стагодзьдзя, як буры з грымотамі паэтаў маладнякоўскага часу. Такімі ж умоўнымі муляжамі са старонак кніжкі на чытача высыпаюцца «каханьне», «сьмерць», «Багі». І гэтай умоўнасьці зусім не дадаецца сэнсу й цеплыні ад празьмернага ужываньня шматкроп'яў. Вершы набудаваныя на абыгрываньні фразэмаў «добра / там / дзе няма нас...», паводле сваёй прыроды належаць хутчэй да моваэнаўства чым да літаратуры.

Што б там ні было, гэтая кніжка можа служыць яскравай ілюстрацыяй шапыранага сярод маладых (і ня вельмі) зьнічальнікаў паперы забабону, што пісаць «ня ў рыфму» варта хаця б таму, што да цябе не прыстане слава вэрсыфікатара.

Андранік

— Мабыць, мала стралялі, — сказаў Шастак.

— Стралялі ня мала. Але ўсіх яшчэ не перастралялі Усё за віной гналіся. За даказацельствамі і прызнаньнем. Болей паперкі пісалі, — як пра штосьць набалелае з горыччу зазначыў Сурвіла.

— А што пісаць? — зьдзівіўся Шастак. — Хіба адразу не відаць: контра. Во гэты: камізэлька, гамашы, кавэркот

— Можа яшчэ і гальштук завязваў? — прыгожа заўсьміхаўся Косьцікаў.

— Завязваў, — ціха адказаў Валяр'янаў — Як кожны інтэлігентны чалавек...

— Вы паглядзіце: яго арыштоўваюць, а ен завязвае гальштук Хіба павесіцца ў турме

— Каб ухіліцца ад пакараньня — сказаў Сурвіла — Ну, такі нумар у нас ня пройдзе. У нас парадак!

Каб яны задушыліся зь іхнымі парадкамі, — дрыжучы на ветры ад макрэдзі, сярдзіта думаў Аўтух Казёл. З рознымі іх парадкамі ён ужо нямала пазнаўся, і ня толькі у турме. Асабліва апошнія гады, як сталі яго дапінаць за аднаасобніцтва. І было б за што? Хіба ён супраць савецкай улады ці супраць камуністаў? Але ж ён мусіў карміць сям'ю жыць з уласнае працы. А яму кажуць: у калгас. Паглядзеў ён, як тыя разумныя гаспадарылі ў іхным калгасе. Нявыбраная бульбачка гніла ў зямлі да маразоў убранае збожжа прападала нявысушанае ў арцельным гумне. Інвэнтар за два гады разваліўся дашчэнту, не было каму направіць калёсы. Умелыя паўцякалі ў сьвет, разумных перасаджалі, а хто застаўся? Бабы ды нямоглыя дзяды. І ведама, ягонае адаасобніцтва сталася ім бяльмом у воку. Вясной абрэзалі зямлю, пакінулі адно балотную няўдобіцу з хмызьняком. Пойдзеш у калгас? Не, не пайду. Тады абрэзалі пожні, каб не было дзе напасьвіць кароўку Затым пастанавілі ліквідаваць гумно, бо, ці бачыце, будавалі калгасную абору, спатрэбіліся матэрыялы. Асець, пуню і ток — усё перавезьлі ў калгас дзе за зіму тыя бёрны расьцягалі на дровы. Ужо ня стала куды выпусьціць і курэй. Зноў прыехала начальства: ну, пойдзеш у калгас? Сказаў: не пайду, на сваёй зямлі паміраць буду. Дык трактарам перааралі дарогу — ад хутара да бальшака Каб не пратаптаў сьцежку, засеялі вікай. Абмінаў тую віку за вярсту па лесе. Тады сказалі, быццам ён праз лес ходзіць у Польшчу Каб ім да свае магілы гэтак хадзіць, думаў Аўтух

Ужо ўсё абабралі. Абрэзалі па самыя вокны, а тады пачалі зарыцца на ягонага маладога каня. Свае зрабіліся, як дэрбіны — ад бяскорміцы ды непасільнае працы, а ягоны конік быў, як памаляваны Выгадаваны з жарабя ад уласнай кабылкі, ён быў мілы гаспадару, можа, болей, чым жонка, чым нават дарослыя дочкі Бывала, Аўтух возіць з поля снапы і да вечара так уходаецца, што ня мае сілы сесьці за стол І ня дзіва: цэлы дзень на кожнай горцы падстаўляе пад брыку плячо, папіхае, нібы ў парцы, памагае везьці Праўда, і конік нібы разумеў гаспадара, стараўся, выжыльваўся на маладых тонкіх нагах, вёз усё, колькі ні накладзі ў воз. Як было аддаць такога на безуважнае арцельнае карыстаньне, дзе б яго заезьдзілі за адно лета, надарвалі, сапсулі. Дык скралі. Надвячоркам адвёў папасьвіцца на сьвежую атаву спутаў ды не надзеў замок, пашкадаваў натруджаныя за дзень ногі. І скралі. Аўтух адразу ўведаў, хто, зрэшты, пра тое ведала ўся вёска, быў у іх адзін такі злодзей, скраў ён у Аўтуха ня ў першага. Кінуўся Аўтух у міліцыю, у раён, да пракурора. І нічога. Усе ветліва слухалі і нават спачувалі, але шукаць і ня думалі А тое, што ён сам паказваў на злодзея, пад увагу ня бралі. Казалі, патрэбныя доказы а доказаў няма. Але якія яшчэ ім доказы калі ўсім навакол ведама, што гэты Балазей здаўна крадзе коней і збывае цыганам на Палесьсі. Аказваецца, не Трэба доказы. Такі парадак

Там патрэбныя былі адмысловыя доказы, а вось тут можна караць і бяз доказаў Аўтух ніколі й не падумаў хадзіць за мяжу начарта яму трэба была тая Польшча, а яны кажуць хадзіў. Быццам яны яго там злавілі. Ці хоць бы там хто яго бачыў Але напісалі хадзіў, і ўсё. Прызнавайся!

І ён, дурань, прызнаўся паслухаўся гэтага партыйца і падпісаў, што падсунулі. Думаў, тым выгадае. А ня выгадаў — прагадаў дашчэнту Стаўся польскім шпіёнам. Во зрабіў падарунак сабе і дочкам І ўсёй радні На ўсё іх жыцьцё...

— Бальшавіцкі парадак! — згодна пацьвердзіў Шастак — Мыша не праскочыць

— А ты памаўчы! — нечакана абрэзаў яго Косьцікаў. — Ты — здраднік.

— Я? — пабялеў ад крыўды Шастак

— Ты ты, — роўным голасам паўтарыў памкамэнданта — Вось той, — ён кіўнуў у бок Валяр'янава — той ня здраднік, бо ён вораг адкрыты Белы афіцэр і так далей. А ты — і нашым, і вашым.

— Я ня вашым... То есьць, ня нашым! — ад хваляваньня пачаў блытацца Шастак — Я служыў партыі, я бальшавік. Мяне тут гэта. Па ашыбке.

— Ладна — махнуў рукой Косьцікаў. — Разьбяруцца.

Як гэта — разьбяруцца? — ня мог зразумець Шастак. Хто разьбярэцца? І калі разьбяруцца? Што гэта ўсё значыць? Вельмі няпэўныя былі тыя словы чэкіста, але ў сваёй няпэўнасьці яны несьлі нейкі зародак выратоўчай надзеі. А раптам і сапраўды яшчэ ня ўсё страчана? Штосьці яшчэ направіцца? І Шастак, апанураны і адначасна трохі абнадзеены, з зацятай крыўдай у душы адступіўся ўбок Бліжэй да памкамэндната падышоў Сурвіла

— Ты гэта, скажы — ціха, падобна, каб ня чулі іншыя, запытаўся ен — І мяне?

— І цябе, — зірнуў на яго сьветлымі вачыма Косьцікаў Сурвіла зрабіў выгляд, што тое яго надта зьдзівіла.

— Зь імі во — разам? — кіўнуў ён на астатніх

— Ну, гэта Паглядзім, — няпэўна сказаў чэкіст і пусьціў густы струмень дыму у твар былога калегі.

Ад тых словаў Косьцікава ў Сурвілы таксама зьявілася маленькая надзея. Ведама, у яго і ў думках не было што нядаўні калега пашкадуе яго, ня выканае прысуд Ці нават ня так яго выканае. Але, напэўна, ён усё ж мог трохі перайначыць тое выкананьне, зрабіць яго па магчымасьці прыстойным для свайго чалавека-чэкіста Хоць бы і асуджанага. Бо нават аднолькавы прысуд не раўняў яго з гэтымі ворагамі народа, ён і пасьля сьмерці прагнуў застацца салдатам эрміі Дзяржынскага. Хоць натуральна, і ў яго здараліся хібы, часам ён памыляўся часам не хапала адукацыі. Як у тым выпадку з маладой студэнткай, якую яму давялося расстрэльваць. Але тады ён быў малады, а дзяўчына была дужа ўжо слаўная ў сваёй дзяўчачай прыгажосьці — худзенькая такая, спрытная, зь вялікімі зьдзіўленымі вачыма і вабным тварыкам, зірнуўшы на які, Сурвіла не наважыўся стрэліць Ён стрэліў міма. Каб не ў патыліцу, — ля вуха. Яна ўсё роўна звалілася у яму, мабыць, зьнепрытомеўшы ад страху, ды там і асталася, заваленая наступнымі целамі Ніхто таго не заўважыў і не дазнаўся ніколі, але ўсё роўна Сурвіла пачуваўся няквата. Хоць зразумела, тады ён меў невялікі чэкісцкі досьвед і паддаўся на дзявочую прывабнасьць Забыўся, што перад ім найперш выкрыты вораг народа Ды ён памятаў свой ганебны ўчынак і, можа, менавіта таму стараўся. Тое стараньне дало свой плён, і пасьля, ужо ў сьледчым аддзеле, ён паказаў за паўгодзьдзя найлепшыя вынікі — 127 чалавек падведзеных да вышэйшай меры — болей чым у каго-небудзь іншага.

І цяпер вось яго самога...

Не пасьпелі яны аддыхацца, прагнаць трохі стому, як здаля на дарозе з гораду зьявілася машына — зноў вялікая крытая буда, якая, валюхаючыся на калдобінах пад'ехала бліжэй і стала. Зь яе выскачылі трое стралкоў у шынялях, зь вінтоўкамі ў руках і кінуліся да групы асуджаных.

— Адставіць! — спакойна сказаў Косьцікаў. — Усё ў парадку.

Шафёры узяліся пераліваць з бляшанкі бэнзын, а асуджаных Косьцікаў зноў загнаў у буду, дзе іх сустрэў незадаволены быццам нават заспаны, Зайкоўскі

— Не далі й паспаць...

— Насьпісься! — сказаў Сурвіла — Хутка засьнеш вечным сном

— А хрэн зь ім! Чым такая жызьня! — вылаяўся грабежнік і зноў выцягнуўся упоперак буды сваім доўгім целам

Яны зноў няхутка ехалі па гразкай, выбаістай дарозе, за імі нягучна гурчэла другая машына. Усе аднак, адчувалі, што хутка іхны задоўжаны шлях скончыцца Кожны стараўся ня надта думаць пра самы-самы канец, а ўсё роўна думалася. Фэлікс Гром яшчэ ад суда і прыгавору ўсё ўяўляў сабе, як яго будуць расстрэльваць Дакладна тае жахлівае працэдуры ён, натуральна, ня

Працяг на старонцы 14

Адам Глебус

Невялікае пра вялікіх

СЁНАГОН
Сэй-Сёнагон жыла ў асяродзьдзі, вызваленым ад працы, падаткаў, вайны, і знаходзіла безьліч тэмаў, каб пісаць геніяльныя «Занатоўкі каля ўзгалоўя».

ДЖОЙС
Каб ахарактарызаваць адным ёмкім словам постаць Джэймса Джойса, дастаткова сказаць «дублінец». А ён гэтага вельмі не хацеў, ён жадаў называцца Улісэм

ХЭМІНГУЭЙ
Кожны раман, які б вялікі ня быў, можна зьвесьці да аднаго анатацыйнага сказу. Твор «Стары й мора» Эрнэста Хэмінгуэя можна пераказаць так: «Дзед злавіў вялікую рыбіну, а яе зьелі акулы імпэрыялізму»

ЕРАФЕЕЎ
Творы Вэнэдыкта Ерафеева носяць на твары добрасардэчную ўсьмешку поўную кепскіх зубоў.

ШЭКСЬПІР
Уільяму Шэксьпіру даруецца ўсё, навет бяздарная пастаноўка «Рамэа і Джульеты» ў самадзейным тэатры Менскага трактарнага заводу.

БАСЁ
Мацуа Басё жыў у эпоху, якая ня ведала ўспышак фотаапаратаў, а таму аддана верыў у азарэньне.

БУНЮЭЛЬ
Як рэвалюцыйна настроены сюррэаліст Луіс Бунюэль ня мог не сказаць: «Навука — вораг чалавека»

БОРХЕС
Хорхе Луіс Борхес любіў хавацца у блытаніне сапраўднага й выдуманага.

ГОМЭС ДЭ ЛА СЭРНА
З усіх вясёлых гішпанцаў, над чымі старонкамі давялося пасьмяяцца, Рамон Гомэс дэ ла Сэрна самы эксцэнтрычны й найвесялейшы. «Нудысты цудоўныя людзі, — казаў Рамон, — толькі калі доўга пасядзяць, абавязкова прылепяцца да крэслаў»

МІРО
Жуан Міро самы інфантыльны з дадаістаў. У ягоныя семдзесят яму было насамрэч, тры гады. Міро самы кранальны жывапісец XX стагодзьдзя. Яго любіш як дзіця, шчыра і самааддана.

ДАЛІ
Сальвадор Далі марыў быць гішпанскім каралём, а калі не каралём, дык прыдворным жывапісцам, кшталту Вэляскеса ці Гоі, а ў сапраўднасьці Далі быў каралём у мастацкай правінцыі Сюррэалізм, заснаванай Брэтонам.

СУРБАРАН
Францыска Сурбаран намаляваў збанкі, зь якіх вылецелі духі. Яны пакінулі сасуды ў 1640 годзе, а такое ўражаньне, нібы толькі што.

ЭЛЬ ГРЭКА
У творах Талера дэ Даменіка Тэотакапуласа — Эль Грэка — зьзяе выключна месячнае сьвятло, як і ў палотнах Пабла Пікаса. Сонца Гішпаніі занадта зыркае для вачэй жывапісца.

ХЭМІНГУЭЙ
Эрнэст Хэмінгуэй майстар пераўтварэньняў. Зь любога століка ў кавярні ён мог за адно імгненьне зрабіць працоўны пісьмовы стол

ЛЕАНАРДА
Ні кроплі сумневаў, Леанарда да Вінчы — найвялікшы з мастакоў, але гледзячы на ягоныя шэдэўры, не магу пазбыцца ніякаватасьці, бо ўсё намалёвана нязручнай для мяне, левай рукою. Разглядаць творы Леанарда ўсё адно, як чытаць тэкст у люстэрку дзе замест Леанарда да Вінчы — ....

МОЦАРТ
Доўга-доўга выбіраў сваёго аднаго-адзінага кампазытара на ўсе найчарнейшыя і найшчасьлівейшыя выпадкі і выбраў Амадэя Моцарта.

ХІМЭНЭС
Пісаць вершы у сталым веку непрыстойна. Сівы чалавек, які гаворыць рытмізаванымі дый зарыфмаванымі сказамі, выклікае сьмех ці, у лепшым варыянце, спачуваньне. І толькі ў тых выключных выпадках, калі ў паэтычную форму ўкладаецца адметнае сьветаразуменьне, калі вершы піша мудры мастак, я згодны слухаць і чытаць паэзію, не зважаючы на ўзрост аўтара. Да такіх паэтаў належаў Хуан Рамон Хімэнэс

Сальвадор Далі са сваім партрэтам пэндзля Жуана Міро

МАКІЯВЭЛІ
Трактат Ніколы Макіявэлі «Гасудар» не чытаюць дыктатары, да якіх ён адрасаваны. «Гасудара» чытаюць і перачытваюць заўзятыя змагары з тыраніяю й рэальным увасобленым у жыцьцё макіявэлізмам. Так і мусіць быць, бо волат, перамагаючы цмока, сам пераўтвараецца у пачвару, тырана й гасудара.

УАЛЬД
Ірляндзец Аскар Уальд параўнаў ірляндзкае мастацтва з расколатым люстэркам пакаёўкі. Пэўна, у гэтым патрэсканым люстэрку ён і ўбачыў жахлівы твар свайго героя — Дарыяна Грэя

АЛЕША
Юры Алеша змог напісаць пра сябе выдатны радок: «Я быў гімназістам невысокае клясы»

ЧАПЛІН
Кінаблазан Чарлі Чаплін назваў сучаснасьць «стагодзьдзем злачынстваў» Комік, які лепей за ўсіх сыграў ролю Гітлера, меў рацыю, бо ў XX стагодзьдзі маркіз дэ Сад і Захер Мазох прачытваюцца як лірыкі

ДЖОЙС
Раман Джэймса Джойса «Уліс» — праекцыя чалавечага мозгу

ДЭ САД
Ёсьць толькі адзіны, не алгалягнічны варыянт чытаньня прозы Данат'ена Альфонса Франсуа дэ Сада — раскрываць кнігі наўздагад, чытаць хутка й нядоўга.

МАЛЕВІЧ
На знакамітае палатно Казімера Малевіча «Чорны квадрат» нягеглы менскі пэцкуль, які дваццаць гадоў выкладае жывапіс у Беларускай акадэміі мастацтваў, абураўся наступным чынам: «Ну, паехаў я ў Маскву паглядзець на гэты квадрат... Ну паглядзеў... І што? Ён жа крывы!»

ВАН ГОГ
Вінцэнт Ван Гог намаляваў сланечнік, адрэзаў сабе вуха, намаляваў аўтапартрэт з адрэзаным вухам і застрэліўся ў жыцьці. Ва ўсёй трагедыі мяне бянтэжыла адна акалічнасьць: Ван Гог адрэзаў сабе вуха тупой брытвай

ЖОЎТЫ ПЯСОЧАК

Працяг са старонкі 13

ведаў, але з кіно памятаў, як расстрэльвалі парыскіх камунараў. Роўная шарэнга стралкоў, выстаўленыя наперад палкі-вінтоўкі, скіраваныя ў ахвяраў ля цагляной сьцяны. Тыя ў белых кашулях з горда выпнутымі грудзямі. І залп. Лёгкі сіні дымок ад вінтовачных руляў, праклён т'ераўскім катам... Прыгожа! Але дзе тут для іх шарэнга стралкоў? Тры вінтоўкі — тых, з задняй машыны, ды пісталет у начальніка — які ж тут залп? І хто закрычыць праклён? Ужо ён, Фэлікс, ня будзе крычаць нічога — хай яны пагараць усе разам: і каты, і іхныя ахвяры. Увесь час, што ён прабыў у турме і на сьледзтве, ён наракаў на Аутуха і ягоную сялянскую дурноту. А як выявілася цяпер, былі там і горшыя за Аўтуха арыштанты. Хоць бы вось гэты Шастак. У камэры Фэлікс яшчэ размаўляў зь ім, нешта расказваў пра літаратуру. Трэба было! Ды ці Шастак быў там адзін. Добра яшчэ, што зь імі не сядзеў Сурвіла, мабыць, таго трымалі ў асобнай камэры. У чэкістаў і камэры асобныя. Як і ўсё іншае ў іхным жыцьці. Толькі паэт — сярод простага народа, безь якіх дабротаў і прывілеяў. Фэлікс Гром ужо шчыра шкадаваў, што некалі ўлёг у літаратуру вучыўся, — лепш бы застаўся непісьменным. Ягоны малодшы брат скончыў чатыры клясы і рабіў у калгасе. Неяк будзе жыць бяз кніг і безь вершаў. А што яму дало ягонае памкненьне ў літаратуру?

Але ж во і дзядзька Аутух таксама не пісаў вершаў. І наўрад ці калі чытаў іх. І цяпер яны будуць ні не ў адной яме разам.

Так, Аўтух Казёл на тым часе клапаціўся не пра якія там вершы, у яго быў зусім іншы клопат — бульбяны. Вядома, ён разумеў, што ня час было думаць пра тое. Але во думалася. Недзе над лесам застаўся шнурок нявыбранай бульбы, выйшла няўправаўка, як ня стала каня. А той шнурок трэба было выбраць найперш. А то разыдуцца дажджы, залье лагчыну, тады ня ўлезеш на яе і з канём. Ці здагадаецца пра тое жонка? Прападзе бульбачка, а што есьці ўзімку? Хоць цяпер едакоў і меней, але яме нее і работнікаў. Зноў жа скаціна...

Машына цяжка нахілілася ўсёй будай, пасьля задралася ўгару кабінай, збочыла, пераваліла нейкі раўчук і дужа страсянула ўсіх пасажыраў. Зайкоўскі незадаволена падняўся ў змроку і сеў, прысланіўшыся сьпінаю да жалезнай сьцяны. Але, падобна, штосьці адчуў і ня лаяўся. Ды й астатнія адчулі што, мабыць, прыехалі. Дзьверы буды пакуль не расчыняліся, іх не вызвалялі. Там знадворку штось перагаворвалася ахова, хтосьці пабег некага клікаць. Відаць на ўсім там рыхтаваліся.

І во нарэшце дзьверы расчыніліся. Трошкі нахіленая машына стаяла у маладым хвойным ляску

— Выхадзі! Па адным!

Ніхто ў будзе, аднак не скрануўся, усе сьціяліся замерлі і чакалі. Чаго толькі чакалі? Хутка ў дзьвярах паявіўся жвавы, усьмешлівы твар Косьцікава, які найперш брыдка вылаяўся.

— Ты! — упёрся ён позіркам у першага, каго зглядзеў у цёмнай будзе — гэта быў Аўтух. — Выхадзі!

«Чаму я першы? Чаму я першы?» — закрыўдаваў у душы Казёл і нязграбна вываліўся з машыны. Вакол ціха стаялі дрэўцы-сасонкі, і ля іх побач зьнерухомелі поўныя ўвагі маладыя хлопцы-байцы. Непадалёк і крышку ўбаку жаўцеў пясчаны нагорак. Усё было зразумела.

— Ну? Упярод!

Зь незразумелай злосьцю Косьцікаў піхнуў Аўтуха у плячо, той зачапіўся раскіслым ад твані лапцем за траву і ўпаў. Сэрца яго моцна білася ў грудзях, было надта няёмка за свой нехупавы, жабрацкі выгляд, асабліва перад гэтымі чысьцюткімі маладымі хлопцамі ў вайсковым, што цяпер зь нераўнадушнай увагай уставіліся ў яго. Ён таропка ўстаў і апанурана патэпаў да ямы, душачы ў сабе крыўду: чаму мяне першага? Ці я самы найгоршы вораг?..

— Ну, хрысьціся, — сьцішана, без ранейшай злосьці ў голасе сказаў Косьцікаў. Аутух, баючыся не пасьпець, таропка перахрысьціўся па-праваслаўнаму, справа налева. І чакаў.

— На калені!

На беражку ямы ен паслухмяна апусьціўся на калені. Зрушаны лапцямі пясок пасыпаўся ўніз, і ён спалохаўся, што зваліцца туды заўчасна. Але не зваліўся, толькі прыплюшчыў вочы і чакаў.

— Гэта нястрашна, — сказаў ззаду чэкіст і лязгануў затворам пісталета — даслаў першы патрон. Толькі Аўтух зірнуў у прадоньне глыбокай ямы, як стрэлу ўжо не пачуў. Здалося, яма сама кінулася насустрач і назаўжды агарнула яго пясчанай сваёй глыбінёй.

— Так! Адзін есьць! — мовіў памкамэнданта і пайшоў да дзьвярэй машыны. Ягоная праца распачалася, ён рабіў яе звыкла й дакладна, як і кожнага дня.

Зноў у машыне ўсе замерлі, сьціхлі, чакаючы каго ён пакліча наступным. І тады ён згледзеў ці, можа, прыпамятаў Зайкоўскага, які цяпер маўкліва туліўся ля задняй сьцяны буды.

— Ану ты, бандзюга!

Прыгнуўшыся, Зайкоўскі сігануў да дзьвярэй, рашуча скочыў з машыны.

— Рукі назад! Назад рукі!!!

— Куды назад? Во зломана, ня бачыш?

— Я табе зараз і другую зламаю, — тузануў яго за рукаво пінжака Косьцікаў. Зайкоўскі, аднак, ухіліўся.

— Не чапай! Даручана — страляй. А бяз рук!

— Ах ты, бандзюга!

— Я не бандзюга! Я больш палітычны, чым вы разам узятыя!

— Во як?

— Во так!

— Ну пайшлі, — трохі паспакайнелым голасам сказаў Косьцікаў, паказваючы пісталетам у бок ямы. Байцы, што стаялі паблізу, паднялі штыхі. Мабыць такое яны чулі ня кожны дзень.

— Ты гэта во што! — раптам прыпыніўся Зайкоўскі. Спыніўся і Косьцікаў. — Будуць расстрэльваць самога, каб ня ў гэтай яме. Каб нам не сьмярдзеў.

— Ах, ты гаўно! — вызьверыўся Косьцікаў і стрэльнуў Зайкоўскаму ў грудзі — раз, другі, трэці. Той няўклюдна паваліўся на рассыпаны каля ямы пясок. Над яго целам начала расплывацца крывавая чужына

— Будзе мне яшчэ награжаць. Пагражаць мне! — ня мог супакоіцца Косьцікаў.

Зласьлівыя словы расстралянага пэмсьці, аднак зачапілі чэкіста, які трохі пастаяў зь пісталетам, сочачы, як здрыгваецца і выпінаецца ў апошніх канвульсіях вялікае цела бандыта. Адкінутая ўбок здаровая рука яго згрэбла жмут мокрай травы, але ня вырвала. Пальцы паволі расьціліся...

Амаль лагодны сьпярша настрой Косьцікава пачаў прыкметна псавацца. Звыклы працэс прывядзеньня ў выкананьне прысуду яўна парушаўся, і прычынаю таму — гэты маскоўскі бандыт. Са сваімі беларускімі ворагамі Косьцікаў ня меў вялікага клопату, тыя заўсёды былі паслухмяныя і перад ямай паводзілі сябе як авечкі. Турма, доўгія месяцы допытаў, суд ламалі іх канчаткова, і расстрэльваць такіх было нават нудна. Некаторыя, праўда (асабліва зь ліку партыйцаў), перад сьмерцю крычалі: хай жыве Сталін або камунізм ці сусьветная рэвалюцыя, мабыць, хітра разьлічваючы тым на ягоную катаву спагаду. Ён не пярэчыў, хай жывуць, калі каму хочацца, каб жылі, і

Андранік Антанян

На зямлі пульхны
сьнег. Братаў ліст чытаю
« памерла бабця»

Шэрань на траве
Гронкі вінаграду ужо
абдзяўблі птушкі

Пуста у пакоі,
толькі што муха жужжыць
Заўтра Каляды

Адліга. Цяжар
паліто. Скачуць дзеці
цераз калюгі

Раптам прачнуўся
Як ад дотыку маці
Зыходзіць поўня

Па каламутнай
рацэ плыве да мора
сіні балёнік

Глупа. Размову
завёў так, нібы адзін
сон мы прысьнілі.

Дождж бясконцы. І
не чакаю, што вернесься
па свой парасон

Во и вясна Жаунер
прышчаваты на лауцы
хрумкае яблык

Імжа Чорныя
узгоркі. Але сьцежкі ўверх —
пад белым сьнегам

Элізабэт Бадэнтэр

ШТО ТАКОЕ МУЖЧЫНА*

З кнігі «XY Пра мужчынскую сутнасьць»

КАЛІ МУЖЧЫНА БЫЎ ПРОСТА ЧАЛАВЕКАМ

Сучасная французская мова як і раней вызначае адным словам «homme» мужчыну і чалавека ўвогуле Каб пазьбегнуць блытаніны часьцяком даводзіцца ўдаклад няць што мы маем на ўвазе пад гэтым словам Французы, у прынцыпе, толькі працягваюць традыцыю атаесамленьня двух гэтых паняцьцяў: мужчына і чалавек, што бярэ пачатак у Старажытнай Грэцыі. Мужчына (vir) разглядаў сябе як нейкі ўнівэрсальны пачатак (homo), найбольш дасканалага прадстаўніка чалавечага роду, своеасаблівы эталён. Заходняя думка традыцыйна падзялялася між двума рознымі падыходамі да праблемы існаваньня двух полаў: мадэльлю падабенства і мадэльлю супрацьпастаўленьня. Але ў абодвух мадэлях дэкляравалася перавага мужчыны, якая апраўдвае ягонае панаваньне над жанчынай.

Паводле Томаса Лякера, one sex model, ці аднаполавая мадэль, панавала ў заходняй думцы да пачатку XVIII стагодзьдзя і пазьней яна час ад часу знаходзіла сабе прыхільнікаў - у прыватнасьці, нешта падобнае можна знайсьці ў Фройда. Аднак у XIX-XX стагодзьдзях і на сёньняшні час у цэлым пануе мадэль супрацьпастаўленьня полаў.

У чым сутнасьць аднаполавай мадэлі і як пры гэтым можна было казаць пра існаваньне двух полаў? Доўгі час агульнапрызнанай лічылася думка, што жанчына мае тыя ж полавыя органы, што і мужчыны, з той толькі розьніцай, што ў жанчыны яны знаходзяцца ў сярэдзіне цела, а ў мужчыны звонку. Так, Дыдро аж у другой палове XVIII стагодзьдзя пісаў: «У жанчыны тыя ж часткі цела, што і ў мужчыны, а адзінае адрозьненьне заключаецца ў тым, што машонка альбо вісіць звонку, альбо знаходзіцца ўсярэдзіне цела». Тысячагадовае панаваньне гэтай думкі адбілася на мове Яечнік, які зь XIX стагодзьдзя стаўся мэтанімічнай прыкметай жанчыны, атрымаў сваю назву толькі пры канцы XVII стагодзьдзя.

Як заўважае Томас Лякёр, пол ці цела да эпохі Асьветніцтва ўспрымаліся як нешта другаснае, тады як род, які мы разглядаем як катэгорыю культуры — першасная і неабходная дадзенасьць Быць мужчынам ці жанчынай імплікавала перш за ўсё наяўнасьць пэўнага рангу, месца ў грамадзтве культурную ролю а не біялягічную апазыцыю полаў, аднак гэтая мадэль полавага адзінства нарадзіла якасны дуалізм, дзе мужчыну адводзілася галоўная роля. Хоць адрозьненьне полаў лічылася парадкавым а ня сутнасным гэта не перашкаджала мужчыну захоўваць прывілеі свайго становішча Жанчыну мералі на мужчынскі капыл. У параўнаньні з мужчынам, жанчына разглядалася як істота менш дасканалая.

Пад канец XVIII стагодзьдзя навукоўцы пачалі настойваць на карэнным адрозьненьні полаў, грунтуючы свае тэзы на новых адкрыцьцях у галіне біялёгіі. Ад адрозьненьня парадкавага мы прыйшлі да адрозьненьня сутнаснага Так, Жак-Луі Маро ў 1803 годзе вёў спрэчку з Гальенам кажучы, што мужчына і жанчына ня проста адрозьніваюцца, а адрозьніваюцца целам і душой, г.зн., фізычна й маральна. Гэта быў сапраўдны трыюмф скрайняга дымарфізму У адрозьненьне ад папярэдняй мадэлі, цяпер цела выступала як нешта першаснае, а ягоныя культурныя атрыбуты як другасныя Біёлягі заклалі эпістамалягічны падмурак пад падзел сацыяльных роляў мужчыны й жанчыны. Матка і яечнікі, наяўнасьць якіх вызначае жанчыну, замацоўваць за ёй дзетародную функцыю і робяць з жанчыны істоту, цалкам супрацьлеглую мужчыну. Рознаполавасьць абумоўлівае адрозьненьне у лёсах і правах. Мужчына і жанчына існуюць адасоблена, у двух розных сьветах, і сустракаюцца толькі... у момант узнаўленьня сабе падобных. Паколькі яна дорыць жыцьцё, жанчына зьяўляецца паўнапраўнай гаспадыняй у доме, кіруе выхаваньнем дзяцей і ўвасабляе сабой бясспрэчны маральны закон, на якім грунтуецца цнота нораваў. Усё астатняе належыць Мужчыну. Узваліўшы сабе на плечы вытворчасьць, творчасьць і палітыку, ён лічыць сфэру грамадзкіх дачыненьняў сваёй стыхіяй.

Некаторым падалося, што ў гэтай дыхатаміі мужчынскага і жаночага сьветаў увасобіўся ідэал узаемадапаўняльнасьці полаў, гэткі гарант гармоніі паміж імі «роўнасьць у разнастайнасьці», як сказалі б цяпер. Прыхільнікі гэтай мадэлі, а іх у XIX стагодзьдзі іх была пераважная большасьць апэлявалі да таго, што нельга весьці размову пра няроўнасьць мужчыны і жанчыны, бо мужчыну і жанчыну нельга параўноўваць. Розьніца, якая рабіла немагчымым непасрэднае параўнаньне мужчыны з жанчынай, пазбавіла мужчыну ягонага статусу эталёну. Гэты ідэалягічны дыскурс быў вельмі даспадобы мужчынам, паколькі для жанчынаў мужчынская сфэра заставалася забароненай, але за прыгожай ідэалёгіяй хавалася далёка не дэмакратычная рэчаіснасьць. Хоць самі мужчыны і адмаўлялі гэта яны па-ранейшаму заставаліся крытэрам, паводле якога ацэньваліся жанчыны. Ён адзін: зразумелы, адкрыты, знаёмы; яна іншая: чужая і незразумелая. Якую б мадэль асэнсаваньня сутнасьці полаў — падабенства ці адрозьненьня — мы ня бралі, мужчына заўжды паўстае як найдасканалы прадстаўнік чалавечага роду, як нейкі абсалютны пачатак чалавецтва.

Навіна, якой мы заўдзячваем, Women's Studies, а потым і Men's Studies, заключаецца ў адкрытым жаданьні парваць з гэтай адвечнай схемай. Як піша Гары Брод: «Традыцыйны погляд на мужчыну як на стандарт чалавека, насамрэч, як правіла, не дае пабачыць тое, што ўласьціва мужчыну як мужчыну». Майкл Кімэл праліў сьвятло на традыцыйную «нябачнасьць» мужчынскага роду, якая моцна паспрыяла атаясамленьню яго з чалавечым родам увогуле: «Вельмі часта, — піша ён, — мы ўспрымаем чалавека па-за паняцьцем роду, быццам бы ён быў сацыяльным індывідам, дый толькі... быццам бы ягоны асабісты досьвед прадстаўніка таго ці іншага роду ня меў ніякага значэньня». Аўтар гэтага выказваньня прыйшоў да такой высновы пасьля таго, як стаўся сьведкам спрэчкі белай жанчыны і нэгрыцянкі наконт таго, што важнейшае: прыналежнасьць да аднога полу ці расавыя адрозьненьні. Белая сьцьвярджала, што факт прыналежнасьці да аднога полу збліжае іх, нягледзячы на розны колер скуры. Чарнаскурая пярэчыла

ПЕРАКЛАД З ФРАНЦУСКАЙ ЗЬМІЦЕРА ДЗЬМІТРУКА.

*Працяг Пачатак у мінулым нумары

заганяў чарговую кулю у чарговую патыліцу. Ужо ён іх нагледзеўся, розных гэтых патыліц: чорных і рыжых, гладкіх і кучаравых, са срабрыстай сівізною і зусім голых, аблыселых. І ніхто ніколі не абразіў яго, не аблаяў нават, — што значыць, палітычна сьвядомы матэрыял, ня тое што гэты крымінальны прыблуда.

— Выходзьце два адразу! — голасна скамандаваў ён ля машыны — Ты белагвардзеец, і ты сраты паэта! Жыва!

Фэлікс Гром паслухмяна саскочыў з машыны і спыніўся, чакаючы напарніка Валяр'янаў аслабела і нязграбна вылязаў з буды — павярнуўся на жывот, дацягнуўся нагамі да долу. Зьлезшы, нэрвовымі пальцамі пачаў зашпільваць гузікі бобрыкавага паліто. А можа, жонка ўсё ж выжыве, падумаў ён. Нешта ўсё ж значыць яе пралетарскае паходжаньне Дый дзеткі... Хоць і без бацькоў, але ўсё ж лепш, чым нічога. Жыцьцё ёсьць жыцьцё, якое б там ні было...

У расшпіленай тужурцы з загадзя закладзенымі назад рукамі цярпліва чакаў апошніх камандаў Гром. Ён мала што бачыў вакол, вочы яго недарэчна змакрэлі, было страшна крыўдна за сваё да часу загубленае жыцьцё. Загубленае праз нядаўна яшчэ самае для яго сьвятое — паэзію. Будзь яна праклятая! Лепш растрасаць гной у калгасе, не чытаць ніякіх кніжак. Але хто ведаў што ўсё гэтак скончыцца? Вельмі і вельмі шкада. З тым шкадаваньнем у душы ён і пайшоў да жоўтага пясчанага пагорачка, за якім яго чакала нішто.

Байцы ўжо сьцягнулі ў яму супакоенае цела Заикоўскага. Рыхлы пагорачак быў дужа растаптаны іхнымі ботамі, беражок ля ямы стаў больш зручны, пляскаты. Валяр'янаў без напамінку апусьціўся каленямі на краі, тройчы перахрысьціўся і сьціх. Ён быў гатовы прыняць сваю доўгачаканую пагібель. Хацеў памаліцца, ды падумаў, што не пасьпее Фэлікс Гром мясьціўся побач, штось яму замінала. Толькі Валяр'янаў зірнуў уніз і заўважыў, што тут неглыбока, як два пягучныя стрэлы ззаду звалілі абодвух у яму.

У машыне засталіся апошнія — Шастак і Сурвіла і Косьцікаў крыкнуў ад ямы

— Здраднік, выхадзі!

У дзьвярах паказаўся зьбялелы з твару Шастак

— Я што лі?

— Ты, ты! Выхадзі!

— Я ня здраднік. Я ўжо тлумачыў. Гэта ашыбка.

— Якая табе ашыбка! — вызьверыўся Косьцікаў — Усё напісана і падпісана. Шагам марш!

Ушчэнт разгублены, зьбялелы, Шастак саскочыў з машыны і пачаў паспешна сутаргава пазяхаць, агаляючы гнілыя абламаныя зубы

— Але ж, але ж... Мяне нельга страляць Я член партыі!

Такія словы ля ямы памочніку камэнданта Косьцікаву даводзілася чуць нярэдка, асабліва калі прыводзілі групу партыйцаў, і ў Косьцікава ў адказ быў нарыхтаваны выпрабаваны аргумэнт які заўжды дзейнічаў безадмоўна.

— Калі ты член партыі, — закрычаў Косьцікаў, — дык якога ж ты хрэна аказваеш супраціўленьне органам?!

— Я я не аказваю

— Ну дык марш! Марш да ямы! Ці памагчы?

Хістаючыся, бы п'яны, Шастак пабрыў да ямы Але на разварушаным пагорку зноў прыпыніўся

— Няправільна вы

— Усё правільна! — сказаў памкамэнданта і стрэліў яму ў патыліцу Кастлявае цела Шастака спотырчы павалілася ў яму — да тых што туды зваліліся раней.

Калі Косьцікаў вярнуўся да машыны там ужо стаяў, вылезшы зь яе, Сурвіла. Ягоны азызлы твар стаў зусім бурачнага колеру — ад стомы ці нейкіх нутраных пакутаў

— Што і мяне туды? — запытаўся ён, марудлівым позіркам утаропіўшыся ў пясчаны пагорак.

— А куды ж? Асобнай ямы ў мяне няма

— Выкапай.

— Яшчэ чаго не хапала!

— Давай, я сам.

— Капай! — падумаўшы, пагадзіўся Косьцікаў — Усе роўна спазьніліся. Шафёр, нясі рыдлёўку!

Малады шафёр зь пярэдняй машыны прынёс рыдлёўку Сурвіла абедзвюма памацаў тронак агледзеўся навакол

— Дзе? Тут?

— Хоць бы і тут. Давай. Толькі жыва! — сказаў Косьцікаў, не хаваючы, аднак, пісталета.

Сурвіла пачаў капаць — імпэтна, нэрвова, кідаючы ў бакі поўныя рыдлёўкі жвіру Мабыць, усё ж хвалюючыся, ён мала дбаў пра акуратнасьць і, замест простакутніка магілы, распачаў бадай круглую яму. У сасоньніку было не сьцюдзёна, начная імжа ранкам спынілася. Сурвіла хутка ўпрэўся, азызлы твар спатнеў і зрабіўся яшчэ больш чырвоны. На хвіліну прыпыніўшыся, ён зьдзёр з плячэй рудую, абшкрэбаную скуранку, шпурнуў яе пад ногі Косьцікаву.

— На, вазьмі. Нашто прападаць.

Запэцканым у гразі хромавым ботам той гідліва адкінуў скуранку з-пад ног Сурвіла ня стаў упрошваць — ня хоча, ня трэба. Яму таксама ўжо нічога не было патрэбна. Апроч вось гэтай асобнай магілы Тут яму будзе спакайней, чым у агульнай, упокат з ворагамі народа. І ўсё ж яго распірала крыўда змоўчаць якую ён ня меў сілы

— За што? Чэснага работніка органаў! Што я парушыў? Бязьвіннага ворага забіў? Ды іх тысячамі забіваць трэба! Я стараўся! Чатыры гады прэміявалі. За ўдарную работу, да гадавіны Акцябра. І ўсё дарма. Пашкадавалі ворагаў, шпіёнаў, нацдэмаў! І гэта правільна? Не! Гэта і ў органы прабраліся ворагі во гэта што! Яны сярод нас!

— Годзе! — з надрывам загадаў Косьцікаў. — Лепш памаўчы!

— Я маўчаў! Усе лета маўчаў Як і ты! Як і сотні чэкістаў. І во мне за гэта...

— Маўчы і капай! — усё больш злуючыся крыкнуў Косьцікаў.

— Не, ужо скажу. Во і ты... Думаеш, уцалееш? Службаю адкупісься? Не! Прыйдзе і твая чарга..

— Маўчаць!

— Не, ужо скажу! Мы павукі у банцы! Дазнаецца Сталін...

Мабыць, гэта было занадта Непадалёк зь вінтоўкамі напагатове стаялі байцы аховы, поўны трывожнай увагі, чакаў ля машыны маўклівы шафёр. Усе са зьдзіўленьнем утаропіліся ў знаёмага чэкіста, які капаў сабе магілу і гаварыў штось дзіўнаватае. Урэшце Косьцікаў прыўзьняў пісталет, не цэлячы, два разы стрэліў. Выпусьціўшы рыдлёўку, Сурвіла падламіўся ў каленях і бокам асеў на раскапаны дол.

— Дабі ж... — выціснуў зь сябе ледзь чутна

Косьцікаў ступіў на крок бліжэй і стрэліў у галаву. На траву і пясок пырснула шэрымі крупінкамі мазгоў.

— Вазьміце, і туды, да астатніх, — загадаў ён байцам

Закінуўшы за сьпіны даўгія вінтоўкі, тыя ўзялі былога чэкіста за рукі, пацягнулі да ямы Косьцікаў пайшоў у бок да машыны.

Гэтая праклятая ноч дашчэнту вымагала ягоныя сілы. Прыкметна пачала здраджваць вытрымка, як ён ні стараўся паводзіць сябе стрымана Здаецца, нескладаная работа, але штодня адно й тое ж Вязуць і вязуць, нібы баранаў, калі таму будзе канец? Вунь колькі накапана ямаў за вясну і лета. І колькі будзе накапана новых

Косьцікаў акінуў позіркам прагаліну між сасонак на схіле — мабыць, за восень заселяць і яе І проста дзе небудзь тут апынецца й ягоная яма...

У гэтым жыцьці ўсё вельмі проста.

СТО ТВОРАЎ МАСТАЦТВА XX СТАГОДЗЬДЗЯ

МІХАЛ ФІЛІПОВІЧ. БІТВА НА НЯМІЗЕ

Імпрэсіянізм у чыстым выглядзе абмінуў Беларусь, якая на той час заставалася у палоне расейскіх уплываў. Праявы імпрэсіянізму ў мастацтве Расеі (як і Польшчы) былі мінімальныя. Гэта тым больш дзіўна, што нават у недасяжнай Японіі імпрэсіянізм атрымаў свой спэцыфічны працяг, які назвалі «эпохай Мэйдзі». Як запозьнены акорд у часе расейскага «срэбнага веку» прагучаў жывапіс Каровіна, Малявіна, Архіпава. Неўзабаве іх творчыя й чалавечыя лёсы разышліся радыкальна. Але тыя колькі зярнятаў не прапалі...

... Канстанцін Каровін пасьля 17-га году падаўся выкладаць у Вышэйшых мастацка-тэхнічных майстэрнях у Маскве (ВХУТЕМАС). Гэты імпэтны мастак з шырокай і няўрымсьлівай натураю радыкальна ўплываў на густы сваіх вучняў, пераважна простых хлопцаў з правінцыі. Імпрэсіяністычнасьць ягонае ўласнае манеры — свабодны шырокі жывапіс, адкрытыя фарбы, дэкаратыўнасьць, эскізнасьць выкананьня хутка засвойваліся навучэнцамі. Адным з гэткіх вучняў стаў і Міхал Філіповіч...

... Малады Філіповіч прыехаў у Расею ў 1920 годзе, на вучобу. За год зь невялікім, гэты вучань Каровіна прайшоў незвычайную трансфармацыю густаў. Незвычайную у сэнсе радыкалізму й хуткасьці. Прыехаўшы у Маскву прыхільнікам акадэмічнага рэалізму, тутака ён становіцца радыкальным імпрэсіяністам. Як мага больш хуткая перадача сьвежых уражаньняў, мажорны, нічым ня скуты настрой, дзвонкія чыстыя фарбы... На гэтым і сышоўся вучань з настаўнікам. Неўзабаве Каровін зьехаў на Поўдзень Францыі. Філіповіч — у Беларусь...

... Працаздольнасьць і бясконцыя сумневы Філіповіча ўражваюць. Як толькі ён прыехаў на Радзіму, стаў супрэматыстам. Калі ён пазнаёміўся з тэорыямі Малевіча, невядома, але гэта было няцяжка для маладога, прагнага да ідэяў мастака. У Віцебску менавіта тым часам выйшлі асноўныя кнігі Малевіча: «Аб новых сюжэтах у мастацтве», «Бог ня скінуты», «Мастацтва, царква, фабрыка», і вядома, «Супрэматызм».. У верасьні 1921 году сябра Філіповіча, Міхал Станюта, які на пэўны час узначаліў аддзел мастацтва Дзяржпалітасьветы, ладзіць у Менску выставу. Гэтая менская, першая савецкая, выстава мастацтва адзначыла апошнюю прыступку, якая аддзяліла ва Ўсходняй Беларусі дасавецкую традыцыю ад найноўшага мастацтва. На ёй былі прадстаўленыя і сымбалісты і акадэмісты. Філіповіч выставіў «Супрэматызм», «Максымальнае выяўленьне колеру», «Канструкцыю плоскасьцяў»..

... Але яму не хапала сюжэту, зь якім непазьбежна зьвязаны фантазійны рамантызм. Філіповіч у гэтыя гады быў прасякнуты ідэяй стварэньня нацыянальнага беларускага стылю. Супрэматызм, спараджэньне лягічнага аналізу, на тое не надаваўся. Яшчэ да сваёй вучобы у Маскве малады мастак імкнуўся да вывучэньня народнага беларускага мастацтва, у якім сьвядама шукаў крыніцаў для ўласнага творчага мэтаду. Ягоная спадчына ўлучае 10 альбомаў замалёвак тканінаў, разьбы, народных строяў, зробленых за доўгія гады вандровак па Беларусі... Аднак, прайшоўшы пакручастую мастакоўскую эвалюцыю, Філіповіч вельмі далёкі ад фармальнага паўтору прыёмаў народнага мастацтва. Ягоны мэтад — вылучэньне традыцыйных эстэтычных архетыпаў і іх свабоднае сынтэзаваньне дзеля стварэньня ўласных арыгінальных кампазыцыяў...

.. Менск 1921 году ўяўляў сабою гуту плавільню, зь якое мусіла паўстаць ніколі ня бачанае новае беларускае мастацтва. У адрозьненьне ад Віцебска, тут паўставала не пралетарскае мастацтва будучыні, якое мусіла стварыць новага чалавека, а сучаснае мастацтва, якое мусіла стварыць беларуса. У майстэрнях «Выяўленчае мастацтва», створаных Галоўналітасьветаю, была наладжаная вытворчасьць плякатаў, кніжак, партрэтаў і нават цацак. Галоўным чынам, тут тварыла моладзь. У адрозьненьне ад Віцебска, які яшчэ быў у РСФСР, гэта была беларуская моладзь: Гуткоўскі, Станюта, Дваракоўскі, Тычына, Кудрэвіч і Філіповіч. Праблемаў з нацыянальным самавызначэньнем у іх ужо не было, роўна ж як і з вызначэньнем сваіх творчых пазыцыяў — стваралі Беларусь. У гэтым жа годзе Філіповіч адкрывае сваю майстэрню пад даўгаватаю назвай «Свабодная акадэмія М.М Філіповіча». Гэтая «акадэмія» стала цэнтрам нацыянальнага беларускага мастацтва, клюбам, дзе мастакамі па-свойму выпрацоўваўся лёс Бацькаўшчыны.

... Недзе у гэтыя гады Філіповіч піша невялікую (77,5x92,5) працу «Казка», у якой ягоны сынтэзаваны мэтад знайшоў яскравае увасабленьне. Сярод фантастычнага краявіду йдзе двубой двух вершнікаў-хімэраў. Хто зь іх пазытыўны пэрсанаж? Ніхто. Адзін — азіят у рагастай шапцы, у паласатым каптане, увесь жоўта-зялёны. Другі — сіне-чырвоны, закуты ў некае жалезьзе, бадай, паўэўрапеец у біблейскай мітры. Б'юцца люта, страшна, топчуць чырвоны дыск, што ніяк з-пад іх ня ўздымецца. Углядзься праз твань, праз цемру, хто б'ецца за тваю зямлю, хто не дае ўстаць сонцу. Пачвары з Усходу і з Захаду. А ты толькі будзеш вызіраць са свайго балота? Няхітрая прыпавесьць, мудрагеліста зашыфраваная пад «казку».

У каляровай гаме, гэткай наўмысна шалёнай у пярэстым карагодзе пісягоў, ёсьць свая непахісная лёгіка. Дастаткова прыгадаць росьпісы на вясковых куфрах, альбо лепей, на дыванах. Чорнае, альбо брунатнае тло, па якім каляровае напружаньне нарастае ад зялёнага хрому і блакітных плямінаў па краёх да чырвона-зялёнага ўдару пасярэдзіне — шыпшына, мак ці ружа.. Узыход сонца над зялёнай зямлёю. Як у Дубоўкі: «О, Беларусь, мая шыпшына...»

... Гэткае канкрэтна-мастацкае мысьленьне Філіповіча катэгорыямі народнае эстэтыкі прачыніла беларускаму мастацтву шлях да яшчэ неасэнсаваных крыніцаў нацыянальнае мэнтальнасьці, да першасных уяўленьняў пра хараство. Я маю на ўвазе не сакральную сэмантыку арнамэнтаў і народнага строю, якія зь цяжкасьцю паддаюцца тлумачэньням нават саміх штукароў, якія іх вырабляюць. Я маю на ўвазе пазьнейшы, індывідуалістычны пляст народнага мастацтва, які адлюстроўвае не касмаганічныя ўяўленьні продкаў, а падсьведамы архетып прыгожага, памкненьне да спакусы. У хрысьціянскай сэмантыцы чырвоны і зялёны колер амбівалентныя: зялёны — сымбаль ня толькі жыцьця адвечнага, але й пярэваратня Антыхрыста, а чырвоны можа быць колерам ахвяры выкупленьня, але і полымя пекла. Зялёнае з чырвоным — трывожны знак райскага плода...

... У 1921-22 гадох Філіповіч піша таксама некалькі карцінаў на шчыра этнаграфічныя матывы: «На Купальле», «Вясна», «Скокі праз вогнішча», «Карагод», «Народнае гуляньне». Усю гэтую жывапісную нізку лучыць адметны, філіповіцкі стыль, нечаканае спалучэньне супрэматычных і імпрэсіяністычных прыёмаў, які збліжае гэтыя пошукі Філіповіча з пошукамі Малевіча толькі ў адваротным накірунку. Сярод «этнаграфічных» палотнаў самым красамоўным стала «На Купальле». У зіхоткім, стракатым жывапісе нібыта матэрыялізаваўся дзікі нястрыманы, спакусьлівы вір народнае маладое стыхіі. Кантраст сьветлых, агністых плямаў на пярэднім пляне, на якім выяўленыя людзкія постаці у разьятраным рытме скокаў, і суворага амаль аморфнага дальняга пляну зь цёмнай стужкаю ракі, робіць гэты сюжэт драматычным. Невыпадкова дасьледчыца Валянціна Вайцяхоўская заўважыла, што стыхія народнага сьвята асацыюецца ў Філіповіча «.. з рэвалюцыяй, якая ўспрымалася як страшнае, крывавае, ii янкое сьвята». Сьвята — рэвалюцыя?.

Менавіта ў гэты самы час, у 1922 годзе, Філіповіч ілюструе «Босых на вогнішчы» Міхася Чарота... Хаатычны калматы натоўп паўстанцаў, спавіты ці то дымам, ці то пылам, топча сваіх ворагаў. Гіпэрбалізаваныя эмоцыі, якія мусілі б давесьці публіку да афэкту, увабраныя у схематычныя прымітыўныя формы, трапна супалі з эмоцыямі Чарота. Рэвалюцыя — сьвята!

... У 1919 годзе Янка Купала робіць першы поўны пераклад «Слова пра паход Ігаравы», тады яшчэ прозаю. Праз два гады, жывучы ў камяніцы на Траецкім прадмесьці, насупраць менскага Замчышча, Купала стварае вершаваны варыянт «Слова...» У гэты час сюжэт братазабойчае сечы на Нямізе ў неймаверна далёкім 1067 годзе загучаў невераемна надзённа і тужліва, як прарочы праклён... «Слова пра паход Ігаравы» Купалы стала шэдэўрам нашае літаратуры. Сеча на Нямізе стала сымбалем нашага гістарычнага лёсу...

Напрыканцы 1922 году Філіповіч піша сваю «Бітву на Нямізе». Ці ёсьць тут пазытыўныя пэрсанажы? Няма. Вялікі натоўп людзей сячэцца між сабою люта. За што? Ужо не чужынцы, як у «Казцы», б'юцца, а свае... Таму ніхто не адкажа, за што яны гінулі і забівалі.

Карціна ўспрымаецца як фрагмэнт выхаплены зь неабсяжнае панарамы, дзе мы маглі б пабачыць і неабсяжны далягляд і ўсіх дзейных пэрсанажаў. Мастак зацьміў і адрэзаў зьлева край натоўпу, а справа прыпусьціў золак — той жа калярыстычны прыём, дзе цэнтрам кампазыцыі становяцца бязьлітасныя ўдары чырвонага и зялёна-сіняга. Гэтай працаю Філіповіч, бадай неўсьвядомлена, падвёў рысу пад усімі сваімі папярэднімі мастакоўскімі пошукамі. Аналіз беларускага колеру і разнастылёвая фарматворчасьць вынiклі ў блізкую да мадэрну кампазыцыю, дзе плоскасныя выявы пэрсанажаў, хутчэй дэкаратыўныя, суседзяць з амаль рэалістычным краявідам, над якім бягуць пасмы ватных аблокаў. Выява дрэва на першым пляне блізкая да падобнага ж матыву і ў «Казцы», але гэтым разам яна больш рэалістычная, больш мякка змадэляваная. Голае дрэва цёмным сваім абрысам утварае прасторавую глыбіню ўсёй кампазыцыі, трывала яе завяршаючы. Статычны матыў зімовага дрэва ў нішчымным краявідзе жорстка падкрэсьлівае зьмест твору — куламесу людзкіх постацяў.

«Бітва на Нямізе» была паказаная на 3-яй Усебеларускай выставе ў 1929 годзе. Але часы былі ўжо не для такога мастацтва. Бальшавіцкая пільная крытыка адразу «раскусіла» творчасьць Філіповіча. «Безідэйнасць» і «фармалізм» гэтага ягонага шэдэўра рэзалі вочы. На шчасьце сваё, Філіповіч ізноў у гэты час вучыўся у Расеі, адкуль ён вярнуўся ў 1930 годзе зусім іншым мастаком. Бадай і іншым чалавекам.

Сяргей Харэўскі

У папярэдніх нумарах прадстаўленыя творы:

1. Фэрдынанд Рушчыц. Зямля
2. Мсьціслаў Дабужынскі. Віцебск лесьвіца
3. Марк Шагал. Прамэнад
4. Ільля Рэпін. Беларус
5. Марк Антокальскі. Помнік Кацярыне
6. Вітальд Бялыніцкі-Біруля. Блакітная капліца
7. Хаім Суцін. Паж
8. Казімер Малевіч. Чорны квадрат
9. Язэп Драздовіч. Пагоня Ярылы
10. Валянцін Волкаў. Менск 2 ліпеня 1943 году
11. Манумэнт Перамогі
12. Помнік Леніну ў Менску
13. Пётра Сергіевіч. Шляхам жыцьця
14. Аляксей Глебаў. Францішак Скарына



МІХАЛ ФІЛІПОВІЧ (1896, Менск – 1947, Менск) жывапісец, графік, педагог. Вучыўся ў Маскве, з 1920 да 1921, і з 1925 да 1930, у Вышэйшых мастацка тэхнічных майстэрнях

"Наша Ніва" незалежная газэта

НАША НІВА

заснаваная ў 1906, аднёўленая ў 1991

рэдактар ... Сяргей Дубавец
выдавец ... Рэдакцыя газэты "Наша Ніва"
заснавальнік ... Павал Жук
адказны сакратар ... Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар ... Сяргей Харэўскі
аддзел інфармацыі ... Андрэй Лапцёнак, Віктар Корзун
дызайн і вёрстка ... Лявон Раманчык
набор ... Аляксандра Макавік
стыль і карэктура ... Паўлюк Канавальчык
ІРЫ ўдзеле ... Сяргея Шупы

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 213-43-52
E-mail: edit@niva.minsk.by
http://rampage.ml.org/users/ nasa_niva

© НАША НІВА.
Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая. Наклад 2665. 8 палос фармат А2 нумар падпісаны ў друк 21:48, 14/12/1997. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны 79. Замова № 7385 Кошт свабодны

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г Менск, пр газэты "Известия", д. 8, кв 173

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12